Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 24 снежня 1982 г. ● № 51 (3149) ● Выходзіць з 1932 г. ● Цана 10 кап.

ПАД ЛЕНІНСКІМ СЦЯГАМ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ

Урачыстае пасяджэнне ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў

Хвалюючай маніфестацыяй трыумфу ленінскай нацыянальнай палітыкі, гістарычных дасягненняў сацыялізму стала 60-годдзе СССР — першай у свеце саюзнай многанацыянальнай дзяржавы рабочых і сялян. Гэта вялікае свята дружная сям'я раўнапраўных савецкіх рэспублік сустракае ў росквіце сіл, дэманструючы ўсяму свету маналітнае адзінства сацыялістычнага грамадства, непарушную згуртаванасць савецкага народа вакол Камуністычнай партыі, яго гатоўнасць памнажаць намаганні ў барацьбе за ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

З пачуццём патрыятычнай гордасці за поспехі многанацыянальнай Радзімы сабраліся 21 снежня ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў удзельнікі сумеснага ўрачыстага пасяджэння Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У зале — члены і кандыдаты ў члены ЦК КПСС, члены Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС, дэпутаты Вярхоўных Саветаў СССР і РСФСР, ветэраны партыі, перадавікі юбілейнага сацыялістычнага спаборніцтва, дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва, воіны Савецкіх Узброеных Сіл, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, зарубежныя госці.

11 гадзін раніцы. Бурнымі, працяглымі апладысментамі, стоячы, удзельнікі ўрачыстага пасяджэння сустракаюць таварышаў **Ю. У. Андропава, Г. А. Аліева, М. С. Гарбачова, В. В. Грышына, А. А. Грамыку, Д. А. Кунаева, А. Я. Пельшэ, Р. В. Раманава, М. А. Ціханава, Д. Ф. Усцінава, К. У. Чарненку, У. В. Шчарбіцкага, П. Н. Дземічава, У. І. Далгіх, Ц. Я. Кісялёва, В. В. Кузняцова, Б. М. Панамарова, Ш. Р. Рашыдава, М. С. Саломенцава, Э. А. Шэварднадзе, М. В. Зімяніна, І. В. Капітонава, К. В. Русакова, М. І. Рыжкова.**

Разам з імі ў прэзідыуме — цёпла сустрэтыя прысутнымі кіраўнікі дэлегацый сацыялістычных краін таварышы Т. Жыўкаў, Я. Кадар, Ле Зуан, Э. Хонекер, Лі Дэн Ок, Р. Кастра, К. Фамвіхан, Ю. Цэдэнбал, В. Ярузельскі, Н. Чаушэску, Г. Гусак, Л. Калішэўскі, кіраўнікі дэлегацый брацкіх партый таварышы Б. Кармаль, А. Н. Мухамед, Хенг Самрын, Х. Фларакіс, Й. Енсен, Г. Хол, Г. Уінстан, Г. Міс, Р. Хэлверсан, Ф. Муры, Р. Арысмендзі, Л. Карвалан, Р. Рао, Х. Багдаш, Й. Каяноя, М. О'Рыярдан, Р. Урбані, Х. Шміт, Ф. Варад, М. Вільнер, А. Фава, Х. Віейра, М. Мабіда, Э. Папаіаану, І. Білен, А. Нзо і іншыя.

Тут жа Прэзідэнт Фінляндскай Рэспублікі М. Койвіста, кіраўнікі дэлегацый сацыял-дэмакратычных і сацыялістычных партый, рэвалюцыйна-дэмакратычных партый, нацыянальна-вызваленчых рухаў і міжнародных арганізацый.

У прэзідыуме — ветэраны ленінскай партыі, удзельнікі I Усесаюзнага з'езда Саветаў, перадавікі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, вядомыя дзеячы навукі і культуры, савецкія военачальнікі.

Уступнай прамовай сумеснае ўрачыстае пасяджэнне адкрыў член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС таварыш **К. У. Чарненка.**

Прамова таварыша К. У. ЧАРНЕНКІ

Дарагія таварышы!

Паважаныя зарубежныя госці!

Мы сабраліся, каб ва ўрачыстай абстаноўцы адзначыць знамянальную дату ў жыцці народаў нашай краіны — шасцідзесяцігоддзе нараджэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Гэта падзея адбылася ў снежні 1922 года. Яна, несумненна, з'яўляецца адной з самых яркіх і важных у новай гісторыі чалавецтва. Шлях да нараджэння Саюза ССР адкрыла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, якая вызваліла народы Расіі ад сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. І сёння вопыт станаўлення першай многанацыянальнай дзяржавы рабочых і сялян служыць свайго роду пуцяводнай зоркай для многіх барацьбітоў за сацыяльны прагрэс, робіць глыбокі ўплыў на справы бурнага і складанага XX стагоддзя.

Ленінская нацыянальная палітыка разняволіла народы Расіі, яна збавіла іх ад прыгнёту сваіх і чужых эксплуататараў, дала ім свабоду, паўнату палітычных правоў. Фатальны круг варожасці і недавер'я, які стварыўся адносінамі панавання і падпарадкавання, быў разарваны смела і рашуча.

Ленінская нацыянальная палітыка абудзіла вялікія сілы стварэння ва ўсіх кутках нашай Радзімы. Сацыялістычная дарога да ўсебаковага эканамічнага росту была адкрыта і перад тымі народамі, дзе царскі прыгнёт, гаспадаранне капіталу суседнічалі з дрымучымі феадальнымі, а то і родавымі адносінамі.

Ленінская нацыянальная палітыка прывяла да духоўнага адраджэння ўсіх нацый і народнасцей нашай краіны, да росквіту нацыянальных культур, іх узаемнага ўзбагачэння, да ўсталявання інтэрнацыяналісцкіх камуністычных ідэалаў.

Такі, гаворачы самым кароткім чынам, плён нашых спраў. І нельга не падкрэсліць, што ў велізарнай меры ён звязан з шырокай і высакароднай дапамогай рускіх працоўных сваім братам іншых нацыянальнасцей. У гэтым адна з вялікіх заслуг рускага народа перад рэвалюцыяй.

Наш шлях быў не лёгкім. Здараліся ў нас і памылкі. Але партыя іх прызнавала і выпраўляла, пастаянна звяраючы свае дзеянні з ленінскімі запаветамі. Мы з гонарам выйшлі з многіх суровых выпрабаванняў. І сёння, у гэты святочны дзень, мы з поўным правам гаворым — запаветы Уладзіміра Ільіча Леніна ажыццёўлены. **(Бурныя апладысменты).**

Аб гэтым сведчаць непарушная дружба народаў нашай краіны, адзінства нашага грамадства, выдатныя дасягненні ўсіх савецкіх рэспублік, зладжаная, энергічная работа савецкіх людзей па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС.

Адзначаючы 60-ю гадавіну ўтварэння нашага Саюза, мы, натуральна, думаем не толькі аб пройдзеным, але і аб новых рубяжах камуністычнага будаўніцтва. У сувязі з гэтым хацеў бы напомніць выказванне Леаніда Ільіча Брэжнева на XXVI з'ездзе КПСС аб тым, што трэба выпрацаваць такі стыль работы, «у якім арганічна спалучаліся б выканаўчасць, дысцыплінаванасць са смелай ініцыятывай і прадпрымальнасцю. Практычнасць і дзелавітасць — з накіраванасцю да вялікіх мэт. Крытычныя адносіны да недахопаў — з непахіснай упэўненасцю ў гістарычных перавагах выбранага намі шляху». Іменна так імкнуцца дзейнічаць савецкія камуністы.

Задачы бягучага моманту ясныя партыі і народу. Яны дакладна і пераканаўча сфармуляваны ў прамове Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта партыі Ю. У. Андропава на нядаўнім Пленуме ЦК КПСС. Найшырэйшае адабрэнне вынікаў гэтага Пленума працоўнымі нашай краіны, цвёрдая рашучасць усіх савецкіх людзей ажыццявіць планы партыі — гэта дакладны паказчык здаровага палітычнага клімату ў краіне. Думкі партыі і народа ідуць у адным напрамку. Яны непарыўныя. **(Працяглыя апладысменты).**

Дарагія таварышы! Тут, у зале, прысутнічаюць ветэраны партыі і дзяржавы, удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі, першабудаўнікі нашага Саюза. Дазвольце іх вітаць горача і сардэчна. **(Працяглыя апладысменты).**

На сённяшнія ўрачыстасці прыбылі 134 зарубежныя дэлегацыі са 112 краін.

Мы шчаслівыя вітаць нашых выпрабаваных сяброў з сацыялістычных краін. Няма сумненняў, што наша плённая дружба ў будучыя гады прынясе яшчэ больш багатыя вынікі. **(Працяглыя апладысменты).**

Ад усёй душы мы вітаем прадстаўнікоў тых краін, якія, заваяваўшы нацыянальную незалежнасць, выбралі шлях сацыялістычнага развіцця. Савецкі Саюз будзе і ў далейшым цвёрда стаяць за права народаў на свабоднае, самастойнае развіццё. **(Працяглыя апладысменты).**

Мы рады бачыць на нашых урачыстасцях дэлегацыі камуністычных і рабочых партый з розных краін свету. Савецкія камуністы глыбока салідарныя з іх самаадданай рэвалюцыйнай работай у імя інтарэсаў працоўных. **(Працяглыя апладысменты).**

Мы цёпла вітаем прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных партый, нацыянальна-вызваленчых рухаў і арганізацый, якія змагаюцца супраць імперыялізму і неакаланіялізму. У гэтай гераічнай барацьбе, таварышы, мы з вамі. **(Працяглыя апладысменты).**

У нас выклікае здавальненне прысутнасць на юбілеі Савецкай дзяржавы вядомых дзеячаў сацыял-дэмакратычных і сацыялістычных партый. Мы гатовы і далей развіваць супрацоўніцтва з гэтымі партыямі ў барацьбе супраць гонкі ўзбраенняў, за трывалы мір і бяспеку народаў. **(Апладысменты).**

Мы шчыра вітаем усіх нашых гасцей — прадстаўнікоў дзяржаў і міжнародных арганізацый, партыйных і грамадскіх дзеячаў, якія прыбылі на гэты юбілей. Нам дорага ваша павага да Краіны Саветаў. **(Працяглыя апладысменты).**

Таварышы! Дазвольце сумеснае ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Вярхоўнага Савета Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і Вярхоўнага Савета Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння СССР, аб'явіць адкрытым. **(Бурныя апладысменты).**

***

Гучыць Гімн Савецкага Саюза.

Слова для даклада «Шэсцьдзесят гадоў СССР» атрымлівае Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш **Ю. У. Андропаў.**

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння і зарубежныя госці сустракаюць таварыша Ю. У. Андропава авацыяй.

***

Даклад таварыша Ю. У. Андропава быў выслуханы з вялікай увагай, неаднаразова перапыняўся працяглымі апладысментамі.

Заключныя словы даклада ўдзельнікі пасяджэння сустракаюць стоячы, бурнай авацыяй.

Затым на ўрачыстым пасяджэнні пачаліся выступленні і прывітанні.

Ускладанне вянкоў да Маўзалея У. І. Леніна і магілы Невядомага салдата

20 снежня Генеральны сакратар ЦК КПСС Ю. У. Андропаў, члены Палітбюро ЦК КПСС Г. А. Аліеў, М. С. Гарбачоў, В. В. Грышын, А. А. Грамыка, Д. А. Кунаеў, А. Я. Пельшэ, Р. В. Раманаў, М. А. Ціханаў, Д. Ф. Усцінаў, К. У. Чарненка, У. В. Шчарбіцкі, кандыдаты ў члены Палітбюро ЦК КПСС П. Н. Дземічаў, У. І. Далгіх, Ц. Я. Кісялёў, В. В. Кузняцоў, Б. М. Панамароў, Ш. Р. Рашыдаў, М. С. Саломенцаў, Э. А. Шэварднадзе, сакратары ЦК КПСС М. В. Зімянін, І. В. Капітонаў, К. В. Русакоў, М. І. Рыжкоў наведалі Маўзалей У. І. Леніна і ўсклалі вянок ад Цэнтральнага Камітэта КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР і Савета Міністраў СССР.

Мінутай маўчання яны ўшанавалі памяць правадыра сусветнага камуністычнага руху, стваральніка першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы.

Кіраўнікі Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы ўсклалі вянок да магілы Невядомага салдата ля Крамлёўскай сцяны і мінутай маўчання ўшанавалі памяць савецкіх воінаў, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам за свабоду Радзімы, за шчасце і мір на планеце.

Вянкі да Маўзалея У. І. Леніна і магілы Невядомага салдата былі ўскладзены дэлегацыямі Масквы, саюзных рэспублік, а таксама ВЦСПС, ЦК ВЛКСМ, іншых грамадскіх арганізацый.

ТАСС.

ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ГАДОЎ СССР

Даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Ю. У. АНДРОПАВА

Дарагія таварышы!

Паважаныя госці!

Шэсцьдзесят гадоў назад народы нашай краіны, разняволеныя перамаганоснай Кастрычніцкай рэвалюцыяй, добраахвотна аб'ядналіся ў Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. **(Апладысменты).**

Заключаючы работу першага, аб'яднальнага з'езда савецкіх рэспублік, які абвясціў утварэнне Саюза ССР, М. І. Калінін сказаў: «Цэлыя тысячагоддзі мінулі з таго часу, як лепшыя розумы чалавецтва б'юцца над тэарэтычнай праблемай у пошуках форм, якія далі б народам магчымасць без найвялікшых мук, без узаемнай барацьбы жыць у дружбе і брацтве. Толькі цяпер, у сённяшні дзень, практычна закладваецца першы камень у гэтым напрамку». **(Апладысменты).**

Развіццё капіталізму не прывяло да ліквідацыі нацыянальнага прыгнёту. Наадварот. Нацыянальны прыгнёт быў дапоўнен і абвостран прыгнётам каланіяльным. Заняволіўшы сотні мільёнаў людзей, жменька капіталістычных дзяржаў асудзіла іх на гібенне, перакрыла ім шляхі да прагрэсу.

Марксізм упершыню паказаў арганічную сувязь нацыянальнага пытання з сацыяльнай, класавай структурай грамадства, з пануючым тыпам уласнасці. Інакш кажучы, карані нацыянальных адносін ідуць у сацыяльную глебу. Вось чаму Маркс і Энгельс зрабілі фундаментальны вывад. Знішчэнне сацыяльнага прыгнёту служыць умовай і прадпасылкай знішчэння прыгнёту нацыянальнага. «...Перамога пралетарыяту над буржуазіяй, — гаварыў Маркс, — з'яўляецца адначасова сігналам да вызвалення ўсіх прыгнечаных нацый». Абвешчаны заснавальнікамі марксізму неўміручы лозунг — «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» — стаў заклікам да інтэрнацыянальнай барацьбы працоўных супраць усіх форм заняволення — і сацыяльнага і нацыянальнага. **(Апладысменты).**

У новых гістарычных умовах справу К. Маркса і Ф. Энгельса прадоўжыў У. І. Ленін. Ён узначаліў рэвалюцыйны рух тады, калі над Расіяй пачалі ўспыхваць першыя зарніцы рэвалюцыі. У краіне, якую справядліва называлі «турмой народаў», нацыянальнае пытанне, натуральна, было пастаўлена на адно з першых месц пры распрацоўцы стратэгіі і тактыкі партыі бальшавікоў.

У цэнтры ўвагі Леніна знаходзілася права нацый на самавызначэнне як адзіна надзейны сродак забяспечыць іх сапраўднае, трывалае збліжэнне. Толькі права на самавызначэнне магло быць ідэйна-палітычнай асновай добраахвотнага згуртавання ўсіх нацый у барацьбе за звяржэнне царызму, за стварэнне новага грамадства. Так ставіў пытанне Ленін. Такой была аснова нацыянальнай палітыкі ленінскай партыі. **(Апладысменты).**

Кастрычніцкая рэвалюцыя перавяла палітычныя лозунгі і патрабаванні ў плоскасць штодзённай арганізатарскай работы. Само жыццё, найцяжэйшыя эканамічныя, сацыяльныя, знешнепалітычныя, абаронныя задачы дыктавалі неабходнасць згуртавання народаў, аб'яднання рэспублік, якія ўзніклі на абломках Расійскай імперыі.

Тое, што здаецца відавочным сёння, далёка не было відавочным у той бурны, пераходны час. Пошук канкрэтных дзяржаўных форм, палітычных інстытутаў, у якія трэба было ўвасобіць агульныя ідэі і перадумовы нацыянальнай праграмы, праходзіў у вострых спрэчках. Сутыкаліся самыя розныя думкі — ад праграмы рыхлага, аморфнага аб'яднання рэспублік у рамках канфедэрацыі да патрабавання проста ўключыць іх у састаў РСФСР на асновах аўтаноміі. Спатрэбіліся геній і аўтарытэт У. І. Леніна, каб знайсці і адстаяць адзіна правільны шлях — шлях сацыялістычнага федэралізму.

У чым сутнасць шляху, указанага Леніным? Коратка можна было б сказаць так. Гэта — поўная добраахвотнасць саюза свабодных народаў, як гарантыя максімальнай трываласці федэрацыі сацыялістычных рэспублік. Гэта — поўнае раўнапраўе ўсіх нацый і народнасцей, паслядоўная лінія на ліквідацыю не толькі юрыдычнай, але і фактычнай іх няроўнасці. Гэта — свабоднае развіццё кожнай рэспублікі, кожнай народнасці ў рамках іх брацкага саюза. Гэта — настойлівае выхаванне інтэрнацыяналісцкай свядомасці і няўхільны курс на збліжэнне ўсіх нацый і народнасцей нашай краіны.

Якраз у год утварэння Савецкага Саюза У. І. Ленін напісаў словы, якія ярка адлюстравалі ход яго роздумаў па нацыянальным пытанні. Вось гэтыя словы: «Наш вопыт вырашэння на працягу пяці гадоў нацыянальнага пытання ў дзяржаве, якая мае ў сабе такое мноства нацыянальнасцей, якое наўрад ці можна знайсці ў іншых краінах, цалкам пераконвае нас у тым, што адзіна правільнымі адносінамі да інтарэсаў нацый у падобных выпадках будзе максімальнае іх задавальненне і стварэнне ўмоў, якія выключаюць усякую магчымасць канфліктаў на гэтай глебе. Наш вопыт, — працягваў Ленін, — стварыў у нас непахіснае перакананне, што толькі велізарная ўважлівасць да інтарэсаў розных нацый ліквідуе глебу для канфліктаў, ліквідуе ўзаемнае недавер'е, ліквідуе апасенне якіх-небудзь інтрыг, стварае тое давер'е, асабліва рабочых і сялян, гаворачых на розных мовах, без якога ні мірныя адносіны паміж народамі, ні колькі-небудзь паспяховае развіццё ўсяго таго, што ёсць каштоўнага ў сучаснай цывілізацыі, з'яўляюцца абсалютна немагчымымі».

Ленінскія запаветы, ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі для нас з'яўляюцца свяшчэннымі. Апіраючыся на іх, паслядоўна ўсталёўваючы іх на практыцы, мы стварылі магутную дзяржаву — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, утварэнне якой з'явілася не толькі буйным крокам у развіцці сацыялізму, але і адным з важнейшых пераломных момантаў у ходзе сусветнай гісторыі. **(Працяглыя апладысменты).**

1. Вынікі пройдзенага шляху і задачы нацыянальнай палітыкі

Шлях, пройдзены Савецкім Саюзам за 60 гадоў, — гэта цэлая эпоха. Гісторыя, бадай, не ведае такога імклівага ўзлёту ад стану адсталасці, бедстваў і разрухі да магутнасці сучаснай вялікай дзяржавы з найвышэйшым узроўнем культуры і пастаянна растучым дабрабытам народа.

Якія ж найбольш значныя вынікі нашага развіцця?

— Поўнасцю пацверджана гістарычная правільнасць вучэння Маркса — Леніна аб тым, што вырашэнне нацыянальнага пытання можа быць знойдзена толькі на класавай аснове. Разам з сацыяльнымі антаганізмамі адышлі ў мінулае нацыянальная варожасць, усе віды расавага і нацыянальнага нераўнапраўя і прыгнечання.

— Пераканаўча паказана, што кіруючай, накіроўваючай сілай у сацыялістычным вырашэнні нацыянальнага пытання, гарантам правільнасці гэтага вырашэння з'яўляецца Камуністычная партыя, яе навукова абгрунтаваная палітыка.

— Зніклі адсталыя нацыянальныя ўскраіны, у якіх часта пераважалі яшчэ феадальна-патрыярхальныя і нават родавыя адносіны.

— На базе дынамічнага, накіроўваемага агульнадзяржаўным планам эканамічнага росту ўсіх рэспублік утварыўся адзіны саюзны народнагаспадарчы комплекс.

— Якасна змянілася сацыяльная структура рэспублік: у кожнай з іх вырас сучасны рабочы клас, па новаму, калгаснаму шляху ідзе сялянства, створана свая інтэлігенцыя, выхаваны кваліфікаваныя кадры ва ўсіх сферах дзяржаўнага і грамадскага жыцця.

— На аснове прагрэсіўных традыцый, інтэнсіўнага абмену духоўнымі каштоўнасцямі расквітнела сацыялістычная многанацыянальная культура.

— Сфарміраваліся сацыялістычныя нацыі, якія ўтвараюць цяпер новую гістарычную супольнасць — савецкі народ. **(Працяглыя апладысменты).**

Усё цясней пераплятаюцца інтарэсы рэспублік, усё больш плённымі становяцца ўзаемадапамога, узаемасувязі, якія накіроўваюць у адзіны паток стваральныя намаганні нацый і народнасцей Савецкага Саюза. Усебаковае развіццё кожнай з сацыялістычных нацый у нашай краіне заканамерна вядзе да іх усё большага збліжэння.

Кожная з саюзных рэспублік — Расійская Федэрацыя, Украіна і Беларусь, Узбекістан і Казахстан, Грузія і Азербайджан, Літва і Малдавія, Латвія і Кіргізія, Таджыкістан і Арменія, Туркменія і Эстонія, — кожная, паўтараю, з саюзных рэспублік уносіць незаменны ўклад у агульны ўздым эканомікі і культуры Савецкага Саюза. І гэта, таварышы, не проста складанне, гэта шматразовае памнажэнне нашых творчых сіл. **(Апладысменты).**

У брацкай сям'і паспяхова раскрываюць свае магчымасці ўсе нацыі і народнасці, якія жывуць у дваццаці аўтаномных рэспубліках і ў васемнаццаці аўтаномных абласцях і акругах. Паўнапраўнымі савецкімі грамадзянамі з'яўляюцца і мільёны немцаў, палякаў, карэйцаў, курдаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, для якіх Савецкі Саюз даўно стаў радзімай.

Народы нашай краіны звяртаюць асаблівыя словы ўдзячнасці да рускага народа. Без яго бескарыслівай брацкай дапамогі былі б немагчымыя цяперашнія дасягненні ні адной з рэспублік. Фактарам выключнага значэння ў эканамічным, палітычным і культурным жыцці краіны, у збліжэнні ўсіх яе нацый і народнасцей, у іх далучэнні да багаццяў сусветнай цывілізацыі служыць руская мова, натуральна ўвайшоўшая ў жыццё мільёнаў людзей любой нацыянальнасці **(Апладысменты).**

Буйной вяхой ва ўмацаванні нацыянальна-дзяржаўных асноў савецкага грамадства з'явілася новая Канстытуцыя СССР. У гэтым выдатным дакуменце не толькі падведзены вынікі папярэдняга развіцця, але і абазначаны трывалыя, устойлівыя палітыка-прававыя асновы для далейшага росквіту і збліжэння ўсіх нацый і народнасцей краіны.

Рэальныя якасныя змены, якія адбыліся за 60 гадоў у нацыянальных адносінах, сведчаць аб тым, што нацыянальнае пытанне ў тым выглядзе, у якім яно было пакінута нам эксплуататарскім ладам, паспяхова вырашана, вырашана канчаткова і беспаваротна. **(Працяглыя апладысменты).** Упершыню ў гісторыі многанацыянальны састаў краіны ператварыўся з крыніцы яе слабасці ў крыніцу сілы і росквіту. **(Апладысменты).**

Выступаючы ў гэтай зале роўна дзесяць гадоў назад, Леанід Ільіч Брэжнеў вельмі добра сказаў: «У нашай краіне... склаліся небывалыя ў гісторыі адносіны, якія мы па праву называем ленінскай дружбай народаў. Гэта дружба — наш неацэнны набытак, адна з самых значных і самых дарагіх сэрцу кожнага савецкага чалавека заваёў сацыялізму. І гэту дружбу мы, савецкія людзі, будзем заўсёды берагчы як зрэнку вока!». **(Працяглыя апладысменты).**

Сёння, у гэты ўрачысты дзень, мы аддаём належнае многім пакаленням савецкіх людзей усіх нацыянальнасцей, мужчынам і жанчынам, рабочым і сялянам, інтэлігенцыі, партыйным і савецкім работнікам, воінам Узброеных Сіл, камуністам і беспартыйным — усім, хто пабудаваў сацыялізм, адстаяў яго ў найцяжэйшай вайне і ператварыў у рэальнасць тысячагадовую мару аб роўнасці, дружбе і брацтве народаў. **(Працяглыя апладысменты).**

Таварышы! Падводзячы вынікі зробленаму, мы, натуральна, галоўную ўвагу ўдзяляем таму, што яшчэ трэба зрабіць. Наша канчатковая мэта відавочная. Гэта, гаворачы словамі У. І. Леніна, — «не толькі збліжэнне нацый, але і зліццё іх». Партыя добра разумее, што да гэтай мэты вядзе доўгі шлях. Тут ні ў якім разе нельга забягаць наперад, гэтак жа як нельга дапускаць і стрымліванне ўжо наспеўшых працэсаў.

Поспехі ў вырашэнні нацыянальнага пытання зусім не азначаюць, што зніклі ўсе праблемы, якія параджае сам факт жыцця і працы ў рамках адзінай дзяржавы мноства нацый і народнасцей. Такое наўрад ці магчыма, пакуль існуюць нацыі, пакуль ёсць нацыянальныя адрозненні. А яны будуць існаваць доўга, многа даўжэй, чым адрозненні класавыя.

Вось чаму ўдасканаленне развітога сацыялізму — а іменна так мы можам вызначыць галоўны змест дзейнасці партыі і народа на сучасным этапе — павінна ўключаць і прадуманую, навукова абгрунтаваную нацыянальную палітыку. Хацеў бы спыніцца на некаторых яе задачах.

Ужо гаварылася, якія велізарныя выгады і перавагі дало народам нашай краіны, яе рэспублікам аб'яднанне ў адзіны саюз. Але магчымасці, адкрываемыя такім аб'яднаннем, яшчэ далёка не вычарпаны.

Возьмем эканоміку. Сучасныя прадукцыйныя сілы патрабуюць інтэграцыі нават тады, калі размова ідзе аб розных краінах. Тым больш, яны патрабуюць цеснага і ўмелага аб'яднання намаганняў розных рэгіёнаў і рэспублік у адной і той жа краіне. Найбольш разумнае выкарыстанне прыродных і працоўных рэсурсаў, кліматычных асаблівасцей кожнай рэспублікі, найбольш рацыянальнае ўключэнне гэтага патэнцыялу ў агульнасаюзны, — вось што прынясе найбольшую выгаду кожнаму рэгіёну, кожнай нацыі і народнасці, таксама як і ўсёй дзяржаве.

Такая наша прынцыповая ўстаноўка. Для яе ажыццяўлення давядзецца нямала папрацаваць нашым цэнтральным і мясцовым планавым і гаспадарчым органам. Запатрабуецца і далей удасканальваць размяшчэнне прадукцыйных сіл, рэгіянальную спецыялізацыю і кааперацыю, схемы гаспадарчых сувязей і перавозак. Задача, вядома, няпростая. Але яна наспела і яе вырашэнне абяцае значны выйгрыш.

Уся краіна працуе цяпер над выкананнем Харчовай праграмы. У ёй ясна вызначаны канкрэтныя задачы для ўсіх саюзных рэспублік. І кожнай з іх трэба будзе грунтоўна папрацаваць, каб унесці рэальны ўклад — прычым ужо ў бліжэйшы час — у важнейшую справу бесперабойнага забеспячэння савецкіх людзей прадуктамі харчавання.

(Заканчэнне на стар. 4—5).

ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ГАДОЎ СССР

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3).

У прынятай праграме гаворыцца, як вядома, аб першачарговых, неадкладных задачах. Але калі падумаць аб перспектыве, то нельга не ўбачыць, што далейшае развіццё нашага аграпрамысловага комплексу, — як, зрэшты, і эканомікі краіны ў цэлым, — запатрабуе больш глыбокай і паслядоўнай спецыялізацыі сельскай гаспадаркі ў маштабах усёй краіны.

І яшчэ адно пытанне. У дзяржаве такой вялікай, як наша, выключна асаблівую ролю адыгрывае транспарт. Ролю і эканамічную, і палітычную, і, калі хочаце, псіхалагічную.

Без добра працуючага транспарту вельмі цяжка забяспечваць і паскоранае развіццё ўсіх рэспублік, і далейшае паглыбленне іх эканамічнага супрацоўніцтва. Але транспарт важны не толькі для вырашэння выключна гаспадарчых задач. Развіццё транспарту, дарожнай сеткі, прыбліжаючы вёску да горада, будзе ў значнай меры садзейнічаць, напрыклад, замацаванню і кадраў у вёсцы. Дапаможа гэта, вядома, і вырашэнню вялікай сацыяльнай задачы — рацыянальнаму і гібкаму выкарыстанню працоўных рэсурсаў. Забяспечваючы штодзённыя чалавечыя кантакты ў маштабах усяго Савецкага Саюза, жывыя сувязі паміж усімі рэспублікамі і раёнамі краіны, транспарт служыць далучэнню людзей да дасягненняў сацыялістычнай цывілізацыі ў самым шырокім сэнсе слова.

Аб'яднанне ў Саюз стала адной з дадатковых крыніц не толькі матэрыяльнага, але і духоўнага багацця савецкага народа. Аднак і тут мы далёка яшчэ не выкарыстоўваем усе магчымасці. Трэба настойліва шукаць новыя, адпавядаючыя сённяшнім патрабаванням метады і формы работы, якія дазваляюць зрабіць яшчэ больш плённым узаемнае ўзбагачэнне культур, адкрыць усім людзям яшчэ больш шырокі доступ да ўсяго лепшага, што дае культура кожнага з нашых народаў. Усё ўзрастаючую ролю ў гэтай высакароднай справе павінны адыгрываць радыё і тэлебачанне, як, зразумела, і іншыя сродкі масавай інфармацыі.

Вядома, пры гэтым трэба памятаць, што ў духоўнай спадчыне, традыцыях, у быце кожнай нацыі ёсць не толькі добрае, але і дрэннае, аджыўшае. І адсюль яшчэ адна задача — не кансерваваць гэта дрэннае, а вызваляцца ад усяго, што ўстарэла, што ідзе ўразрэз з нормамі савецкага супольнага жыцця, сацыялістычнай маралі, з нашымі камуністычнымі ідэаламі.

Жыццё паказвае, што эканамічны і культурны прагрэс усіх нацый і народнасцей суправаджаецца непазбежна ростам іх нацыянальнай самасвядомасці. Гэта — заканамерны, аб'ектыўны працэс. Важна, аднак, каб натуральная гордасць за дасягнутыя поспехі не ператваралася ў нацыянальную фанабэрыстасць або зазнайства, не параджала тэндэнцыі да адасобленасці, непаважлівых адносін да іншых нацый і народнасцей. А такога роду негатыўныя з'явы яшчэ сустракаюцца. І было б няправільна растлумачваць гэта толькі перажыткамі мінулага. Іх жывяць часам і нашы ўласныя пралікі ў рабоце. Тут, таварышы, няма дробязей. Тут важна ўсё — і адносіны да мовы, і да помнікаў мінулага, і трактоўка гістарычных падзей, і тое, як мы пераўтвараем вёскі і гарады, уздзейнічаем на ўмовы працы і жыцця людзей.

У выніку натуральнай міграцыі насельніцтва яшчэ больш многанацыянальнай становіцца кожная наша рэспубліка, а ў той ці іншай меры — кожная вобласць, кожны горад. А значыць, праваднікамі, выканаўцамі нацыянальнай палітыкі партыі ўсё больш становяцца партыйныя і савецкія органы, усе нашы кадры на месцах. Прытым увасабляць высокія прынцыпы гэтай палітыкі ў жыццё ім прыходзіцца штодзённа, забяспечваючы гарманічныя, брацкія адносіны прадстаўнікоў усіх — і вялікіх, і малых — нацый і народнасцей і ў працы, і ў быце.

Партыя заўсёды ўдзяляла велізарную ўвагу росту нацыянальных атрадаў савецкага рабочага класа — вядучай сілы нашага грамадства. І вынікі — у наяўнасці. Цяпер рабочыя складаюць самую буйную сацыяльную групу ва ўсіх саюзных рэспубліках. Аднак у некаторых з іх у саставе рабочага класа павінна быць больш поўна прадстаўлена карэнная нацыянальнасць. Адсюль і задача, пастаўленая XXVI з'ездам КПСС, — расшыраць і паляпшаць падрыхтоўку кваліфікаваных рабочых з усіх пражываючых у рэспубліках нацый і народнасцей. Гэта патрэбна для развіцця эканомікі. Гэта важна і палітычна. Многанацыянальныя працоўныя і перш за ўсё рабочыя калектывы — гэта іменна тое асяроддзе, дзе лепш за ўсё выхоўваецца інтэрнацыяналісцкі дух, умацоўваюцца брацтва і дружба народаў СССР. **(Працяглыя апладысменты).**

Вельмі важнае таксама пытанне аб прадстаўніцтве працоўных у партыйных і дзяржаўных органах рэспублік і Саюза ў цэлым. Размова, вядома, ідзе не аб нейкіх фармальных нормах прадстаўніцтва. Арыфметычны падыход да вырашэння такіх праблем непрымальны. Але трэба паслядоўна дабівацца, каб усе нацыянальнасці, якія ёсць у той або іншай рэспубліцы, былі належным чынам прадстаўлены ў розных звеннях партыйных і савецкіх органаў. Улік дзелавых і маральна-палітычных якасцей, увага і клапатлівасць, вялікі такт пры падборы і расстаноўцы кадраў асабліва неабходны ва ўмовах многанацыянальнага саставу саюзных і аўтаномных рэспублік.

Пастаянная, сталая па свайму значэнню задача — выхаванне савецкіх людзей у духу ўзаемнай павагі і дружбы ўсіх нацый і народнасцей краіны, любві да сваёй вялікай Савецкай Радзімы, інтэрнацыяналізму, салідарнасці з працоўнымі іншых краін. Гэту задачу закліканы вырашаць усе партыйныя і камсамольскія арганізацыі, Саветы і прафсаюзы, нашы Узброеныя Сілы, якія заўсёды былі добрай школай інтэрнацыяналізму. Гэта павінна быць штодзённым клопатам усіх навучальных устаноў краіны. **(Апладысменты).**

У галіне інтэрнацыянальнага выхавання, як і ва ўсёй ідэалагічнай і масава-палітычнай рабоце, перад намі вялікія задачы. Пераканаўчы, канкрэтны паказ нашых дасягненняў, сур'ёзны аналіз новых праблем, што пастаянна нараджаюцца жыццём, свежасць думкі і слова — вось шлях да ўдасканалення ўсёй нашай прапаганды, якая павінна быць заўсёды праўдзівай і рэалістычнай, а таксама цікавай, даходлівай, а значыць і больш дзейснай. **(Апладысменты).**

Далейшае развіццё дружбы і супрацоўніцтва народаў СССР у значнай меры залежыць ад паглыблення сацыялістычнай дэмакратыі. Усё больш шырокі ўдзел працоўных усіх нацыянальнасцей у кіраванні грамадскімі і дзяржаўнымі справамі — так у самым сціслым выглядзе можна ахарактарызаваць вядучую тэндэнцыю нашага палітычнага жыцця. І партыя будзе рабіць усё для таго, каб яна мацнела і развівалася.

З усяго сказанага, таварышы, вынікае, што ва ўмовах сталага сацыялізму праблемы ўзаемаадносін паміж нацыямі не здымаюцца з парадку дня. Яны патрабуюць асаблівых клопатаў, пастаяннай увагі Камуністычнай партыі. Партыя павінна глыбока ўнікаць у іх, намячаць шляхі іх вырашэння, творча ўзбагачаючы практыкай развітога сацыялізму ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі. **(Апладысменты).**

Мы смела гаворым і аб існуючых праблемах, і аб нявырашаных задачах таму, што цвёрда ведаем — гэтыя праблемы, гэтыя задачы нам пад сілу, мы можам і павінны іх вырашыць. **(Працяглыя апладысменты).** Настрой на справы, а не на гучныя словы — вось што сёння патрэбна для таго, каб яшчэ мацнейшым быў вялікі і магутны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).** Упэўнен, што так думаюць усе прысутныя ў гэтай зале, уся наша партыя, увесь савецкі народ. **(Бурныя апладысменты).**

2. СССР — апора вялікай справы міру і свабоды народаў

Таварышы! У той самы дзень, 30 снежня 1922 года, калі ў Маскве былі прыняты Дэкларацыя і Дагавор аб утварэнні СССР, на канферэнцыі ў Лазане па даручэнню Леніна было заяўлена, што, кіруючыся інтарэсамі ўсеагульнага міру, савецкія рэспублікі лічаць «сваім настойлівым абавязкам... усімі сваімі сіламі садзейнічаць устанаўленню рэжыму палітычнай роўнасці паміж расамі, павагі права народаў на самавызначэнне і на поўную палітычную і эканамічную незалежнасць усіх дзяржаў».

Так проста і зразумела была выкладзена сутнасць прынцыпова новай знешняй палітыкі, якую паслядоўна пачала праводзіць першая ў свеце краіна сацыялізму. **(Апладысменты).**

А па меры таго, як паяўляліся новыя сацыялістычныя краіны, пачаў складвацца і зусім новы тып міжнародных адносін. У іх аснове — ідэйнае адзінства, агульнасць мэт, таварыскае супрацоўніцтва — пры поўнай павазе да інтарэсаў, асаблівасцей і традыцый кожнай з краін. У іх аснове — прынцып сацыялістычнага інтэрнацыяналізму.

Непракладзенымі шляхамі ішлі краіны сацыялізму ў развіцці гэтых адносін. Мінулы вопыт чалавецтва не мог падказаць адказы на пытанні, якія ставіла жыццё. Зразумела, што не ўсё тут атрымлівалася адразу. Тым больш, што краіны, якія ўтварылі сусветную сістэму сацыялізму, пачыналі ў многім з розных зыходных пазіцый — як па ўзроўню свайго ўнутранага развіцця, так і па знешніх умовах, у якіх яны знаходзіліся. Не заўсёды ўдавалася рабіць і своечасовыя вывады са змяненняў у самім сацыялістычным свеце. Ды і міжнародная абстаноўка не давала часу на разважанні: выпрабоўваць новыя формы адносін прыходзілася, што называецца, па ходу справы. Былі ілюзіі, якія прыходзілася выкараняць, памылкі, за якія прыходзілася плаціць.

Але, ацэньваючы сённяшні дзень нашых краін, мы можам з задавальненнем сказаць: мы многаму навучыліся, садружнасць сацыялістычных дзяржаў — гэта магутны, здаровы арганізм, які адыгрывае велізарную і дабратворную ролю ў сучасным свеце. Механізм брацкага супрацоўніцтва ахоплівае самыя розныя сферы жыцця нашых краін, розныя напрамкі нашага ўзаемадзеяння ў справе сацыялістычнага будаўніцтва. Сумеснымі намаганнямі мы знаходзім усё больш паспяховыя шляхі спалучэння агульных інтарэсаў садружнасці з інтарэсамі кожнай з уваходзячых у яе краін. **(Працяглыя апладысменты).**

Вядома, і цяпер мы не можам сказаць, што ўсе цяжкасці мінулі, што дасягнут ідэал. Тое, што падыходзіла ўчора, мае патрэбу ў паляпшэнні сёння. Перад краінамі нашай садружнасці многа сур'ёзных задач. Гэта — абарона нашых сацыялістычных заваёў і каштоўнасцей ад націску імперыялізму, сумесная барацьба за ўмацаванне міру і разрадку напружанасці; гэта — далейшае ўдасканаленне палітычнага супрацоўніцтва; гэта, нарэшце, — наданне новага імпульсу працэсу эканамічнай інтэграцыі.

Так што спраў наперадзе многа. І мне хацелася б запэўніць, што Савецкі Саюз са свайго боку зробіць максімум магчымага для ўмацавання і працвітання сусветнага сацыялізму. **(Працяглыя апладысменты).**

Таварышы! Вопыт сацыялістычнага вырашэння нацыянальнай праблемы ўважліва вывучаецца ў дзесятках краін, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту. Нашы поспехі ў сацыялістычным будаўніцтве, гістарычная перамога над фашызмам, росквіт усіх нацый і народнасцей Савецкага Саюза паслужылі магутным стымулам для вызваленчай барацьбы народаў.

Актыўная і рашучая барацьба Савецкага Саюза за ліквідацыю каланіялізму, нязменная падтрымка справы вызвалення і раўнапраўя народаў аблягчаюць ім шлях да свабоды і прагрэсу. Аб гэтым добра ведаюць народы Азіі і Афрыкі, арабскага Усходу і Лацінскай Амерыкі.

Маладыя краіны, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, перажываюць цяпер няпросты перыяд нацыянальнага станаўлення і сацыяльнага развіцця. Цягнуць назад атрыманая ў спадчыну ад каланіяльнага мінулага адсталасць, міжусобныя разлады і канфлікты. Не ўзмацнеўшым яшчэ краінам пагражаюць шматлікія пасткі, расстаўленыя неакаланізатарамі. Аднак мы ўпэўнены, што рашучае супраціўленне імперыялізму, прадуманая стратэгія эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця, узаемная павага інтарэсаў і правоў адзін аднаго дадуць магчымасць народам гэтых краін пераадолець тое, што называюць цяжкасцямі росту. Савецкія людзі жадаюць ім вялікіх поспехаў ва ўмацаванні незалежнасці, у барацьбе за дабрабыт і прагрэс. **(Працяглыя апладысменты).**

Мы з павагай адносімся да руху недалучэння, міралюбівая палітыка якога ўносіць карысны ўклад у міжнароднае жыццё. Мы рашуча і нязменна на баку тых, хто яшчэ і сёння вымушан змагацца за свабоду, незалежнасць, само існаванне сваіх народаў, хто вымушан адбіваць націск агрэсара або падвяргаецца пагрозе агрэсіі. І гэта наша пазіцыя неаддзельная ад той барацьбы за трывалы мір на зямлі, якую паслядоўна і нястомна вядзе Савецкі Саюз. **(Апладысменты).**

За шэсць дзесяцігоддзяў радыкальна змянілася становішча Савецкай дзяржавы, нязмерна ўзраслі яе аўтарытэт і ўплыў. Моцная тканіна мірнага супрацоўніцтва звязвае Савецкі Саюз з краінамі ўсіх кантынентаў. Яго голас аўтарытэтна гучыць на міжнародных форумах. Прынцыпы мірнага суіснавання — аснова знешняй палітыкі СССР — атрымалі шырокае міжнароднае прызнанне, уключаны ў дзесяткі міжнародных дакументаў, у тым ліку ў Заключны акт агульнаеўрапейскай нарады ў Хельсінкі. Прапановы СССР ляглі ў аснову найбольш буйных рашэнняў ААН па пытаннях умацавання міру і бяспекі.

Але кожны крок на шляху ўмацавання міру даваўся і даецца нялёгка, патрабуючы напружанай барацьбы супраць імперыялістычных «ястрабаў». Яна асабліва абвастрылася цяпер, калі на Захадзе актывізаваліся найбольш ваяўнічыя групоўкі, чыя класавая нянавісць да сацыялізму бярэ верх над пачуццём рэальнасці, а часам і проста над разумным сэнсам.

Імперыялісты не расстаюцца з задумамі эканамічнай вайны супраць сацыялістычных краін, умяшання ў іх унутраныя справы ў надзеі расхістаць іх грамадскі лад, спрабуюць дабіцца ваеннай перавагі над СССР, усімі краінамі сацыялістычнай садружнасці.

Вядома, гэтыя планы асуджаны на правал. Нікому не дадзена павярнуць назад ход гістарычнага развіцця. Спробы «задушыць» сацыялізм зрываліся нават у той час, калі Савецкая дзяржава толькі станавілася на ногі і была адзінай сацыялістычнай краінай у свеце. І ўжо тым больш з гэтага нічога

не выйдзе цяпер. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Але нельга не бачыць, што цяперашняя палітыка Вашынгтона абвастрыла міжнародную абстаноўку да крайне небяспечных межаў.

Небывалыя, рэкордныя для ўсіх часоў маштабы прынялі ваенныя падрыхтаванні ЗША і ўзначаленага імі блока НАТО. Ад афіцыяльных прадстаўнікоў у Вашынгтоне чуваць разважанні наконт магчымасці «абмежаванай», «зацяжной» і іншых разнавіднасцей ядзернай вайны. Людзей спрабуюць супакоіць, прывучыць да думкі аб яе прымальнасці. Сапраўды трэба быць сляпым да рэальнасцей нашай эпохі, каб не бачыць: якім бы чынам, дзе б ні ўспыхнуў ядзерны смерч, ён непазбежна выйдзе з-пад кантролю, выкліча ўсеагульную катастрофу.

Наша пазіцыя па гэтым пытанні ясная: ядзернай вайны дапусціць нельга—ні малой, ні вялікай, ні абмежаванай, ні татальнай. **(Працяглыя апладысменты).** Спыніць падпальшчыкаў новай вайны — няма цяпер задачы больш важнай. Гэтага патрабуюць жыццёвыя інтарэсы ўсіх народаў. Таму, калі Савецкі Саюз узяў на сябе ў аднабаковым парадку абавязацельства — не прымяняць першым ядзерную зброю,—гэта было сустрэта з адабрэннем і надзеяй ва ўсім свеце. Калі з нас возьмуць прыклад іншыя ядзерныя дзяржавы, гэта стане сапраўды важкім укладам у справу прадухілення ядзернай вайны.

Кажуць, што Захад не можа ўзяць на сябе такое абавязацельства, паколькі, маўляў, у Варшаўскага Дагавора ёсць перавага ў звычайных узбраеннях. Перш за ўсё гэта не так, аб чым сведчаць факты і лічбы. Ну а акрамя таго, мы, як вядома, за абмежаванне такіх узбраенняў, за пошукі разумных узаемапрымальных рашэнняў і па гэтых пытаннях. Мы гатовы дагаварыцца і аб тым, каб бакі не прымянялі першымі не толькі ядзерную, але і звычайную зброю.

Адзін з галоўных шляхоў, якія вядуць да рэальнага змяншэння пагрозы ядзернай вайны, — гэта, вядома, дасягненне дагаворанасці паміж Савецкім Саюзам і Злучанымі Штатамі аб абмежаванні і скарачэнні стратэгічных ядзерных узбраенняў. Да перагавораў аб гэтым мы падыходзім з усёй адказнасцю, шукаем сумленнага пагаднення, якое не нанясе ўрону ніводнаму з бакоў і разам з тым прывядзе да скарачэння іх ядзерных арсеналаў.

Пакуль што з амерыканскага боку мы, на жаль, бачым іншы падыход. Заклікаючы на словах да «радыкальных скарачэнняў», ён на справе мае на ўвазе ў асноўным скарачэнне савецкага стратэгічнага патэнцыялу. А сабе ЗША хацелі б пакінуць свабоду рук у нарошчванні стратэгічных узбраенняў. Абсурдна нават думаць, што мы можам на такое згадзіцца. **(Апладысменты).** Усё гэта, вядома, задавальняла б Пентагон, але ніяк не можа быць прымальна для Савецкага Саюза, ды і для ўсіх, хто зацікаўлен у захаванні і ўмацаванні міру. **(Апладысменты).**

Параўнайце з гэтым прапановы СССР. Яны зыходзяць з захавання парытэту. Мы гатовы скараціць свае стратэгічныя ўзбраенні больш чым на 25 працэнтаў. Адпаведна павінны быць скарочаны і ўзбраенні ЗША, каб колькасць носьбітаў стратэгічнай зброі ў абедзвюх дзяржаў была роўнай. Мы прапануем таксама істотна зменшыць колькасць ядзерных зарадаў і максімальна абмежаваць удасканаленне ядзернай зброі.

Нашы прапановы ахопліваюць усе без выключэння віды стратэгічнай зброі, прадугледжваюць скарачэнне яе арсеналаў на многія сотні адзінак. Яны перакрываюць усе магчымыя каналы далейшай гонкі ўзбраенняў у гэтай галіне. І гэта толькі пачатак: дагаворанасць на ўказанай аснове стала б зыходным пунктам для яшчэ больш буйнога ўзаемнага скарачэння колькасцей такой зброі, аб якім бакі маглі б дагаварыцца з улікам агульнай стратэгічнай сітуацыі ў свеце.

А пакуль ідуць перагаворы, мы прапаноўваем тое, што падказвае разумны сэнс: замарозіць стратэгічныя арсеналы абодвух бакоў. Урад ЗША гэтага не хоча, і ўсім цяпер зразумела чаму: ён пачаў новае значнае нарошчванне ядзерных узбраенняў.

Спробы Вашынгтона апраўдаць гэта нарошчванне яўна негрунтоўныя. Сцвярджэнні наконт «адставання» ад СССР, якое амерыканцы быццам бы павінны наганяць,—безумоўная няпраўда, аб гэтым ужо не раз гаварылася. І ўжо зусім смехатворнымі з'яўляюцца размовы, быццам новыя сістэмы зброі, такія, напрыклад, як ракета «МХ», закліканы «дапамагчы поспеху перагавораў аб раззбраенні».

Праграмы далейшага нарошчвання ўзбраенняў не прымусяць Савецкі Саюз пайсці на аднабаковыя ўступкі. На выклік амерыканскага боку мы будзем вымушаны адказваць разгортваннем адпаведных сваіх сістэм зброі: на «МХ» — аналагічнай сваёй ракетай; на амерыканскую крылатую ракету далёкага дзеяння — сваёй крылатай ракетай далёкага дзеяння, якая ў нас ужо выпрабоўваецца. **(Працяглыя апладысменты).**

Гэта зусім не пагрозы. Мы нікольки не хочам такога ходу падзей і робім усё, каб пазбегнуць яго. Але трэба, каб і тыя, хто вызначае палітыку ЗША, і шырокая грамадскасць добра ўяўлялі сабе рэальнае становішча рэчаў. Так што калі ў Вашынгтоне сапраўды вераць, што новыя сістэмы зброі будуць для амерыканцаў «козырам» на перагаворах, то няхай ведаюць, што гэтыя «козыры» ліпавыя. **(Працяглыя апладысменты).** Палітыка, заснаваная на імкненні дасягнуць ваеннай перавагі над Савецкім Саюзам, бесперспектыўная і здольна толькі ўзмацніць пагрозу вайны.

Цяпер аб тым, што прынята называць мерамі давер'я. Мы да іх адносімся сур'ёзна.

Пры хуткасці дзеяння і магутнасці сучаснай зброі атмасфера ўзаемных падазрэнняў асабліва небяспечная. Нават недарэчная выпадковасць, пралік, тэхнічная непаладка могуць мець трагічныя вынікі. Важна таму зняць пальцы са спускавых кручкоў, паставіць зброю на надзейны засцерагальнік. Сёе-тое ў гэтым напрамку робіцца, у прыватнасці, у рамках хельсінскіх дагаворанасцей. Савецкі Саюз прапаноўвае, як вядома, і больш сур'ёзныя па характару, больш шырокія па ахопу меры. Нашы прапановы наконт гэтага знаходзяцца на стале савецка-амерыканскіх перагавораў у Жэневе па пытаннях абмежавання і скарачэння ядзерных узбраенняў.

Гатовы мы разгледзець і прапановы ў гэтай галіне, выказаныя іншымі, у тым ліку нядаўна прэзідэнтам ЗША. Але адны такія меры, аб якіх ён гаварыў, атмасферу ўзаемных падазрэнняў не рассеюць, давер'я не адновяць. Неабходна нешта большае: нармалізацыя абстаноўкі, адмова ад пропаведзі варожасці і нянавісці, ад прапаганды ядзернай вайны. І вядома ж, галоўны шлях да давер'я, да прадухілення ўсякай вайны, у тым ліку і такой, якая можа ўзнікнуць выпадкова, — гэта спыненне гонкі ўзбраенняў, вяртанне да спакойных, карэктных адносін паміж дзяржавамі, да разрадкі. **(Апладысменты).**

Мы лічым гэта важным для ўсіх рэгіёнаў планеты. Але асабліва для Еўропы, дзе любая ўспышка можа прывесці да сусветнага выбуху.

Цяпер над гэтым кантынентам навісла новая небяспека — перспектыва размяшчэння ў Заходняй Еўропе некалькіх соцень амерыканскіх ракет. Павінен сказаць адкрыта: гэта зрабіла б мір яшчэ больш нетрывалым.

Мы лічым, што пагрозу, якая навісла над еўрапейскімі народамі, ды і народамі ўсяго свету, прадухіліць можна. Мір у Еўропе можна выратаваць і ўмацаваць — прычым без шкоды для чыёй-небудзь бяспекі. Іменна для гэтага мы ўжо больш года вядзём у Жэневе перагаворы з ЗША аб тым, як абмежаваць і скараціць ядзерныя ўзбраенні ў зоне Еўропы.

Савецкі Саюз гатоў пайсці вельмі далёка. Як вядома, мы прапанавалі пагадненне аб адмове ад усіх відаў ядзернай зброі, разлічанай на паражэнне цэлей у Еўропе, — як сярэдняй дальнасці, так і тактычнай. Але гэта ініцыятыва натыкнулася на глухую сцяну маўчання. Відаць, прыняць яе не хочуць, а адкрыта адхіліць баяцца. Хачу зноў пацвердзіць, што гэта наша прапанова застаецца ў сіле. **(Апладысменты).**

Мы прапанавалі і іншы варыянт: каб СССР і краіны НАТО скарацілі свае ўзбраенні сярэдняй дальнасці больш чым у тры разы. На гэта ЗША пакуль што не ідуць. Са свайго боку яны выставілі прапанову, быццам у насмешку названую «нулявым» варыянтам. Яна прадугледжвае ліквідацыю ўсіх савецкіх ракет сярэдняй дальнасці не толькі ў еўрапейскай, але і ў азіяцкай частцы СССР — пры захаванні і нават нарошчванні ракетна-ядзернага арсенала НАТО ў Еўропе. Няўжо хтосьці сур'ёзна думае, што Савецкі Саюз з гэтым можа згадзіцца? Падобна, што Вашынгтон хацеў бы сарваць пагадненне, каб, спасылаючыся на няўдачу перагавораў, так або інакш размясціць свае ракеты на еўрапейскай зямлі.

Так гэта ці не, — пакажа будучыня. Мы ж і ў далейшым будзем дабівацца пагаднення на справядлівай для абодвух бакоў аснове. Мы гатовы, у прыватнасці, пайсці на тое, каб Савецкі Саюз захаваў у Еўропе ўсяго столькі ракет, колькі іх маюць Англія і Францыя — і ні адной больш. Гэта значыць, што Савецкі Саюз скараціў бы сотні ракет, у тым ліку не адзін дзесятак найбольш сучасных ракет, названых на Захадзе СС-20. У тым, што датычыць СССР і ЗША, па ракетах сярэдняй дальнасці — гэта быў бы сапраўды сумленны «нулявы» варыянт. А калі б колькасць англійскіх і французскіх ракет у далейшым зменшылася, то на столькі ж дадаткова скарацілася б і колькасць савецкіх.

Разам з гэтым павінна быць дасягнута і дагаворанасць аб скарачэнні да роўных узроўняў з абодвух бакоў і колькасці самалётаў—носьбітаў ядзернай зброі сярэдняй дальнасці, якія ёсць у даным рэгіёне як у СССР, так і ў краін НАТО.

Мы заклікаем нашых партнёраў пайсці на гэту ясную і справядлівую дагаворанасць, выкарыстаць гэту магчымасць, пакуль яна яшчэ ёсць. Але няхай ніхто не памыляецца: мы ніколі не дапусцім, каб наша бяспека, каб бяспека нашых саюзнікаў аказаліся пад пагрозай. Трэба было б падумаць і аб тым, якія цяжкія вынікі непазбежна мела б размяшчэнне ў Еўропе новай амерыканскай зброі сярэдняй дальнасці для ўсіх далейшых намаганняў па абмежаванню ядзерных узбраенняў наогул. Словам, цяпер адказ за ЗША.

У заключэнне скажу так, мы — за шырокае, плённае, свабоднае ад дыктату і ўмяшання ў чужыя справы супрацоўніцтва ўсіх народаў планеты да іх узаемнай выгады і на карысць усяго чалавецтва. **(Працяглыя апладысменты).** Савецкі Саюз будзе рабіць усё, што ад яго залежыць, каб забяспечыць цяперашняму і наступнаму пакаленням спакойную мірную будучыню. Гэта мэта нашай палітыкі, і ад яе мы не адступім. **(Працяглыя апладысменты).**

●

Таварышы! Азіраючыся на шлях, пройдзены за 60 гадоў Саюзам Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, мы выразна бачым, што ўсе нашы дасягненні і перамогі непарыўна звязаны з дзейнасцю ленінскай партыі камуністаў. Іменна партыя была і застаецца той магутнай творчай, мабілізуючай сілай, якая забяспечвае няспынны рух наперад на ўсіх напрамках грамадскага прагрэсу.

Па сваёй ідэалогіі, па свайму саставу і будове наша партыя — жывое ўвасабленне адзінства, згуртаванасці ўсіх нацый і народнасцей Савецкага Саюза. Нацэльваючы сваю палітыку на гарманічнае спалучэнне нацыянальных і інтэрнацыянальных інтарэсаў, партыя стварае такія сацыяльныя ўмовы, у якіх росквіт, усебаковае развіццё кожнай нацыі служаць перадумовай уздыму і росквіту ўсяго нашага брацкага саюза.

Калі мы гаворым: «Народ і партыя адзіныя!» — гэта канстатацыя таго бясспрэчнага факта, што мэты і задачы, пастаўленыя перад сабой партыяй, дакладна выражаюць спадзяванні, патрэбнасці ўсіх савецкіх людзей. І шматмільённы наш народ сваімі справамі ажыццяўляе палітыку партыі. Адно з самых відавочных сведчанняў гэтага — тыя поспехі, з якімі ўсе рэспублікі сустракаюць цяперашні юбілей. **(Апладысменты).**

Дазвольце, таварышы, выказаць глыбокую ўдзячнасць і падзяку мільёнам перадавікоў вытворчасці, якія выканалі і перавыканалі сацыялістычныя абавязацельствы, узятыя ў гонар 60-годдзя Саюза ССР. **(Працяглыя апладысменты).**

Дазвольце мне ад імя Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў СССР горача павіншаваць усіх савецкіх людзей з вялікім святам — Днём нараджэння нашага вялікага Саюза. **(Бурныя, працяглыя апладысменты).**

Няхай жыве дружба народаў, якія будуюць камунізм! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве пралетарскі, сацыялістычны інтэрнацыяналізм! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай жыве мір ва ўсім свеце! **(Бурныя апладысменты).**

Няхай квітнее Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік! **(Бурныя, працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць).**

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб сумесным урачыстым пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета Саюза ССР і Вярхоўнага Савета РСФСР

У Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, 21 снежня 1982 года, у 11 гадзін адкрылася сумеснае ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Пасяджэнне адкрыў уступнай прамовай член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. К. У. Чарненка.

З дакладам «Шэсцьдзесят гадоў СССР» выступіў Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза тав. Ю. У. Андропаў.

Ва ўрачыстым пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР прымаюць удзел члены Цэнтральнага Камітэта КПСС, кандыдаты ў члены Цэнтральнага Камітэта КПСС, члены Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС, дэпутаты Вярхоўных Саветаў СССР і РСФСР, удзельнікі Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, дэлегаты Першага Усесаюзнага

(Заканчэнне на стар. 6).

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

з'езда Саветаў, ветэраны партыі і дзяржавы з усіх саюзных рэспублік, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, працоўных горада Масквы і Маскоўскай вобласці, дзеячы навукі, літаратуры і мастацтва, воіны Савецкай Арміі і Флоту.

На сумесным урачыстым пасяджэнні прысутнічаюць партыйна-дзяржаўныя дэлегацыі сацыялістычных краін, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы многіх зарубежных краін, дэлегацыі камуністычных і рабочых партый капіталістычных і развіваючыхся краін, прадстаўнікі рэвалюцыйна-дэмакратычных партый і нацыянальна-вызваленчых рухаў і арганізацый, сацыял-дэмакратычных і сацыялістычных партый, дэлегацыі Сусветнай федэрацыі прафсаюзаў, Сусветнага Савета Міру, Арганізацыі салідарнасці народаў Азіі і Афрыкі, Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын, Міжнароднай федэрацыі барацьбітоў супраціўлення, Сусветнай федэрацыі дэмакратычнай моладзі, Міжнароднага саюза студэнтаў, Міжнароднай арганізацыі журналістаў, дэлегацыі нацыянальных прафсаюзных, жаночых, маладзёжных арганізацый, таварыстваў дружбы і культурных сувязей з СССР, кіраўнікі нацыянальных антыфашысцкіх арганізацый, члены дыпламатычнага корпуса, намеснікі пастаянных прадстаўнікоў сацыялістычных краін у СЭУ, прадстаўнікі савецкай і зарубежнай прэсы.

Пасля перапынку старшынствааў член Палітбюро ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР тав. М. А. Ціханаў.

З прывітальнай прамовай ад працоўных Масквы выступіў першы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС тав. В. В. Грышын.

З прывітальнай прамовай ад Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў Старшыня Савета Міністраў РСФСР тав. М. С. Саломенцаў.

Затым сказаў прамову горача сустрэты ўдзельнікамі ўрачыстага пасяджэння Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Балгарскай камуністычнай партыі, Старшыня Дзяржаўнага савета Народнай Рэспублікі Балгарыі тав. Тодар Жыўкаў.

З прывітальнай прамовай ад Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны тав. У. В. Шчарбіцкі.

Горача сустрэлі ўдзельнікі ўрачыстага пасяджэння выступленне Першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Венгерскай сацыялістычнай рабочай партыі тав. Яноша Кадара.

З прывітальнай прамовай ад працоўных Ленінграда і Ленінградскай вобласці выступіў першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС тав. Р. В. Раманаў.

Удзельнікі пасяджэння горача сустрэлі прамову Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі В'етнама тав. Ле Зуана.

З прывітальнай прамовай ад Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі тав. Ц. Я. Кісялёў.

Цёпла сустрэты ўдзельнікамі ўрачыстага пасяджэння, выступіў член КПСС з 1918 года, дэлегат Першага Усесаюзнага з'езда Саветаў тав. Ф. Д. Крэтаў.

На вячэрнім пасяджэнні старшынствааў член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. М. С. Гарбачоў.

З прывітальнай прамовай ад Узбекскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Узбекістана тав. Ш. Р. Рашыдаў.

Горача сустрэлі ўдзельнікі ўрачыстага пасяджэння выступленне Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Сацыялістычнай адзінай партыі Германіі, Старшыні Дзяржаўнага савета ГДР тав. Эрыха Хонекера.

З прывітальнай прамовай ад Казахскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана тав. Д. А. Кунаеў.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння цёпла віталі выступленне члена Прэзідыума Палітбюро Цэнтральнага Камітэта Працоўнай партыі Карэі, Прэм'ера Адміністрацыйнага савета Карэйскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі тав. Лі Дэн Ока.

З прывітальнай прамовай ад Грузінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі тав. Э. А. Шэварднадзе.

У Крамлёўскім Палацы з'ездаў гучыць мелодыя песні «І зноў працягваецца бой». Пад апладысменты ўсіх удзельнікаў пасяджэння ў залу ўваходзяць прадстаўнікі слаўнай савецкай моладзі: рабочага класа, калгаснага сялянства, інтэлігенцыі, студэнтаў і навучэнцаў краіны — камсамольцы і піянеры горада Масквы і ўсіх саюзных рэспублік.

Ад імя саракадвухмільённага Ленінскага камсамола яны запэўніваюць Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Вярхоўны Савет СССР, Вярхоўны Савет РСФСР, што прыкладуць усе сілы для паспяховага выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС і лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС.

Горача сустрэты ўдзельнікамі ўрачыстага пасяджэння, выступіў член Палітбюро, другі сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Кубы, першы намеснік Старшыні Дзяржаўнага савета і Савета Міністраў, міністр Рэвалюцыйных узброеных сіл Рэспублікі Куба тав. Рауль Кастра Рус.

З прывітальнай прамовай ад Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Літвы тав. П. П. Грышкявічус.

У Маскве, у Крамлёўскім Палацы з'ездаў, 22 снежня 1982 года працягвалася сумеснае ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Пасяджэнне адкрылася ў 11 гадзін. Старшынствааў член Палітбюро ЦК КПСС, міністр абароны СССР тав. Д. Ф. Усцінаў.

З прывітальнай прамовай ад Азербайджанскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Азербайджана тав. К. М. Багіраў.

Затым з прамовай выступіў горача сустрэты ўдзельнікамі ўрачыстага пасяджэння Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта НРПЛ, Старшыня Савета Міністраў Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі тав. Кейсон Фамвіхан.

З прывітальнай прамовай ад Малдаўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Малдавіі тав. С. К. Гросу.

Удзельнікі пасяджэння горача сустрэлі выступленне Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Мангольскай народна-рэвалюцыйнай партыі, Старшыні Прэзідыума Вялікага народнага хурала Мангольскай Народнай Рэспублікі тав. Юмжагійна Цэдэнбала.

З прывітальнай прамовай ад Латвійскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Латвіі тав. А. Э. Вос.

Горача сустрэлі ўдзельнікі пасяджэння выступленне Першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Польскай аб'яднанай рабочай партыі, Старшыні Савета Міністраў Польскай Народнай Рэспублікі тав. Войцеха Ярузельскага.

З прывітальнай прамовай ад Кіргізскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Кіргізіі тав. Т. У. Усубаліеў.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння цёпла сустрэлі выступленне Генеральнага сакратара Румынскай камуністычнай партыі, Прэзідэнта Сацыялістычнай Рэспублікі Румыніі тав. Нікалае Чаушэску.

З прывітальнай прамовай ад Таджыкскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Таджыкістана тав. Р. Н. Набіеў.

Затым выступіў з прамовай горача сустрэты ўдзельнікамі ўрачыстага пасяджэння Генеральны сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Чэхаславакіі, Прэзідэнт Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспублікі тав. Густаў Гусак.

З прывітальнай прамовай ад Армянскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Арменіі тав. К. С. Дземірчан.

Удзельнікі пасяджэння цёпла сустрэлі выступленне члена Прэзідыума Сацыялістычнай Федэратыўнай Рэспублікі Югаславіі, члена Цэнтральнага Камітэта Саюза камуністаў Югаславіі тав. Лазара Калішэўскага.

Пасля перапынку старшынствааў член Палітбюро ЦК КПСС, сакратар ЦК КПСС тав. К. У. Чарненка.

З прывітальнай прамовай ад Туркменскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Туркменістана тав. М. Г. Гапураў.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння горача сустрэлі выступленне Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Народна-дэмакратычнай партыі Афганістана, Старшыні Прэзідыума Рэвалюцыйнага савета Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан тав. Бабрака Кармаля.

Затым з прывітальнай прамовай ад Эстонскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Эстоніі тав. К. Г. Вайна.

Прысутныя цёпла сустрэлі выступленне Прэзідэнта Фінляндскай Рэспублікі Мауна Койвіста.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння бурнымі, працяглымі апладысментамі сустрэлі дэлегацыю Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту.

Пад гукі марша, з баявымі, авеянымі славай сцягамі ў залу ўваходзяць прадстаўнікі ўсіх відаў войск, доблесныя абаронцы Радзімы, якія пільна ахоўваюць мірную працу савецкага народа. Са словамі сардэчнага прывітання ад імя ўсіх воінаў Савецкай Арміі і Флоту да ўдзельнікаў урачыстага пасяджэння звяртаецца камандзір танкавай дывізіі генерал-маёр В. А. Капылоў. Ён запэўніў партыю Леніна, савецкі народ, што яны могуць цвёрда спадзявацца на сваіх сыноў, якія нясуць ганаровую службу па абароне заваёў сацыялізму.

Горача сустрэлі ўдзельнікі пасяджэння выступленне Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Йеменскай сацыялістычнай партыі, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Народнага савета, прэм'ер-міністра Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі Йемен тав. Алі Мухамеда.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння горача сустрэлі выступленне Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта Народна-рэвалюцыйнай партыі Кампучыі, Старшыні Дзяржаўнага савета Народнай Рэспублікі Кампучыі тав. Хенга Самрына.

Прысутныя горача сустрэлі выступленне члена Палітбюро партыі Фронт нацыянальнага вызвалення Алжыра, прэм'ер-міністра Алжырскай Народнай Дэмакратычнай Рэспублікі тав. Махамеда Абдэль-гані.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння з вялікім натхненнем, аднагалосна прымаюць Зварот «Да парламентаў, урадаў, палітычных партый і народаў свету».

На гэтым сумеснае ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўнага Савета РСФСР, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, аб'яўляецца закрытым. Гучыць велічная мелодыя Гімна Савецкага Саюза.

ХРОНІКА

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМУ»

Фільмы з маркай кінастудыі «Беларусьфільм» у апошні час карыстаюцца ўсё большай папулярнасцю ў гледача, станоўча ацэньваюцца крытыкай. «Вазьму твой боль», «Трэцяга не дадзена», «Паводка», «Ветразі майго маленства» — гэтыя і іншыя стужкі з поспехам дэманстраваліся на ўсесаюзным экране. Плённа працаваў калектыў студыі ў сёлетнім, юбілейным годзе. Слаўную гадавіну — 60-годдзе ўтварэння СССР — беларускія кінематаграфісты сустрэлі шэрагам новых цікавых стужак.

Сярод гэтых работ — фільм «Подых навальніцы». Гэта другая частка кінатрылогіі, якую ставіць па раманах народнага пісьменніка Беларусі І. Мележа В. Тураў. «Людзі на балоце» была адзначана галоўным прызам на XV Усесаюзным кінафестывалі, а на XXIII кінафестывалі, што праходзіў у Карлавых Варах, — прэміяй.

За дасягненне высокіх творчых паказчыкаў ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў азнаменаванне 60-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, як мы паведамлялі ўжо, кінастудыя ўзнагароджана пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. У сувязі з гэтай знамянальнай падзеяй у жыцці калектыву ў Доме кіно адбыўся ўрачысты сход.

Высокую ўзнагароду калектыву кінастудыі «Беларусьфільм» на ўрачыстым сходзе ўручыў сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА

Радуюць працоўныя поспехі выдавецтва «Мастацкая літаратура», якому споўнілася дзесяць гадоў. Час гэты параўнальна невялікі, але ён стаў перыядам, за які выдавецтва здолела стаць зладжаным калектывам. За паспяховае выкананне і перавыкананне Дзяржаўнага плана эканамічнага і сацыяльнага развіцця на 1982 год і дасягненне высокіх эканамічных вынікаў Цэнтральны Камітэт КП Беларусі, Савет Міністраў БССР, Беларускі рэспубліканскі савет прафесійных саюзаў і Цэнтральны камітэт ЛКСМ Беларусі прызналі калектыў выдавецтва «Мастацкая літаратура» поруч з іншымі перадавымі калектывамі рэспублікі пераможцам у рэспубліканскім сацыялістычным спаборніцтве ў азнаменаванне 60-годдзя ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік і ўзнагародзілі пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ з дыпломам і грашовай прэміяй.

У сувязі з гэтай знамянальнай падзеяй у жыцці калектыву, у выдавецтве адбыўся ўрачысты сход, які адкрыў намеснік галоўнага рэдактара «Мастацкай літаратуры» В. Бечык. Ён адзначыў, што ўзнагарода выдавецтва пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, Белсаўпрофа і ЦК ЛКСМБ — радасная вестка, якая глыбока ўсхвалявала ўвесь калектыў, выклікала ва ўсіх жаданне працаваць яшчэ больш творча, па-ўдарнаму, каб паспяхова справіцца з тымі задачамі, якія пастаўлены на адзінаццатай пяцігодцы.

Па даручэнню Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі пераходны Чырвоны сцяг калектыву выдавецтва «Мастацкая літаратура» ўручыў загадчык аддзела культуры ЦК КПБ І. І. Антановіч.

Дырэктар выдавецтва М. Дубянецкі падзякаваў за высокую ўзнагароду, выказаў упэўненасць, што калектыў «Мастацкай літаратуры» і ў далейшым будзе працаваць так, каб не здаць заваяваных пазіцый. М. Дубянецкі расказаў пра найбольш значныя кнігі, якія ўбачылі свет у выдавецтве ў апошні час, гаварыў аб планах на будучае.

М. Дубянецкі ўручыў ганаровыя знакі «Ударнік адзінаццатай пяцігодкі» супрацоўнікам выдавецтва Я. Бебель і Г. Федарук.

На сходзе выступілі таксама старшыня Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю М. І. Дзялец, І. Чыгрынаў, В. Палтаран, Р. Барадулін, В. Шарамета.

ДА ПАРЛАМЕНТАЎ, УРАДАЎ, ПАЛІТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ І НАРОДАЎ СВЕТУ

Мы, прадстаўнікі ўсіх народаў СССР, якія сабраліся ў Маскве, каб урачыста адзначыць шасцідзесятую гадавіну ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, ад імя двухсот сямідзесяці мільёнаў савецкіх людзей звяртаемся да парламентаў, урадаў, палітычных партый і народаў зямлі з гэтым пасланнем міру.

Тое, аб чым вякамі марылі лепшыя розумы чалавецтва — пераадоленне нацыянальнай варожасці і непрыязнасці, сапраўднае раўнапраўе і дружба розных нацый, — стала явай у нашай краіне дзякуючы ленінскай палітыцы Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы, дзякуючы ажыццяўленню сацыялістычных прынцыпаў нацыянальнай і сацыяльнай свабоды, ліквідацыі ўсіх форм прыгнечання і эксплуатацыі.

Новыя адносіны паміж людзьмі, паміж нацыямі ў сацыялістычнай дзяржаве вызначаюць і знешнюю палітыку СССР. Наш ідэал, наша нязменная мэта і пастаянныя клопаты — усеагульны мір, дружба і супрацоўніцтва паміж народамі.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя азнаменавала пачатак новай гістарычнай эпохі. Скінуўшы сацыяльны і нацыянальны прыгнёт, людзі працы стварылі Краіну Саветаў — дзяржаву, якая ўсталявала брацкую дружбу і раўнапраўныя адносіны народаў, забяспечыла для ўсіх нацый сапраўдную свабоду, прагрэс і працвітанне.

Трывалы, надзейны, устойлівы мір — гэта першая і самая настойлівая патрэбнасць усіх людзей, усіх народаў, усяго чалавецтва.

Патрабаванне міру набывае асабліва важнае значэнне ў цяперашніх умовах, калі дзяржавы маюць зброю, здольную знішчыць чалавечую цывілізацыю, само жыццё на зямлі, і калі пагроза вайны, якую ўдалося прыкметна аддаліць у 70-х гадах, зноў пачала ўзмацняцца, а міжнародная напружанасць адчувальна нарастае.

Усе намаганні дзяржаў, актыўнасць урадаў, арганізаваных палітычных сіл, усіх грамадзян кожнай краіны павінны быць звернуты цяпер на тое, каб не дапусціць ядзернай катастрофы. Няма і не можа быць больш важнага пытання.

Мы, паўнамоцныя прадстаўнікі савецкага народа, урачыста заяўляем, што Савецкі Саюз, кіруючыся ленінскай палітыкай міру і міжнароднага супрацоўніцтва, зробіць усё, што ад яго залежыць, для прадухілення вайны.

Мы пацвярджаем, што ў адпаведнасці з прынятым на сябе абавязацельствам Савецкі Саюз не прыменіць першым ядзернай зброі, і яшчэ раз звяртаемся да іншых ядзерных дзяржаў з заклікам узяць на сябе такое ж абавязацельства.

Мы заяўляем аб гатоўнасці Савецкага Саюза замарозіць на ўзаемнай аснове са Злучанымі Штатамі Амерыкі арсеналы сваёй ядзернай зброі.

Мы выступаем за хуткае і выніковае завяршэнне савецка-амерыканскіх перагавораў аб абмежаванні і скарачэнні стратэгічных узбраенняў і аб абмежаванні ядзерных узбраенняў у Еўропе, за хутчэйшае дасягненне дагаворанасці аб скарачэнні ўзброеных сіл і ўзбраенняў у Цэнтральнай Еўропе.

Мы прапануем неадкладна дагаварыцца аб поўнай і ўсеагульнай забароне выпрабаванняў ядзернай зброі, з тым каб больш не маглі стварацца яе новыя віды і тыпы.

Мы выступаем за забарону і знішчэнне хімічнай зброі.

Мы заклікаем да хутчэйшага аднаўлення спыненых перагавораў па ўсіх іншых пытаннях абмежавання і скарачэння ўзбраенняў.

Мы звяртаемся да заканадаўчых органаў і ўрадаў усіх дзяржаў свету з заклікам актыўна садзейнічаць урэгуляванню канфліктных сітуацый і ачагоў напружанасці выключна палітычнымі сродкамі.

Мы выступаем за ўмацаванне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, павышэнне яе ролі ва ўмацаванні міжнароднага міру і бяспекі.

У імя гэтых мэт Савецкі Саюз гатоў супрацоўнічаць з усімі дзяржавамі свету незалежна ад іх палітычных і сацыяльных сістэм.

Вялікая гістарычная адказнасць ляжыць цяпер на ўсіх дзяржавах свету, адказнасць за сучаснасць і будучыню.

Савецкія людзі перакананы, што дзяржавы і народы, аб'яднаўшы свае намаганні, змогуць перамагчы ваенную пагрозу, захаваць і ўмацаваць мір на зямлі, забяспечыць права чалавека на жыццё. Да такога аб'яднання намаганняў мы заклікаем парламенты, урады, палітычныя партыі і народы зямлі.

Вярхоўны Савет Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

Зварот «Да парламентаў, урадаў, палітычных партый і народаў свету» аднагалосна прынят на сумесным урачыстым пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта КПСС, Вярхоўнага Савета Саюза ССР і Вярхоўнага Савета РСФСР 22 снежня 1982 года.

НАДЗЁННАЯ РАЗМОВА

І ЗНОЎ У КОЛАСАВЫМ ДОМЕ

Ужо адно — пабыць тут, пажыць у гэтым доме, што абступілі з усіх бакоў векавыя яліны — вялікая радасць, а надалей, мо нават на ўсё жыццё, светлы харошы ўспамін. Ён сапраўды незвычайны, гэты драўляны двухпавярховы дом, бо ўсё тут помніць дзядзьку Якуба, чыё 100-годдзе з дня нараджэння нядаўна адсвяткавала ўся Савецкая краіна. Тут вялікі пясняр на працягу шасці гадоў жыў і працаваў над сваімі неўміручымі творамі. І як добра, сімвалічна нават, што менавіта сюды, у гэтае святое для кожнага з нас месца, злятаюцца з усіх куткоў зямлі беларускай тыя, хто толькі-толькі пачынае свой шлях у літаратуру, шукае сябе ў слове.

На традыцыйны каралішчавіцкі семінар маладых літаратараў, што праходзіў на мінулым тыдні ў Доме творчасці і адпачынку імя Якуба Коласа, з'ехаліся прадстаўнікі ўсіх абласцей рэспублікі. Большасць з «семінарыстаў» друкаваліся ў рэспубліканскіх газетах і часопісах, некаторыя падрыхтавалі да друку свае першыя кнігі. Гэта абяцала, што работа пойдзе цікава як для прысутных, так і для іх кансультантаў. Акрамя таго, на семінар былі запрошаны госці з Масквы і Вільнюса: цікавы паэт і перакладчык, прадстаўнік выдавецтва «Советский писатель» Пётр Кошаль, супрацоўніца аддзела прозы часопіса «Литературная учеба» Ларыса Баранава і паэтэса і перакладчыца Марытэ Кантрымайтэ.

На адкрыццё семінара прыехалі першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі Н. Гілевіч, загадчык сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ С. Законнікаў, загадчык аддзела культуры ЦК ЛКСМБ У. Пракапцоў, сакратары праўлення Саюза пісьменнікаў І. Чыгрынаў і Б. Сачанка, старшыня камісіі па рабоце з маладымі пісьменнікамі Я. Сіпакоў.

У наступныя дні тыдня «семінарыстаў» чакала напружаная работа секцый, а ў вольныя гадзіны — цікавыя лекцыі і сустрэчы. Яны сустрэліся з народным паэтам БССР Пімёнам Панчанкам і народным паэтам БССР Іванам Шамякіным. Выдатныя майстры слова, чые творы кожнаму з пасляваенных пакаленняў пісьменнікаў вядомы яшчэ з дзяцінства збо са школьнай парты, у жывой таварыскай гутарцы расказалі ўдзельнікам семінара пра свае жыццёвыя і літаратурныя шляхі-дарогі, падзяліліся думкамі пра сённяшні стан нашай літаратуры, адказалі на шматлікія пытанні зацікаўленых слухачоў. Думаецца, гэтыя сустрэчы асабліва запомняцца тым, хто прыняў у іх удзел.

Затым на секцыі паэзіі, якой кіравалі лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы Р. Барадулін і паэт У. Скарынкін, была разгледжана творчасць 25 маладых аўтараў. У абмеркаванні іх вершаў прынялі ўдзел такія вядомыя ў рэспубліцы паэты як А. Зарыцкі, Ю. Свірка, Я. Янішчыц, К. Камейша, А. Вольскі, В. Ракаў, Г. Пашкоў і іншыя.

Пасля заканчэння работы секцыі ў гутарцы са мною Р. Барадулін і У. Скарынкін адзначылі, што сярод маладых паэтаў не было выпадковых людзей, прыехалі сапраўды здольныя, з адчуваннем паэтычнага слова аўтары.

Прыемнае ўражанне зрабілі на ўсіх вершы школьніка з Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці А. Бадака. Яго паэтычныя спробы падкупляюць чысцінёю і свежасцю ўспрыняцця, лёгкасцю і рухомасцю радка.

Глыбокая эрудыцыя і культура адчуваецца ў вершах аспіранткі Інстытута літаратуры АН БССР І. Багдановіч, якая, дарэчы, з поспехам спрабуе сябе ў перакладчыцкай дзейнасці.

Цырульнік з Гродна В. Шумская робіць толькі першыя крокі ў паэзію, аднак яны заслугоўваюць увагі жаданнем сказаць па-свойму, арыгінальна.

Зусім у іншым ключы працуе інжынер-энергетык з Мінска У. Пецюкевіч, вершы якога ўжо неаднойчы змяшчаліся ў рэспубліканскай перыёдыцы. Творам гэтага аўтара характэрны меладычнасць, цяга сказаць проста і ў той жа час запамінальна. Адчуваецца, што малады паэт шмат вучыцца, чэрпае сваё натхненне з вечна жывой крыніцы матчынай песні.

На секцыі былі таксама абмеркаваны рукапісы першых паэтычных зборнікаў А. Касценя, В. Аколзнай, А. Усені, В. Сахарчука, што неўзабаве ўбачаць свет у выдавецтвах рэспублікі.

Секцыяй прозы кіравалі М. Тычына і Э. Ялугін. Творчасць маладых празаікаў і драматургаў абмяркоўвалі Я. Скрыган, У. Юрэвіч, Г. Далідовіч, П. Місько, Я. Лецка, У. Жыжэнка, В. Гігевіч, М. Герчык і іншыя вядомыя пісьменнікі.

На маё пытанне, чым асаблівым, цікавым вызначаецца проза сёлетняга семінара, кіраўнікі секцыі адказалі: прыходам у літаратуру людзей з тэхнічнай адукацыяй, якія нядрэнна валодаюць пісьмом і словам, а яшчэ, што не менш важна, добра ведаюць сучасную прамысловасць, яе шматлікія вострыя праблемы. І гэта не можа не радаваць, бо твораў на рабочую тэматыку, пра сённяшні горад — даўно чакаюць і выдаўцы, і чытачы.

Па-сапраўднаму цікава і карысна для прысутных прайшло абмеркаванне першай кнігі апавяданняў М. Барэйшы, які раней працаваў у маладой у нашай рэспубліцы нафтавай прамысловасці, а цяпер з'яўляецца супрацоўнікам адной з раённых газет Віцебскай вобласці. Як адзначылі Л. Дайнека і Г. Шыловіч, якія разглядалі творчасць М. Барэйшы, большасць апавяданняў кнігі вылучаецца паэтычнай настраёвасцю, добрым веданнем мовы, цягаю да раскрыцця складаных маральна-этычных вузлоў нашага часу. Разам з тым старэйшыя таварышы засцераглі маладога пісьменніка ад празмернай сентыментальнасці, раілі яму ўнікаць прыгожых, але з невялікай сэнсавай нагрузкай сказаў, паспрабаваць сябе ў іншых жанрах: у кнізе сустракаюцца апавяданні, якія чытаюцца як асобныя раздзелы цікавага, больш буйнога твора.

Высока ацанілі пісьменнікі і ўдзельнікі семінара апавяданні Хрысціны Лялько. Маладая пісьменніца надрукавала ў рэспубліканскіх часопісах і газетах усяго тры апавяданні, але яны вызначаюцца багатаю, жывою моваю, пільнаю ўвагаю да душэўных зрухаў сваіх герояў, добрым веданнем іх псіхалогіі. Хацелася б пажадаць маладой аўтарцы часцей выступаць на старонках рэспубліканскіх выданняў, больш пісаць.

Імя А. Зайко, настаўніка з Івацэвіцкага раёна, яшчэ невядома тым, хто сочыць за развіццём маладой беларускай літаратуры па перыядычных выданнях. Пачынаючы пісьменнік прывёз на семінар апавяданні і абразкі, якія парадавалі ўсіх глыбінёю думкі, багатай, ні ў кога не пазычанай, мясцовай лексікай.

Жывую цікавасць слухачоў выклікалі гумарыстычныя апавяданні журналіста з Віцебшчыны У. Сауліча, якія былі прачытаны на адным з пасяджэнняў секцыі. Разам з тым пачынаючаму гумарысту было зроблена шэраг заўваг, у прыватнасці, выказвалася пажаданне болей працаваць над словам.

Пра апавяданні інжынера з Мінска М. Стэльмака гаварыў загадчык аддзела прозы часопіса «Маладосць» У. Дамашэвіч. Ён адзначыў, што малады пісьменнік звяртаецца да цікавых тэм, напрыклад, спрабуе расказаць пра беларусаў, якія жывуць і працуюць далёка ад роднай зямлі, і, нягледзячы на асобныя недахопы, яго апавяданні варты таго, каб быць надрукаванымі на старонках часопіса.

Празаік з Гомеля В. Ткачоў, апавяданні і артыкулы якога часта змяшчаюцца на старонках рэспубліканскай прэсы, прывёз на семінар п'есу «Дэзерцір», дзе закранаюцца балючыя праблемы з жыцця сучаснай вёскі. А. Дудараў, які кансультаваў гэты твор, сказаў, што дэбют можна лічыць удалым і што наперадзе, каб сцвердзіць сябе, пачынаючага драматурга чакае нялёгкая адказная праца.

Закрыццё семінара адбылося 17 снежня. На пытанні ўдзельнікаў семінара адказвалі Н. Гілевіч, І. Чыгрынаў, Б. Сачанка, Я. Сіпакоў, С. Законнікаў, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць» А. Грачанікаў, галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» А. Жук, галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва» Я. Каршукоў, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура» У. Паўлаў.

У. ЯГОЎДЗІК,
спец. карэспандэнт «ЛіМа».

Мікалай ЦІХАНАЎ

(Расія)

З песень свабоды

Крывёю гарачай, чырвонай,
Абмыты наш молат святы.
Народы, нясіце кароны,
Мы іх разаб'ем назаўжды.
Няхай не алмазы іскрацца
На важных галовах, пустых,
Няхай наша вольная праца
Над светам узводзіць масты.

Хто выклік тырану не кінуў,
Той будзе надоўга рабом,
У велічы вольнай краіны
Мы працаю вольнай жывём.
Над намі вар'яты сядзелі,
Пасвіставў бізун над спіной.
Мы надта іх доўга цярпелі,
Плацілі высокай цаной.

Былое згарэла ў змаганні,
А ў жылах атрута цячэ.
Народы, сачыце старанней,
Каб не памыліцца яшчэ...
А з тых, хто цаніўся багата,
Бразголкі іх узнагарод
У час непазбежнай расплаты
Няхай пазрывае народ.

Мы выйшлі з густога туману
І новай дарогай ідзём,
Напэўна, аж да акіяну
Мы вольны свой сцяг данясём.
Магчыма, з акопа ў акопы,
Як хвалі, агні загудуць,
І чорныя троны Еўропы,
Як здані, у прорву ўпадуць.

І, скінуўшы транты жалобы,
Усклікне паўстаўшы народ:
— Мы ўсталі ад цяжкай хваробы,
Ад сну разбудзілі свой род.
Загояцца даўнія раны
На безлічы збітых гарбоў,
Не будзе на тронах тыранаў,
Не будзе ля тронаў рабоў,

Бо молат наш выкаваў зброю
Пад сцягам з праменняў жывых
Для ўсіх бессмяротных герояў
За волю для бітваў святых.
У печаў агністае лона
Кладуцца кавалкі руды...
Народы, нясіце кароны,
Мы іх разаб'ем назаўжды!

Пераклаў Сяргей ГРАХОЎСКІ.

Барыс АЛЕЙНІК

(Украіна)

Мой доўг

Я тым ужо даўжнік,
што родам з Украіны:
Дала нам доля шчодрыя правы
На сушу і ваду і ў вышыні арлінай
На два крылы вясёлай сінявы.

Славуты чарназём мой плодны,
як жанчына.
Гісторыя глыбокая няўсцерп.
Заўжды на залатых абжынках
без спачыну
Гуляе ў нас са смеху літы серп.

Зайдзі ў маё сяло — куды твайму
эдэму:
Ставок. Хрушчы. Гаёў зялёнаграй.
А маладзік такі — адразу ў дыядэму
Бяры сваёй Чурай.

Вядома Сеч мая не хвацкасцю галопа —
Магутнымі сынамі! І калі
Дрыжала ў паніцы перад ардой Еўропа,
Я іх паслаў на смерць,
каб мы і вы жылі.

Кроў дужая ў мяне! Гарачая на дзіва.
І, пэўна, нездарма татарскі людалоў
Агонь маіх дзяўчат высмоктваў
хапатліва,
Каб асвяжыць сваю, ужо старую кроў,

Нястомна аддаюць усе мае гароды
Цыбулі, кавунам магутны сок зямлі.
Заходзь і выбірай, як маеш недароды.
Але не праз вакно —
такія ўжо былі.

Я тысячам даўжнік: не кожнаму хапіла
Гарэзных песень даўняга віна.
Ды я частую ўсіх: пі, калі сэрцу міла,
Хмялей і весялей — хапае вам і нам.

Не кожны шчасце меў
парою вечаровай
З няўтольнаю тугой зірнуць за небасхіл,
Ды я падараваў сусвету Каралёва —
Ягоны ўзлёт і вам няхай прыбавіць сіл.
Не падыходжу я для ролі месіянскай.
Усё, што меў, і ўсё,
што на вяку
Адпушчана было мне доляю славянскай,
Нясу заўжды да ўсіх на талаку.

І гэта шчасце — у людскім хаўрусе
Свае даўгі і долю мець сваю...
Я тысячам даўжнік!
Ды аднаму камусьці —
Не быў. Не ёсць. Не буду.
і на тым стаю!

Пераклаў Генадзь БУРАЎКІН.

Юсцінас МАРЦІНКЯВІЧУС

(Літва)

Пяю Літву

Пяю Літву, як радасць тую,
Што з папялішчаў узрасла,
Як мару самую святую,
Што шляхам прада мной лягла.

Зялёны шоўк лугоў надрэчных,
Што атуліў маё сяло,
Цяпло тваёй разумнай печы,
Нібы сяброўскае цяпло.

Прашу перада мной раскрыцца
Крыніцай дум і сэрц сваіх.
Глынуць дай з гэтае крыніцы,
Дзе б'е струмень надзей жывых.

Яшчэ крычыць уся тут глеба,
Магілы з ранамі гудуць.
Бяру ў руку кавалак хлеба
І з вамі гутарку вяду.

Вяду я гутарку жывую
З агнём, паветрам, шумам дрэў.
Ды з усяго, што маю, чую
Вас — як Літвы маёй напеў.

Пераклаў Максім ТАНК.

Грыгол АБАШЫДЗЕ

(Грузія)

Ленін у Грузіі

Свеціцца ў памяці гэта сустрэча
На узбярэжжы далёкай пары.
Бачыцца добра з даліны двухрэчча —
Ленін стаіць над плацінай Куры.

Святлом жыватворным запоўнен да
краю,
На п'едэстале вітае зару.
Руку да ракі ён натхнёна ўзнімае,
Ленін вялікі глядзіць на Куру.

І ад ЗаГЭСа над Грузіяй крута
Успышкі святла узняліся — відны.
І ў сэрцы заўсёды у тую мінуту
Ленін з зарою у ззянні адным.
Гэта сустрэча мне свеціць праменна,
Зноў напамін пра яе загучаў, —
Стаў для мяне ён святла ўвасабленнем,
Воблік любімага мной Ільіча.

Праходзіў і я над Рыёнам бурлівым,
ХрамГЭС адгукалася хваляй крутой —
Ленін усюды ў краіне шчаслівай
У яркай зары паўстае прада мной.

Зноўку Ільіч паўстае перад намі,
Дорыць ён песні маёй старане,
Крылы растуць у мяне за плячамі,
І далячынь адкрываецца мне.

І на Самгорскай раўніне узнятай,
Там, дзе складаю я песню сваю,
Леніна бачу з рукою узнятай,
Воблік святлейшы я зноў пазнаю.

Лісце шуміць на самгорскім прасторы.
У марах мне хочацца так уяўляць:
Ленін вялікі стаіць над Іёры,
І хвалі Іёры пакорна маўчаць.

Так мне здаецца: Ільіч з п'едэстала
Светлай Іёры загад аддае,
Каб па зямлі разнясла, распляскала
Промні, імклівыя промні свае.

Хутка патокам у родныя далі
Хлыне святло і успыхне іскрой.
Ленін над чыстай іёрскай вадою
У ззянні зары паўстае прада мной.

Пераклаў Юрась СВІРКА.

Кайсын КУЛІЕЎ

(Кабардзіна-Балкарыя)

Героі гор

У краі тым, дзе вольнымі бывалі
Вяршыні гор нягодам насупор,
Вы з матчынаю песняй успрынялі
Да вольнасці любоў, героі гор!

Нямала вы ў жыцці зазналі болю,
Быў хлеб ваш горкім і салёным пот,
І толькі мару светлую пра волю
Не мог скаваць шматвекавы прыгнёт.

Узняўшы да нябёс паўстання хвалі,
Паклікаў вас Кастрычнік дарагі,
Дзіцячай верай вочы вашы ззялі,
Калі глядзелі на яго сцягі.

Ён дапамог вам
з цёмнай саклі выйсці
І за сабой павёў на барацьбу.
На ворага ішлі вы, як калісьці
На ворыва, касьбу, і малацьбу.

Тых дзён далёкіх славячы адвагу,
Я, ваш нашчадак, бачу вас жывых —

Новыя пераклады беларускай літаратуры ў Балгарыі

У братняй Балгарыі назіраецца вялікая цікавасць чытачоў да лепшых твораў сучаснай савецкай літаратуры. Нядаўна ў выдавецтве ЦК Балгарскай камуністычнай партыі «Партиздат» у серыі «Сучасная савецкая проза», што знаёміць з найбольш важнымі, этапнымі навінкамі, якія вызначаюць асноўную тэндэнцыю развіцця літаратурнага працэсу ў СССР, выйшла аповесць лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР Івана Пташнікава «Найдорф». Пераклала гэты твор з беларускага арыгінала Лілі Лашкава, адна з тых здольных маладых перакладчыц беларускай мастацкай літаратуры, якіх згрупаваў вакол сябе вядомы папулярызатар і прапагандыст нашага краснага пісьменства, майстар мастацкага перакладу Сімяон Уладзіміраў. Лілі Лашкава—мовазнавец па прафесійнай падрыхтоўцы і адукацыі, кандыдат філалагічных навук, паспяхова працуе ў галіне параўнальнага сінтаксісу і лексікалогіі славянскіх моў. Станоўчыя водгукі ў Балгарыі і ў славістаў іншых краін выклікалі яе апошнія даследаванні — «Да тыпалогіі сінтаксісу прыметнікаў у беларускай і балгарскай мовах» і «Функцыянальныя эквіваленты катэгорый пэўнасці і няпэўнасці ў беларускай і балгарскай мовах».

«Найдорф» І. Пташнікава — першы значны пераклад Л. Лашкавай з беларускай мовы, хоць раней выйшлі перакладзеныя ёю апавяданні А. Кудраўца, М. Гіля, Л. Гаўрылкіна. І. Пташнікава, Г. Далідовіча для анталогіі беларускага апавядання на сельскую тэму «Пад пошум дубоў», а таксама ўключаная ў юбілейны аднатомнік аповесць Я. Коласа «Дрыгва». Прафесійная мовазнаўчая арыентацыя, безумоўна, дапамагла Л. Лашкавай перадаць рытміка - стылістычную структуру прозы І. Пташнікава, лексічнае багацце аповесці «Найдорф», знайсці адпаведныя эквіваленты метафарычным і мясцовым выразам, на якія такая багатая проза беларускага пісьменніка. У выніку балгарскія чытачы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з непаўторнымі вобразамі гэтай аповесці — з Яхрэмам Жаваранкам, Алёшам, Кланяй. Альдзяй, з іх жыццём у вельмі напружаны і складаны час пераходу ад вайны да міру на беларускай зямлі летам 1944 года.

Сярод тых, хто прымаў удзел у балгарскім выданні «Найдорфа» І. Пташнікава, прыемна бачыць прозвішчы даўніх сяброў нашай літаратуры: рэдактар — Сімяон Уладзіміраў, рэцэнзент — Пенка Кынева. Кніга прыгожа афармлена супервокладкай і малюнкамі мастака У. Канавалава. Спецыяльную прадмову да выдання напісаў беларускі крытык і балгарыст Ванкарэм Нікіфаровіч. Аўтар прадмовы прасочвае асаблівасці ідэйна-мастацкай праблематыкі твораў літаратурнага пакалення, да якога належыць І. Пташнікаў, спыняецца на эвалюцыі творчага росту пісьменніка ў напрамку большай псіхалагічнай паглыбленасці пры абмалёўцы вобразаў і адпаведнага эмацыянальнага ўздзеяння прозы на чытачоў, падрабязна аналізуе антываенныя аповесці І. Пташнікава «Тартак» і «Найдорф». Застаецца дадаць, што кніга выдадзена тыражом 17 тыс. экземпляраў.

Амаль адначасова ў выдавецтве «Хрыста Г. Данаў» выйшаў з друку раман народнага пісьменніка БССР Івана Шамякіна «Вазьму твой боль». Пераклаў гэты твор на балгарскую мову Іван Дайчынаў, які пасля стажыроўкі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце паспяхова працуе ў галіне перакладаў з беларускай мастацкай літаратуры. У яго творчым актыве — раман І. Чыгрынава «Апраўданне крыві», а таксама апавяданні Я. Скрыгана, А. Пальчэўскага, А. Асіпенкі, А. Васілевіч, М. Парахневіча, А. Варановіча, Л. Дайнекі. Пераклад І. Дайчынавым рамана І. Шамякіна вызначаецца высокай моўнай культурай, уменнем перадаць усе найдрабнейшыя адценні стану душы персанажаў як ва ўнутраных маналогах, так і ў вельмі жывых, каларытных дыялогах шамякінскіх герояў.

Трэба адзначыць, што творы І. Шамякіна вельмі папулярныя ў Балгарыі, чытача прываблівае зварот пісьменніка да вострых надзённых маральна - этычных праблем сучаснасці. Амаль усе новыя творы І. Шамякіна ў апошнія пятнаццаць год перакладаюцца аператыўна. Да рамана «Вазьму твой боль» прадмову напісала маладая перакладчыца і даследчыца беларускай літаратуры, выхаванка аспірантуры БДУ Румяна Эўцімава. «Трывожная адказнасць за чалавека»,— так называецца гэта прадмова, якая ўяўляе пэўную цікавасць і для нашага літаратуразнаўства. Р. Эўцімава імкнецца паказаць, як новы раман узбагачае і пашырае ідэйна-тэматычныя і эстэтычна - маральныя абсягі творчасці І. Шамякіна. На думку даследчыцы, пісьменнік у гэтым творы пераканаўча і праўдзіва паказвае, што жыццё сучасніка больш складанае і глыбокае, чым гэта здаецца на першы погляд, яно саткана з бясконцых нітак разнастайных чалавечых узаемаадносін. Аналізуючы структуру шматпланавай фабулы рамана, Р. Эўцімава спрабуе вызначыць асноўныя рысы індывідуальнай творчай манеры пісьменніка. Зазначыўшы, што адна з такіх рыс — гэта канцэнтрацыя ўвагі на ўнутраным свеце асноўнага

героя Івана Батрака, Р. Эўцімава працягвае: «У першых раздзелах выяўляецца і другая асаблівасць апавядальнага стылю І. Шамякіна: ён з самага пачатку нібыта імкнецца даць вельмі поўнае, насычанае ўяўленне пра вобраз, а потым дае яму магчымасць дзейнічаць самастойна, паводле логікі развіцця характару і абставін. Знаўца чалавечай душы, пісьменнік валодае псіхалагічным аналізам, ён умее пранікнуць у духоўны свет сваіх герояў, і гэта спрыяе мастацкай пераканальнасці і праўдзівасці тых чалавечых тыпаў, якіх ён стварае».

В. ПЯТРОЎ.

Над белай буркай чорную папаху
І вашу кроў чырвоную на іх.

Знясіленых бяссоннымі баямі,
Валіў вас сон, як дрэвы, на адхон,
Вам справядлівасць снілася, над вамі
Яна лунала, лёгкая, як сон.

І, скошаныя куляй ліхадзея
Тады альбо ў пазнейшыя гады,
Вы паміралі, каб жыла ідэя,
Што вамі авалодала тады.

Ёй не здраджалі вы ў свой час крывавы,
Не беглі прэч, а страх свой гналі прэч,
Калі пад маскай справядлівай справы
Несправядлівасць агаляла меч.

Не, вы не з тых, што не баяцца смерці
Тады, калі за стол садзяцца піць,
Ды не!.. Вы — храбрацы, якім памерці
Лягчэй за справу, чым аб ёй трубіць.

Сатлелі вашы буркі, што гарэлі
Не раз, што моклі пад дажджом не раз,
Ды прыклад ваш і справа не сатлелі,
Яны дагэтуль акрыляюць нас.

Мы з вамі доляй звязаны адною,
І чую я, насуперак гадам,
Як сам Ільіч махае вам рукою
І кліча ў бой: «Я, горцы, веру вам!»

Пераклаў Аркадзь КУЛЯШОЎ.

Геворг ЭМІН

(Арменія)

●

Я так люблю цябе,
мая Арменія, —
Лунанне птахаў,
песні на палях,
Твае дарогі і шляхі каменныя,
Дзе пахне вечнасцю сама зямля.
Люблю твае таполі каля домікаў.
Аднасяльчан
на ранішняй касьбе.
Люблю я горы,
як фрагменты помніка,
Радзіма-маці,
помніка табе!
Люблю я ночы зімнія,
вясеннія,
Жыццё люблю —
душою не крыўлю.
Калі ж захочуць адабраць Арменію,
Дык смерць
ў імя жыцця
я палюблю!

Пераклаў Мікола АЎРАМЧЫК.

Фазу АЛІЕВА

(Дагестан)

Паклон Беларусі

Асаламалейкум, Беларусь!
Гэтым словам мы сяброў вітаем,
з ім заўжды гасцінны свой абрус
шчыра і шырока рассцілаем.

Гэта слова — мір тваім лясам,
неабсяжным аксамітным гоням,
чыстым, звонкарэхім галасам,
што са мной так радасна гамоняць.

Нашай дружбай змалку даражу,
бо ў яднанні — вечная крыніца
песень, што сягоння напішу,
і дзяржаўных велічных адкрыццяў.

Я жадаю ад усёй душы,
каб у кожным доме ў Беларусі
кожны чалавек у шчасці жыў,
а не гнуўся, як калісь, у скрусе.

Тваім нівам — сонца і вады,
гэтулькі, каб шчодра красавалі,
каб у маладых садах плады
золатам крамяным адлівалі.

Мір вам, цесляры, будаўнікі!
Вашы рукі у нястомнай працы
аднавілі гераічны Мінск —
колькі ўсюды гмахаў і палацаў!

Вам паклон, байцы-франтавікі,
слаўныя салдаты-партызаны,
што вадзілі на прарыў палкі
з краю ў край, агнём аперазаны.

Беларусь, прашу ізноў цябе
дараваць мне: як была навала, —
у тваёй свяшчэннай барацьбе
я табе нічым не памагала.

Па праспекце крочу... Вось якраз
каля школы акцябрат спаткала.
...Я тады хадзіла ў першы клас,
пра народ твой знала вельмі мала.

Асаламалейкум, Беларусь!
Як я рада сёння, дарагая,
што з табой адкрыта гавару,
што бальзам твой баравы ўдыхаю...

Пераклаў Мікола ФЕДЗЮКОВІЧ.

З ПОШТЫ „ЛІМ"а

Прыязджайце, калі ласка!

Летам гэтага года ў Саратаўскай філармоніі і ў тэатры аперэты г. Энгельса прайшлі гастролі вядомага беларускага фальклорна-харэаграфічнага ансамбля «Харошкі», сёлетняга лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола.

Ад слова «Харошкі» павявае нечым добрым, уяўленне малюе ветлых дзяўчат... Ім усім ад дваццаці да трыццаці. Самаму старэйшаму — заслужанаму артысту Беларускай ССР Фёдару Балабайку — трыццаць тры. Танцуюць захоплена, радасна, адчуваецца добрая прафесійная падрыхтаванасць.

Прыемна было сустрэцца з ансамблем, мастацтва якога жывіцца фальклорам Мінскай, Брэсцкай, Магілёўскай, Гомельскай абласцей. Зберагаючы народныя традыцыі, калектыў пад кіраўніцтвам заслужанай артысткі БССР Валянціны Гаявой узбагачае танцы сучаснымі рытмамі. Адроджаны старажытныя народныя інструменты — ліры, жалейкі, цытры, дудачкі, гудкі, басэтлі, цымбалы. Да іх падключаюцца скрыпка, баян, гармонік, флейта, а таксама басгітара, ударныя і электраарган (у розных спалучэннях).

Інструментальная група ў цэлым гучыць выдатна. Віртуозная ігра музыкантаў на цымбалах, дудцы, флейце, баянах. Інструментальныя нумары цікава абыгрываюцца сцэнічна. Арганічнае суладдзе «Харошак» з вядомым жаночым вакальным квартэтам «Купалінка».

Хочацца адзначыць, што ўсе танцы пабудаваны на простых рухах. А дзякуючы цэласнай выразнасці вобраза, непасрэднасці мімікі і сінхроннасці выканання, рэжысёрскай выдумцы ствараецца непаўторны малюнак свята беларускага народа. І неўтаймоўная, іскрыстая весялосць захоплівае гледача. Выдатна кантрастуе віртуозная полька «Крутуха» з лірычнай «Каханачкай», а зухаватая «Весялуха» з пяшчотнай «Перапёлачкай», агністая «Лявоніха» са старадаўняй чапурыстай «Кадрыляй». А як захапляе іграВая мініяцюра «Гусарыкі» (восем дзевак, адзін я) з удзелам Ф. Балабайкі!. Усё шчыра, эмацыянальна і цнатліва.

Трэба аддаць належнае беларускім мастакам і майстрам пашыву: для кожнага танца створаны свой маляўнічы нацыянальны ўбор. Гэта таксама спрыяе таму, што інструментальныя, вакальныя і танцавальныя нумары ўспрымаюцца як цэласнае, запамінальнае прадстаўленне.

Мы зычым артыстам з братняй Беларусі добрага здароўя і новых творчых дасягненняў у прапагандзе беларускага мастацтва ў адзінай сям'і савецкіх рэспублік.

Прыязджайце, сябры, чакаем!

Кіра ПАЛУБІНСКАЯ,
старшыня Савета музычнага клуба Палаца культуры «Рубін», ветэран працы.

г. Саратаў.

У СЯМ'І АДЗІНАЙ

Хамід ГУЛЯМ,
народны пісьменнік Узбекістана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

«З НАМІ СЯБРЫ ДАРАГІЯ...»

На ўсё жыццё запомніў той першы штуршок... Гэта было акурат у пяць гадзін дваццаць тры мінуты 26 кастрычніка 1966 года... Напярэдадні я праводзіў беларускіх пісьменнікаў — удзельнікаў Дэкады беларускай літаратуры і мастацтва ва Узбекістане — у гасцініцу «Ташкент» і пешкі вяртаўся дадому. Ноч была цудоўная. Красавік — лепшая пара года на поўдні. Неба было нібы кашмірскі блакітны аксаміт, усыпаны алмазамі. П'яніў водар квітнеючых акацый, цурчала вада ў арыках. Уражанні ад сустрэч, гутарак з беларускімі сябрамі перапаўнялі маё сэрца. Я крочыў па праспекце Наваі і мне хацелася спяваць.

Дома мяне чакала жонка, якая вярнулася з літаратурнага вечара раней за мяне. Мы доўга абменьваліся ўражаннямі, так што леглі спаць недзе а чацвёртай гадзіне раніцы.

Не помню, колькі я спаў, але помню, як ускочыў ад страшэннага выбуху. Наш дом знаходзіўся недалёка ад эпіцэнтра землетрасення, і мы змаглі адчуць усю моц васьмібальнага штуршка. Мне падалося, што нейкая невядомая сіла ўзняла наш дом і кінула яго на зямлю. Пачуў я моцны гул, убачыў яркія ўспышкі на блакітным шкле акон.

Не помню, як я апынуўся ў суседнім пакоі, дзе спала дачка, узяў яе на рукі і выбег на двор. Тужліва вылі сабакі, і я здзівіўся, як многа сабак у нашым квартале. Выйшаў на вуліцу. Уся плошча ад рэчкі да нашага дома была запоўнена людзьмі. Яны абмяркоўвалі падзею, якая толькі што адбылася.

Мне не было калі слухаць іх, я думаў пра беларускіх гасцей, якіх пакінуў у гасцініцы. Мы з сынам вывелі машыну з гаража і паехалі да іх.

Вялізная плошча паміж гасцініцай «Ташкент» і тэатрам імя Наваі была запоўнена народам. Сярод іх я лёгка знайшоў беларусаў, якія, акружыўшы Петруся Броўку, таксама абмяркоўвалі здарэнне.

Цяпер, праз гады, успамінаю радкі з верша Броўкі «Ташкент — ты ў сэрцы»:

Помню, як той раніцой
з нашай сябрынаю блізкай
Мы па Ташкенту ідзём,
быццам па роднаму Мінску.
Шмат дзе, панікшы, ляжаць
друзам старыя хаціны,
У Мінску з другое бяды
мы адчувалі руіны.
Даўна, у часе вайны,
бомбы ўзарвалі нам цішу...
Ты дапамог нам, Ташкент,
нашых сірот прытуліўшы.
Бачым, хаціны твае сёння ашчэрылі
раны,
Хоць па-ранейшаму скрозь
чырванню ззяюць цюльпаны.
Дзесьці разбураны дах —
неба ж спакойнае свеціць...
Бачым, і ў парках вакол
скачуць вясёлыя дзеці.
Горад! Бядоту тваю, быццам сваю,
адчуваю.
Шмат жа братоў у цябе, бачыш, Айчына
якая?
Хіба адолеюць нас беды, няшчасці ліхія...
Мы па Ташкенту ідзём.
З намі сябры дарагія.

На той дзень была запланавана гутарка за «круглым сталом» аб праблемах развіцця шматнацыянальнай савецкай літаратуры. Гутарка павінна была адбыцца ў Доме літаратараў імя Хаміда Алімджана, на рагу вуліц Леніна і Брацкай, у былым будынку Гарадскога савета.

Перад намі стаяла дылема: праводзіць гутарку там, дзе прызначана, ці перанесці? А раптам зноў затрасе? Але мы ўсё ж вырашылі праводзіць нашу гутарку. І правялі. І страсянула. Але ніхто не ўстаў са свайго месца.

Праз некалькі гадзін пасля першага штуршка, днём 27 красавіка, у Ташкент прыехалі Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў і старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін. А на наступны дзень, 28 красавіка 1966 года, адбыўся сход партыйнага актыву Узбекістана, на якім з прамовай выступіў Л. І. Брэжнеў. Я помню яго цудоўныя словы: «Вы ведаеце, што цэлы шэраг саюзных рэспублік і абласцей краіны ўжо выказалі сваю гатоўнасць аказаць падтрымку Ташкенту. Гэтаму імкненню савецкіх людзей дапамагчы вам будзе нададзена арганізаваная форма. І мы ўпэўнены, што Масква, Ленінград, Расійская Федэрацыя, Украіна, Беларусь, усе вашы суседзі, усе рэспублікі возьмуць на сябе абавязацельства пабудаваць вам не толькі асобныя дамы, але і цэлыя кварталы.

Мы лічым, што іх дапамога, дапамога ўрада будзе асноўнай і вырашальнай сілай, якая дазволіць не толькі аднавіць разбуранае жыллё, але і змяніць аблічча горада. Вобразна кажучы, гэта пачатак новага Ташкента, прыгажэйшага, мацнейшага — такога, якому ніякія землетрасенні не будуць страшныя.

Гэта, таварышы, галоўны накірунак».

І сапраўды, ужо ў тыя дні сталі прыязджаць будаўнікі з розных гарадоў нашай краіны, з усіх саюзных рэспублік прыбывалі эшалоны з машынамі, механізмамі, будматэрыяламі.

У тыя дні ў «Комсомольской правде» была надрукавана паэма Андрэя Вазнясенскага «Памажыце Ташкенту!». Вазнясенскі сам прыехаў у Ташкент. Ён не тэлеграфаваў, не прасіў сустрэць, а прыехаў у горад, дзе здарылася няшчасце, дзе патрэбна дапамога і каменшчыкаў, і мантажнікаў, і мастакоў, і паэтаў. Яго паэма прагучала не як жалобны крык роспачнай душы, а як горды набат, як усечалавечы заклік, як заклік да гатоўнасці нумар адзін.

Пра будаўніцтва новага Ташкента, пра яго цудоўную будучыню думалі ўсе, над гэтым працавалі масквічы і ленінградцы, кіяўляне і мінчане, алма-ацінцы і бакінцы, будаўнікі і архітэктары ўсіх рэспублік краіны. Ужо да восені 1966 года амаль усе жыхары горада былі забяспечаны жыллём. За тры гады краіна пабудавала Ташкенту больш за адзін мільён дзвесце тысяч квадратных метраў жылля, шмат аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння. Будаўнікі ўзвялі горад-спадарожнік Сергелі з жылой плошчай 150 тысяч квадратных метраў.

Вось што такое братняя дружба народаў і яе ажыццяўленне.

Прыязджайце да нас у Ташкент і палюбуйцеся яго сённяшнім непаўторным абліччам! Пахадзіце па маскоўскіх, украінскіх, беларускіх кварталах, па праспектах Наваі і Сафійскім, Шата Руставелі і Дружбы! Палюбуйцеся цудоўнымі станцыямі метрапалітэна і абавязкова пабудзьце ў «эпіцэнтры» землетрасення, на праспекце Леніна, дзе цяпер узведзены велічны манумент Дружбы.

Гэта новы Ташкент. Гэта горад дружбы і братэрства. Гэта паўднёвыя вароты Усходу. Цудоўная, непаўторная, самабытная, шматнацыянальная, квітнеючая сталіца Узбекскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

ПРОЗА

Віктар ГАРДЗЕЙ

Дзімка з Малога Сяла

АПАВЯДАННЕ

У Малым Сяле, дзе ў крайняй хаце ад лесу жыве Дзімка, няма рэчкі. Укруга вёскі цягнуцца засмужаныя сухадолы, гразкія балотцы і камяністыя пагоркі. На сухадолах грыўкамі стаіць бярэзнік, за гразкія імшэчкі і ператочыны ўчэпіста трымаецца шэры алешнік, а на пясчаных выдмах, апрача сіўцу, лебяды і конскага шчаўя, нічога болей не расце.

Напэўна, сотні гадоў жывуць тут людзі — выкошваюць у лагчынах марную траву, пасуць на няўдобіцы статак, але ім, здаецца, і гора мала, што ў Малым Сяле няма рэчкі. А хлопцам нельга без вады. Няма рэчкі, і няма вясёлых забаў, няма разгону, а ў самую спёку хоць і праўда ў ночвах купайся. Сорамна прызнацца, але Дзімка рачнога шчупака толькі на малюнку бачыў.

Прырода моцна, бессардэчна пакрыўдзіла маласельцаў. Як быццам у насмешку, яна прыстаралася для іх нешырокую, звілістую канаву, што паціху струменіцца паўз Дзімкаву хату, цячэ далей цераз балоцісты поплаў і губляецца ў змрочным алешніку. Дзесьці там, далёка яна ўпадае ў Цну. Несправядліва ўсё ж: каму Цна, а каму — гэтая мізэрная канава, у якой вада заўсёды пратухлая, іржавая, з каляровымі скалкамі.

Дзімка сумаваў па рэчцы, зайздросціў дзецям, якія нарадзіліся каля вялікай вады. Там і рыбы поўна, і купайся, колькі хочаш. Там акуні і плоткі, а тут лупатыя жабы і чорныя пляскатыя жукі. Вось бы ўзяць экскаватар і прачысціць канаву, паглыбіць дно, выраўняць аерыстыя берагі. І дзіўна, што знайшоўся чалавек, які быццам падслухаў Дзімкавы жаданні. Аднойчы Дзімка ўбачыў непадалёк ад сваёй хаты самы сапраўдны экскаватар. Рыпелі на лябёдках тоўстыя тросы, пакручвалася страла, зубасты коўш разпораз падаў у канаву і выплёхваў на бераг рыжую балотную твань.

— Дзядзька, што вы тут капаеце? — спытаў Дзімка ў экскаватаршчыка, калі той на момант вылез з кабіны. — Рэчку?

— Якую табе рэчку? — здзівіўся дзядзька. — Чорнае мора капаю! Чуў пра такое?

— Чуў.

— Дык ідзі і не перашкаджай мне.

Дзімка не пакрыўдзіўся, бо і крыўдзіцца не было за што.

Чалавекам, які так дарэчы падслухаў Дзімкавы жаданні, аказаўся калгасны старшыня Фянота. І хоць ён, як высветлілася, зусім не думаў унаравіць хлапчукам, а болей клапаціўся, што ў спёку няма дзе паіць жывёлу, Дзімка быў удзячны яму. Надвячоркам экскаватар перабраўся ў другое месца, за чэзлы алешнік, пакінуўшы на ўспамін аб сабе кучу торфу і немалую прадаўгаватую сажалку. Выкапаць Чорнае мора ў мурзатага экскаватаршчыка, відаць, не хапіла духу і цярпення. Але і без таго мора Дзімка прыйшоў у захапленне: гэта ж столькі вады! Ужо і па рэчцы можна не сумаваць, і канаву не трэба глыбіць.

Зімой, калі падмерзне балацявіна, кучу рыжага торфу перавязуць на ферму, а з вясны бераг сажалкі пачне зарастаць аерам, брацца чаротам і рагозам. Нехта і назву прыдумаў — Фянотава сажалка. Адно толькі кепска: купацца ў ёй нельга. Паспрабавалі хлопцы сунуцца — з дна ўсплыў патрывожаны торф, вада ўскаламуцілася, стала, што дзёгаць. Вылезлі на бераг чорныя, як чэрці. Але непадалёк, за шэрым алешнікам, была яшчэ адна Фянотава сажалка. І хлопцы пабеглі туды, і там, на дзіва, дно аказалася глеістае, вада не чарнела і не рабіла Дзімкавых сяброў падобнымі на тых мурзатых стварэнняў з пекла. Першая сажалка была назаўсёды забыта, і адзіным гаспадаром тут застаўся Дзімка. Цяпер ён ужо нікому не зайздросціў.

Бераг Фянотавай сажалкі пакрысе травяněў, зарастаў аерам, асакой і рагозам. На грудку, далей ад вады, пачалі прабівацца ружовыя пруткі вербалозу. Сажалка зарастала, а Дзімка сталеў, пайшоў у школу, і калі скончыў трэці клас, ужо нельга было нават здагадацца, што такую прыгажосць выкапаў экскаватар. У траве пабліскавала люстэркам гожае невялічкае азярцо. Вада, добра адстаяўшыся за колькі гадоў, зіхацела на сонцы, рассыпалася залатымі іскаркамі. Над сажалкай пырхалі матылькі, паволі кружыліся сінія стракозы.

Калі Дзімку было сумна, ён прыбягаў на сажалку і падоўгу сядзеў тут у адзіноце. Глядзеў, як над вадой кружацца сінія стракозы, і думаў, што яны вельмі ж падобныя на маленькія верталёцікі. Іншы раз Дзімка рабіў папяровыя караблікі і пускаў іх па вадзе. Падхопленыя ветрыкам, яны пагойдваліся на хвалях і ўпарта плылі насустрач небяспецы. Пасярод сажалкі іх чакалі буры і штормы, жахалі маланкі і грымеў гром, але белыя каравелы ўдала прыставалі да незнаёмага берага. А яшчэ Дзімка любіў шпурляць па вадзе дробныя каменьчыкі. Не проста кінуць, а каб той каменьчык праляцеў, як ластаўка, і некалькі разоў падскочыў, пакуль уткнецца ў траву з другога боку сажалкі. Дзімка ведае сакрэт: трэба выбіраць пляскатыя каменьчыкі-пліткі, а пляскачыкі могуць адбіцца ад люстра вады і пяць, і шэсць разоў.

Але бывалі дні, калі Дзімка, захапіўшыся гульнямі, не прыходзіў на сажалку. І тады Фянотава сажалка сумавала, крыўдзілася, што пра яе забылі. На самоце, у цішыні ёй пачыналі ўжо дакучаць камары і мошкі, матылькі і сінія стракозы. Сажалка хмурылася, цямнела і пускала па вадзе слабыя кругі. Над лесам садзілася сонца, змрок гусцеў, а кругоў рабілася больш і больш. Яны нечакана ўзнікалі то пасярэдзіне сажалкі, то каля берага. Часам чуўся булькат, ціхі ўсплёск. Сажалка сумавала, нервавалася без Дзімкі. І ён прыбег і ўбачыў на вадзе мноства кругоў, пачуў ціхі ўсплёск. Здагадка ашаламіла: у Фянотавай сажалцы завялася рыба!

Увесну, калі віхлястая канава разліваецца, рыба магла прыплысці з Цны. Рыбу маглі таксама занесці птушкі, бо Дзімка сам бачыў каля сажалкі дзікіх качак. Да пер'я прыліпліваюцца рыбіныя ікрынкі, і качкі пераносяць іх з аднаго месца ў другое. Чыстая вада не можа быць без рыбы. Але смешна, што рыба завялася ў Малым Сяле, дзе яе зроду не было. Дзякуй вам, добрыя дзікія качкі!

Фянотава сажалка, калі меркаваць па кругах на вадзе, ажно трашчала ад рыбы. Сажалка стамілася гадаваць дураслівых карасёў і вельмі хацела падзяліцца з Дзімкам сваім багаццем. Але Дзімка глядзеў, як надвячоркам або перад навальніцай дурэе рыба, і нічога не мог зрабіць. У яго не было рыбацкай снасці, хоць жаданне злавіць жывую рыбку ўсё большала. Дзімка ажно пахудзеў. На шчасце, у нядзелю бацька сабраўся ў Ганцавічы. Ён пасмяяўся з дзіўнай сынавай просьбы, але ўсё ж прывёз добры канец зялёнай жылкі і некалькі сапраўдных рыбацкіх кручкоў. У той жа дзень Дзімка пабег у ляшчыннік, выразаў гнуткіх дубцоў на вудзільны, змайстраваў вудачку, накапаў чарвякоў і за вячэрай папрасіў:

— Мама, ты мяне заўтра збудзіш рана. Як будзеш карову на пашу выганяць, добра?

— Гэта ж чаму, сынок?

— Рыбу пайду лавіць у Фянотавай сажалцы.

— А жабу ты не зловіш?

— Ну, сказала! Карасёў прынясу.

— Ясь, ты чуеш? Дзімка заўтра карасёў прынясе.

— А смятана ў нас е? — весела папытаў бацька.— Кажуць, карасі ў смятане вельмі смачныя.

— Е, е! Я і снядання не буду рабіць. Свежай рыбкі паямо.

Раніцай выйшаў Дзімка за весніцы, а старыя вязы, што растуць каля хаты, зашумелі, галінкамі калыхнулі. Дзівяцца вязы, дзівіцца поплаў: і куды гэта бяжыць па расе заспаны пастушок з такім доўгім дубцом і маленькім вядзерцам у руках? А тут яшчэ і сусед, несусветны зайздроснік Змітрок Цыган, сустрэўся на поплаве. Ён худы і доўгі, як цыб. На плячы Змітрок нёс касу. Убачыў у Дзімкі вуду і — вочы на лоб.

— Куды, малеча, бяжыш? Няўжэ дзе рыба завялася?

— У Фянотавай сажалцы, — прызнаўся нехаця Дзімка. — Праўда, я не рыбу, а толькі кругі на вадзе бачыў.

Бліскучая каса адразу спаўзла з плячэй.

— Хто б падумаў, што ў гэтай лужыне рыба е? Ну, лаві, лаві. Блізка касіць буду, то пагляджу...

Змітрок, абіваючы гумовымі ботамі расу, мінуў сажалку і пайшоў далей. Бліжэй да лесу на поплаве вырасла ніштаватая трава. Там ужо свішчуць, пабліскваючы на сонцы, дзве касы. Змітрок далучыўся да грамады. А Дзімка застаўся на беразе сажалкі. Разматаў вуду, пачапіў на кручок прынаду. Ой, і холадна, мусіць, будзе чарвяку ў стылай ранішняй вадзе!

Пасярэдзіне сажалкі разышоўся шырокі круг. Дзімка яшчэ не ўмее закідваць вудачку, каб не патрывожыць ваду. Каля берага, у аеры, нешта плёхнула. Над лесам вышэй паднялося сонца. Дзімка сядзіць і не дыхае, бо рыба не любіць шуму. Адчуўшы Дзімкава хваляванне, нават сажалка прыціхла. Паплавок, зроблены з гусінага пяра, не варухнецца, не дрогне. Дзімка не зводзіць вачэй з белага пяра. Паплавок падскочыў, прыўзняўся, зноў лёг плазам. Прайшла яшчэ секунда, і раптам пяро калыхнулася, стала старчма і схавалася ў вадзе. Дзімка, не помнячы сябе, ірвануў вудзільна ўверх, і над сажалкай, апісаўшы дугу, бліснула серабрыстая маланка.

Жывы кавалачак срэбра трапятаўся ўжо на беразе, у густой траве. Дзімку хацелася скакаць ад вялікай радасці, крычаць на ўсю ваколіцу. Малое Сяло павінна ведаць, які ў ім жыве шчаслівы чалавек! Дзімка кінуў вудачку, выхапіў з травы бліскучую маленькую рыбку. Яшчэ нямала клопату каштавала, каб, не ўмеючы, зняць карася з кручка. Але і тады, калі шустры карасік апынуўся ў вядзерцы з вадою, шчаслівы чалавек адчуваў, як у грудзях шалёна тахкае сэрца.

І зноў гусінае пяро плазам ляжыць на вадзе. Дзімка то зірне на сажалку, то залюбуецца карасікам, які, супакоіўшыся, плавае на дне вядзерца. А ўжо блізка свішчуць косы, чуюцца людскія галасы, карацейшымі становяцца цені. Дзімка хмурыцца. Хіба ж не ведаюць балбатлівыя касцы, што іх галасы палохаюць рыбу? І дзядзькі быццам зразумелі, што ім нельга шумець. Уторкнуўшы косы ў купіны, яны кіруюцца сюды. Першым шыбуе Змітрок Цыган — абяцаў жа паглядзець на Дзімкаву рыбалку; за Змітраком, выціраючы потны лоб, ідзе Дзям'ян Ломскі; за Дзям'янам ледзь не подбегам коціцца круглы, што кацёлка, Хведар Заяц. За іх спінамі адпачываюць на прыгрэве бліскучыя косы і аж да самага лесу плывуць тры зялёныя пракосы.

— Няўжо і праўда злавіў? — дзівіцца Змітрок. — Каб не ўгледзеў на свае вочы, то не паверыў бы.

— Але, ладная плотка, — хваліць Дзімкаў улоў лахматы Дзям'ян. — Акурат паўфунта заважыць.

— То якая ж плотка, калі падлешчык, — смяецца таўсматы Хведар.

— І не плотка, і не падлешчык, — смяецца ўжо і Дзімка. — Карась гэта!

— А што ж яшчэ? Карась! — запэўнівае Змітрок і бярэ карася ў рукі. — Рыбакі мне называецца!

— Адна трасца — ці плотка, ці карась.

Дзядзькі закурылі, пусцілі ў неба сіні дым, селі на траву. Лаві, Дзімка, пацеш старых дзівакоў! Хвалюецца рыбак, не зводзіць вачэй з гусінага пяра. І Фянотава сажалка зразумела, адчула Дзімкава хваляванне. Невядома, чым яна там падмагла, але неўзабаве пяро ўздрыгнула, зноў стала старчма і паехала ў ваду.

— Цягні, Дзімка! — падхапіўся з травы Змітрок. — Цягні, бо сарвецца, акаянец!

Дзімка пацягнуў, і над галовамі касцоў бліснула яшчэ адна серабрыстая маланка. Другі карась улавіўся намнога большы, чым першы. Ён мацней трапятаў у траве, выпручваўся, латашыў хвастом. Дзімка ўжо спраўней зняў рыбіну з кручка, і карась, быццам які заморскі цуд, пайшоў па руках.

— Дальбо, цэлы фунт.

— Вышэй бяры. Паўкіло яму сама меней.

— Яшчэ б адзін такі, і добрае смажэнне выйдзе.

Змітрок шпурляну у аер недакурак і стаяў над вядзерцам нейкі дзіўны, збянтэжаны, у вачах чыталася зайздрасць, і па гэтым было відаць, што ў яго галаве круціліся неразумныя думкі. Дзімка сцяўся, адчуўшы нядобрае.

— Аднак тут гэтых карасёў да халеры,— сказаў Змітрок і пачухаў патыліцу. — Не шкодзіла б і сабе нацёгаць.

— А чым ты яе лавіць будзеш? — спытаў Дзям'ян. — Лапцем хіба?

— Можна нешта прыдумаць. У мяне дома кош е. Два пуды картоплі лезе. А што, калі — кашом?..

Змітрок паглядзеў на мужчын, чакаючы адабрэння.

— Кош, канечне, не сак, але чаму ж — паспрабаваць трэба.

— То нясі свой кош.

— Я хуценька. Адна мінута...

Над Фянотавай сажалкай навіслі чорныя хмары. Дзімка збялеў, сумеўся, але перайначыць нічога не мог. Сажалка ўсё-такі не яго — калгасная, а Змітрок не такі чалавек, каб уважыць, паступіцца. На бяду і жыве ён зусім блізенька. Вунь ужо і назад бяжыць з велізарным кашом, у якім, бадай, схаваліся б два такія хлопцы, як Дзімка. Неспадзявана варухнуўся ветрык, пахіліў аер і рагоз. У вядры пляснуў хвастом карась, не разумеючы, што за зверская сіла выхапіла яго з вады.

Яшчэ на хаду Змітрок пачаў расшпільваць гузікі кашулі.

— Галоўнае, трэба ваду ўзбоўтаць, — павучаў ён дзядзькоў. — Дно тарфяное, дык хутка скаламуціцца. А тады яе — кашом, кашом! — Змітрок першы плюхнуўся ў сажалку і ўжо адтуль падбадзёрыў: — Смялей, мужыкі. Вада цёплая, як у лазні.

Таўсматы Хведар, застаўшыся ў чорных сацінавых трусах да калень, азірнуўся на Дзімку, весела падміргнуў:

— Ты вуду прымі! Яшчэ ўчэпіш за што...

— Не прымай, Дзімка, — зарагатаў Дзям'ян. — Будзе тапіцца, то выцягнеш.

— Хутчэй вы там, маруды!

Сажалка спалохалася вялізнага каша, сплеценага з дубовай дранкі. Вада завірыла, забулькала. На пясок адна за другой пабеглі цёмныя хвалі.

— Дзям'ян, ты ля берага тапчы, ля берага!

— А гразішчы тут!

— Гэта ж добра, што торфу багата. Хутчэй вада скаламуціцца.

Дзімкава вуда, непатрэбная цяпер, ляжыць у траве. З перавернутай бляшанкі распаўзаюцца чарвякі, шыюцца ў зямлю. На вачах у Дзімкі круцяцца слёзы. Яму балюча глядзець, як дзядзькі боўтаюцца ў вадзе. Пасля такога разбою Фянотава сажалка не будзе любіць Дзімку. Мог бы абмінуць Змітрака, не лезці ў вочы з гэтай сваёй вудачкай. Сажалка пачарнела, узбурылася. Зводдаль, уторкнутыя ў торф, сумна звесілі доўгія дзюбы тры касы. Яны саромеюцца Дзімкі. Ім трэба касіць траву, таму што хутка спадзе раса, трэба касіць, а не займацца глупствам.

— Змітрок, няма тут рыбы!

— А ў хлопцавым вядры што? Хвост сабачы?

— Выходзіць, і праўда е.

Змітрок увішна махае кашом. Апусціць з дужкай у сажалку, падвядзе да берага і выхапіць наверх. З дзірак ва ўсе бакі свішчуць тонкія струменьчыкі. Пуста. І зноў кош чэрпае ваду. Ёсць! У кашы штосьці бліснула, затрапятала.

— Злавіў! — нема зароў Змітрок. — Злавіў!

— Няўжэ злавіў?..

— Пакажы?..

У руцэ Змітрака выпручваецца, б'е хвастом фунтовы карась. Яму крыўдна, што яго злавілі. Карась варушыць ружовымі жабрамі, разяўляе рот, просіцца назад у сажалку. Але яго мовы, акрамя Дзімкі, ніхто не разумее. Карасік, пабываўшы ў шурпатых мужчынскіх далонях, ляціць на груд, у траву.

— Вы ля берагоў тапчыце! — крычыць на дзядзькоў чырвоны і мокры да вушэй Змітрок. — Не давайце, каб рыба ў аеры хавалася.

— Ды топчам жа, — бурчыць Дзям'ян. — Як можна лепш?

— Ні мінуткі не стаім, — пакрыўдзіўся Хведар.

Карасік прыдаў лаўцам настрою і азарту. З новай сілай закіпела, забурліла вада. Дубовы кош стаў зусім шчаслівы.

— Лінь! Глядзіце, лінь!

— Карась!

— Яшчэ лінь!

На вачах у Дзімкі слязінак няма. Круглымі гарошынкамі яны ўжо коцяцца па шчоках.

— Весялей, не драміце! — падбадзёрвае лаўцоў увішны Змітрок.

Дзям'ян і Хведар так не касілі, як апантана, без супачынку боўтаюць сажалку. Вада пачарнела, стала падобнай на смалу. Па ўсёй сажалцы лопаюцца бурбалкі. З тарфянога дна пухіркамі выходзіць балотны газ. У каламутнай вадзе не хапае кісларода, рыбе няма чым дыхаць. Як і думаў Змітрок, яна ашалела, ачмурэла ад балотнага газу. Карасі б'юць хвастамі, высоўваюцца з вады, шчэлепамі прагна хапаюць паветра. Рыбу цяпер можна лавіць голымі рукамі. І кош не дрэмле. На траве вакол сажалкі блішчаць ужо сапраўдныя карáлі з серабрыстых карасёў і лінёў. Віруе вада, драпежнічае дубовы кош.

— Хопіць на сёння! — сказаў, нарэшце, Змітрок і, мокры, заляпаны ў твань, вылез на бераг, кінуўшы ненасытны кош у рагоз. — Яшчэ калі парыбалім...

— Змёрз я, бы цюцік, — паскардзіўся Дзям'ян.

— Добра ўлавілі, — радуецца Хведар. — Будзем дзяліць.

Лаўцы абышлі ўкруга сажалку, падабралі з травы рыбу, знеслі ў адну кучу. Не саромеючыся Дзімкі, знялі мокрыя трусы, выкруцілі і, калі трохі падсушыліся на сонцы, адзеліся, селі дзяліць рыбу.

— Э-э, Змітрок! Не хітры, ты ўжо такога палажыў сабе.

— Падалося табе, Дзям'ян. Я правільна дзялю, паэснаму.

— А мне, Змітрок, вунь таго лінька. Акурат усім па два ліні выйдзе.

Рыбу падзялілі. Дзядзькі падняліся з травы, закурылі і тут апомніліся, што іх косы цэлую раніцу прастаялі без работы. Але касіць ужо нельга: высока падняўся сонца, раса высахла.

— Пойдзем дахаты, — сказаў Змітрок.

Сваіх карасёў ён высыпаў у кош. Хведар знізаў на вербалозавы дубчык. Сваю дзель Дзям'ян завязаў у кашулю. Вузел важка адчуўся ў руцэ. Улоў не абыякі, а значыць, і пахваліцца можна. Дзям'ян паварочваецца, шукае вачамі Дзімку і шчыра дзівіцца:

— Ты што, хлопец? Плачаш?

— Не-а, не плачу, — матнуў Дзімка бялявай галоўкай і строс са шчок дзве слязінкі.

Дзям'ян збянтэжыўся, спахмурнеў, бо адразу здагадаўся, чаго плача Дзімка.

— Была б прычына раўсці. Ну, пабоўталіся трохі, адвялі душу. А ты — і ў слёзы. Не румзай, я табе сваёй рыбы дам.

Дзям'ян развязаў кашулю, укінуў у Дзімкава вядро колькі асалавелых карасікаў.

— Дзімка, ад мяне таксама вазьмі, — сашморгнуў з вязанкі дзве рыбіны таўсматы Хведар. — І ты, Цыган, дай!

— За што яму рыбу? Не памагаў, — паціснуў плячамі Змітрок. — Бачыш, расплакаўся! Бытта мы ўсю рыбу палавілі? Засталося яшчэ і рыбаку такому...

Пабраўшы косы, дзядзькі пайшлі. Зашоргала трава пад нагамі, паныла звесіліся з плячэй доўгія косы. Спалохаецца Малое Сяло: пайшлі касіць, а нясуць што?

На выхадзе з поплава Дзям'ян азірнуўся. Каля сажалкі нерухома, задумліва стаяў Дзімка.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

Алене Васілевіч ~ 60

22 снежня вядомай пісьменніцы лаўрэату Дзяржаўнай прэміі БССР Алене Васілевіч споўнілася 60 гадоў. З гэтай нагоды праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала ёй віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагая

Алена Сямёнаўна!

Горача, ад усяе душы вітаем Вас, таленавітую пісьменніцу, заслужанага работніка культуры Беларускай ССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР, са слаўным юбілеем — 60-годдзем з дня нараджэння.

Вы здавалі апошні экзамен на дыплом настаўніка ў Рагачоўскім педагагічным інстытуце, як пачалася Вялікая Айчынная вайна. Эвакуіраваўшыся ў Чкалаўскую вобласць, Вы працавалі ў культэт Беларускага калгасе «16 партз'езд», потым бібліятэкарам у шпіталі, пісарам страявой часці, начальнікам бібліятэкі.

У 1946 годзе Вы скончылі філалагічны факультэт дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Важныя вехі Вашай біяграфіі — літаратурны кансультант у Курскім абласным выдавецтве, а пасля пераезду ў Мінск — загадчык аддзела культуры часопіса «Работніца і сялянка», загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Мастацкая літаратура».

Вы належыце да таго пакалення пісьменнікаў, якое прыйшло ў літаратуру адразу пасля вайны, прынесла з сабой немалы жыццёвы вопыт, новыя тэмы.

Аб гэтым пасведчыла першая Ваша аповесць «У прасторах жыцця», надрукаваная ў 1947 годзе. У наступнай аповесці «Шляхі-дарогі» Вы здолелі праўдзіва раскрыць характары савецкіх людзей, што аддавалі ўсе сілы і намаганні па аднаўленні разбуранай фашысцкай акупацыяй калгаснай гаспадаркі.

З цікавасцю сустрэлі чытачы Вашы кнігі «Блізкія знаёмыя», «Падслухала сэрца», «Я з вамі», «Пісар страявой часці», «Адно імгненне», «Мыс Добрай Надзеі» і іншыя.

Значнай па шырыні ахопу жыцця, багаццю праблематыкі стала Ваша тэтралогія «Пачакай, затрымайся...», у якую ўвайшлі аповесці «Расці, Ганька», «Доля цябе знойдзе», «Новы свет», «Пачакай, затрымайся...». Гэты твор у 1976 годзе быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР у галіне літаратуры для дзяцей і юнацтва. У тэтралогіі Вы праз яркія запамінальныя малюнкі і эпізоды прасачылі лёс беларускай дзяўчынкі Ганькі, паказалі, як пад уздзеяннем сацыялістычнай рэчаіснасці фарміруецца чалавек, яго моцная жыццёвая пазіцыя, самаадданасць і бескампраміснасць у адстойванні светлых ідэалаў жыцця.

Вы падарылі юным чытачам шэраг праўдзівых і таленавітых зборнікаў апавяданняў — «Заўтра ў школу», «Сябры», «Апавяданні», «Калінавая рукавічка» і іншыя.

Актыўна Вы працуеце ў галіне мастацкага перакладу, публіцыстыкі.

Шырокая Ваша грамадская дзейнасць: Вы з'яўляецеся членам праўлення СП БССР, членам савета па дзіцячай літаратуры СП СССР, членам рэдкалегіі часопіса «Работніца і сялянка».

У сучасны момант у выдавецтве «Юнацтва» Вы загадваеце рэдакцыяй, якая выпускае кнігі для моладзі. Мы ведаем, як спагадліва і разам з тым патрабавальна Вы адносіцеся да твораў, якія Вам даводзіцца прымаць да друку і рэдагаваць.

Жадаем Вам, дарагая Алена Сямёнаўна, новых творчых удач, здароўя, шчасця».

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання і зычыць сваёй даўняй аўтарцы новых творчых поспехаў.

Вышыня, узнятая працай

Алена Васілевіч... Знаёмае, сімпатычнае ўсім нам яе аблічча сёння пазірае на нас з таго пачэснага кута, на які наш любы «ЛіМ» саджае заўсёды юбіляраў. Алена Сямёнаўна, як Вам тут? Кажаце, зазірнулі сюды толькі на хвілінку, каб пасвяціць нам сяброўскаю ўсмешкай, а самой пырснуць як мага далей — у светлы край, да сіняй бухты?..

Знаёма, знаёма нам гэта: хто ад іх не ўцякаў, ад гэтых юбілеяў!.. Уцякалі ў чарговы адпачынак, у падарожжы па Волзе, уцякалі нават у Амерыку, у Арганізацыю Аб'яднаных Нацый, і іх можна зразумець, гэтых «уцекачоў»: на рубяжах жыцця ёсць час падрахункаў, якія лепей рабіць без сяброўскай паблажлівасці, на адзіноце, перад суровым тварам свайго сумлення.

Але, з другога боку, што рабіць нам, усім тым, хто любіць гэтых «уцекачоў», хоча сказаць ім цёплае слова і самы зручны выпадак для гэтага — дзень іх нараджэння?

Дарагая Алена Сямёнаўна! У такі, як сёння, дзень, калі падсумоўваеш вынікі ўсяго зробленага, Вы, чалавек да сябе вельмі патрабавальны, павінны быць задаволены. Зроблена многа. І многае зроблена выдатна. Алену Васілевіч чытачы ведаюць, чытаюць, любяць. Цікава, што імя гэтае ўвайшло ў чытацкую свядомасць ужо на самым пачатку творчага шляху пісьменніцы, і я гэтаму — першы сведка.

У 1947 годзе, калі ў часопісе «Беларусь» была надрукавана аповесць «У прасторах жыцця», маладыя аўтары, што прыходзілі ў «Чырвоную змену», дзе я тады працавала, часцяком пыталіся ў мяне пасля гутаркі: «А вы, часам, не Алена Васілевіч?..» Самалюбства маё — пад аблокі: вунь за каго палічылі! І тут жа — вобземлю: не яна...

Інтэнсіўнасці жыцця Алены Сямёнаўны можна толькі падзівіцца, яе жыццялюбству — пазайздросціць. Дваццаць гадоў работы ў рэдакцыі часопіса «Работніца і сялянка», бясконцыя камандзіроўкі, а тут — двое дзяцей: абмый, дагледзь, накармі, з хвароб бясконцых бясконца выцягвай, і ўсё гэта з тою душэўнай аддачай, без якое нельга сабе ўявіць Алену Сямёнаўну... Дзівішся: а кніжкі ж калі яна пісала? Вунь іх — цэлая паліца! Дзе было ўзяць для гэтага часу, душы? Вось жа... Узяла недзе... Успамінаецца талстоўскае: «Сопрягать... Сопрягать... Сопрягать». Што гэтае найцяжэйшае спалучэнне Алене Сямёнаўне ўдалося, сведчыць Дзяржаўная прэмія БССР імя Якуба Коласа, прысвоеная ёй за тэтралогію «Пачакай, затрымайся...», а таксама дружныя, клапатлівыя яе дзеці.

Неяк на рэпрадукцыі карціны Сальвадора Далі, надрукаванай у адным нашым часопісе («Иностранной литературе», здаецца), сярод мноства незразумелых сімвалаў мяне ўразіў адзін, які «прачытаўся», прыкладна, так: сучасны Адам працягвае сучаснай Еве яблык, а яна стаіць, абыякава апусціўшы галаву, і між грудзей у яе — кніга...

Якая дэфармацыя саміх асноў жыцця, якое іх зрушэнне! І таму побач з мастацкім талентам і ўсімі іншымі талентамі, якімі надзяліла жанчыну прырода, я стаўлю яе талент быць проста жанчынаю ў тым высокім сэнсе, які надала гэтаму слову сусветная паэзія і які апошнім часам пачалі мала цаніць нават самі жанчыны. На жаль...

«Мае гады — маё багацце» — часта пяе нам сёння радыё. Добрая песня, справядлівыя словы, хоць, шчыра кажучы, як жа іншы раз хочацца, каб гэтага багацця было хоць крыху меней!..

Але, зірнуўшы на справу з другога боку, дык калі б гэтага багацця было меней, адкуль бы ўзялася такая дзівосная рэч, як Ваша, Алена Сямёнаўна, апавяданне «Зімовая дарога»? Не было ж яго ў тыя ранейшыя, тыя маладыя гады. Было іншае, таксама цікавае, цёпла сустрэтае і належным чынам ацэненае, а «Зімовай дарогі» не было: гады яшчэ не падрыхтавалі душу для такога глыбокага спасціжэння жыцця, не зрабілі яе бясстрашнай перад жыццёваю праўдай.

«Бацька, перамяніся...» — я ўспамінаю гэтыя словы, якія сказала дзеду Івану ў сне яго нябожчыца жонка, і ў мяне — мароз па спіне ад таго бяздоння, якое за імі, гэтымі словамі, адкрываецца. «Перамяніся...» — гэта яна дае яму чыстую сарочку. «Перамяніся...» — як бы заве яго... Не, словамі гэтага не скажаш, тут пачынае гаварыць падсвядомасць, у якой адвеку жыве тое, што ведае, што адчувае чалавек перад апошняй у жыцці «пераменай».

Апошнім часам у нашай крытыцы нямала гаворыцца пра так званы міфалагічны рэалізм, заснавальнікам якога лічыцца Габрыель Маркес. Сэнс гэтага тэрміну не зусім зразумелы, і адзін цікаўны інтэрв'юер звярнуўся за тлумачэннем да самога заснавальніка. Той адказаў прыкладна так: слова гэтае ён сустрэў у друку пасля таго, як напісаў раман «Сто гадоў адзіноты». Што яно азначае, ён сказаць не можа, а твор свой пісаў па апавяданнях сваёй бабулі, імкнучыся як мага дакладней перадаць усё тое, што яна яму расказвала пра падзеі ў Маконда, так і тое, як яна расказвала пра гэта.

У нас часам вельмі баяцца паралелей. Хачу супакоіць тых, хто баіцца: ніякай паралелі паміж двума зусім рознымі пісьменнікамі я не праводжу. Проста хачу звярнуць увагу на той плён, які прынесла дакрананне да некаторых бакоў светаўспрымання свайго народа і калумбійцу Габрыелю Маркесу, і беларусцы Алене Васілевіч.

Дарагая Алена Сямёнаўна! Ваша пісьменніцкая дарога ідзе не па раўніне, а ўгору. Вы дорыце чытачу не толькі цікавыя высокамастацкія творы, але і радуеце яго бліскучымі, дасціпнымі крытычнымі артыкуламі. Адным словам, пораху ў Вашай парахаўніцы яшчэ— дай божа! Добрага ж Вам здароўя, доўгіх працавітых гадоў жыцця! І — заўсёднага адчування ўзятае вышыні.

Вера ПАЛТАРАН.

СЛОВА ПРА СЯБРА

Спасціжэнне сутнасці руху

Памятаецца, некаторыя вершы зборніка «Круглая плошча» Анатоля Грачанікава мяне насцярожылі: «Чалавецтва наперад не на галерах едзе, чалавецтва ярмо скідае, Чалавецтва — расце!» («Світае...»). Або: «Як добра, што ёсць яшчэ гэта на свеце: дожджык сонечны ловяць дзеці...» («Як добра...»). Філасофская інтанацыя і адпаведная ёй рытміка верша здаваліся знаёмымі: яны былі заяўлены Анатолем Вярцінскім. У кнізе «Тры цішыні» складаныя з'явы рэчаіснасці часцей за ўсё спасцігаюцца ім з высокага, як бы прыўзнятага над зямлёй пункта. Зменлівы малюнак унізе, несумненна, страчвае ў жывых дэталях, становіцца як бы нерухомым, што і дае паэту магчымасць грунтоўнага асэнсавання ўзбуйненых планаў жыццёвай панарамы. Не выпадкова паэтычнае абагульненне ў А. Вярцінскага часта набывае завершанасць формулы: то гэта афарыстычны, вынашаны пачатак верша, то не менш афарыстычная яго канцоўка. І наўрад ці трэба даводзіць: якімі б рознымі ні былі першая і другая кнігі А. Вярцінскага, гэта філасофская «запаволенасць» яго паэтычнай манеры выразна акрэслілася ўжо ў першым зборніку «Песня пра хлеб». Між тым Анатоль Грачанікаў у першай сваёй кнізе заявіў пра сябе як паэт, для якога больш уласціва было «схапіць» дынаміку жыцця, для яго ўжо тады было характэрна тое, што я б назваў абвостраным пачуццём руху.

Разглядаючы паэзію А. Грачанікава, адчуваеш небяспеку спрошчвання самога паняцця— «рух», вывядзення на першы план яго пэўных вонкава-механічных праяў. Як вядома, паэт скончыў інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту, працаваў на чыгунцы, ды й першая кніга яго так і называлася — «Магістраль». І калі б гаворка ішла толькі пра гэты зборнік, то, сапраўды, у ім шмат дзе заўважаюцца найбольш «простыя» формы руху — механічнага чыгуначнага («...цягнік ляціць грымотнаю каметай, ён пералічыць кожны стык на зацяжным пад'ёме гэтым»), салдацкага («Я — салдат. На нагах маіх — боты трывалыя»), танцавальнага («У цэнтры — заядлы танцор. Імкліва, бурліва, гулліва дзяўчатам дае ён адпор»)... Лірычны герой успрымаецца тут часцей як радавы назіральнік руху; паэт больш канстатуе сваю прысутнасць на цяжкім перагоне пасляваеннага жыцця, чым ставіць перад сабой мэту спасцігнуць складаныя яго механізмы і ўнутраныя законы. Дарэчы, у сваё выбранае паэт не ўключыў як «Першы палёт», так і падобныя да яго вершы «Імкненне» і «Рух». Ужо ў такім стаўленні А. Грачанікава да сваёй ранейшай, скажам так, агульнафізічнай канцэпцыі руху («Закон найстаражытнейшы сусветны. Рух не спыніць. Яго не перайначыць») выразна прачытваецца сённяшняе творчае пасталенне паэта. Перакананацца ў гэтым можна і на многіх іншых прыкладах. Скажам, на «танцавальных» вершах «На вечары» з кнігі «Магістраль» і «Школа танцаў» з «Грыбной пары». Няцяжка заўважыць, што творчы рост паэта ішоў ад канстатацыі таго, што «бачыць кожны», ад паказу самой паверхні руху ў напрамку да стараннага мастацкага даследавання яго глыбіннай сутнасці. У першым вершы паэта задаволіў жартоўны каментарый да «танцавальнай» сітуацыі. Салдаты са сваім камандзірам прыйшлі ў клуб, і вось:

Танцоркі, як зоркі, палаюць,
На круг выклікаюць, аднак
За спіны сяброў адступаюць
Герої вучэбных атак.

А далей — цэнтр псіхалагічнага цяжару верша:

А выплыў бы кожны з ахвотай
Такім прыгажуням услед.
Прайшліся б салдацкія боты —
Як бубен грымеў бы паркет,
Разнеслі б музычныя хвалі
Чачоткі нябачны пункцір...
За гэта пасля ці пахваліць
Прысутны вось тут камандзір?

Нехта скажа: што ж, і такі няхітры верш мае права на існаванне. Безумоўна, мае, калі паэт не ставіць сабе мэты значна большай, калі яго задавальняе ўсяго толькі сутнасны мінімум, што выдзяляе тую альбо іншую з'яву з раду іншых з'яў па самай просценькай, хай сабе і апраўданай — жартоўнай, але перш за ўсё несур'ёзнай перадумове. Гэтага ніяк нельга сказаць пра другі верш — пра «Школу танцаў». Наколькі больш актыўным і, калі можна так сказаць, творча ініцыятыўным становіцца ў гэтым вершы аўтарскае «я» паэта!.. У ім узмужнелы талент даследуе, па-першае, непараўнальна больш маштабную жыццёвую сітуацыю, а па-другое, ён дабіраецца да самых яе вытокаў — псіхалагічных і сацыяльных. Калі ў вершы «На вечары» дастаткова было камандзіру загадаць салдатам танцаваць — і... верш не адбыўся б, дык у «Школе танцаў» гумар, іронія, сарказм А. Грачанікава маюць пад сабой намнога больш грунтоўную рэальную падставу. Паэт ужо не задавальняецца адным толькі даступным непасрэднаму назіранню малюнкам, за першым яго планам ідзе другі, «гістарычны» план («Думаеце, праца зрабіла яго (чалавека)? Зазначу рашуча: і скокі!»), затым наперад выступае маральны або, дакладней сказаць, амаральны змест «танца». Паэта не можа не хваляваць, што ў «час допінгу, стрэсу і войнаў лакальных, час боегаловак міжкантынентальных» у некім бярэ верх замешаны на фаталістычных настроях цынізм:

Не глядзі, настаўнік, строга,
Па-е-ха-лі, за-гу-лі!
Няма чорта,
Няма бога,
Няма раю на зямлі!
Пек-ла ёсць,
Гэта кожны знае.
Ма-ла-досць
Хутка пралятае.
Пад ад-хон
Догмы, сорам, скруху!
Эх, закон
Руху!
Руху!
Руху!..

Якім страсным адмаўленнем т а к о г а закона руху становяцца радкі, у якіх ён, гэты «закон», па-заліхвацку сцвярджаецца тымі, чыю амаральнасць А. Грачанікаў бязлітасна выкрывае!..

«Школа танцаў» — з трэцяй кнігі А. Грачанікава. Між тым варта вярнуцца да «Круглай плошчы», дзе, на мой погляд, пошукі паэта і прывялі да відавочнага якаснага зруху ў развіцці яго таленту.

Вядомы ўкраінскі пісьменнік Алесь Ганчар пісаў: «Па волі лёсу менавіта нам выпала завяршыць цэлую эпоху... замаруджаных скорасцей. Ніколі больш гэтага планеце не знаць...» Сказана ад імя людзей, народжаных на мяжы першых двух дзесяцігоддзяў нашага веку. Але ж калі было пакаленне, якое завяршыла эпоху «замаруджаных скорасцей», значыць, павінна быць і пакаленне, прыход якога да актыўнай дзейнасці супадае з пачаткам новай эпохі — эпохі нечуваных раней паскарэнняў. І мы ведаем: гэта пакаленне Гагарына; канчатковае станаўленне яго прыпадае на другую палову пяцідзесятых гадоў. Менавіта да гэтага пакалення належыць і паэт, пра якога ідзе гаворка.

Аднак філасофска - адцягненае асэнсаванне гэтага феномена — не вядомага раней паскарэння нашага руху — не стала дамінуючым у творчасці А. Грачанікава. Мне здаецца, эмпірычнае і філасофскае выступаюць у яго ў такіх суадносінах, калі, па-першае, і колькасна эмпірычнае ўсё ж пераважае над філасофскім, а па-другое, і гэта галоўнае, філасофскае больш-менш раўнамерна спалучаецца ў канкрэтна-вобразным. Дык, можа, у ім бярэ верх публіцыст? Ёсць жа паэты, у якіх гэтая якасць выступае больш відавочна. Згадаем яшчэ пра «цікую лірыку», дзе магутны махавік рэчаіснасці ў выніку пэўнага паэтычнага апасродкавання становіцца маленькім, як у наручным гадзіннику, калёсікам, і рэалізуецца тая перавага, пра якую можна сказаць, што мініяцюрны гадзіннік — хранометр больш дакладны, чым, скажам, бачны і чутны адусюль гадзіннік на прываксальнай плошчы... Што ж, у А. Грачанікава ёсць і «нягучныя» вершы, узяць хоць бы той, які даў назву ўсяму выбранаму — «Калі далёка ты...» І, можа, нехта назаве паэта ціхім лірыкам?.. Словам, мне цяжка вызначыць, які экспрэсіўны пачатак пераважае ў творчасці А. Грачанікава; галоўнае ж мне бачыцца ў тым, што ў яго вершах адчуваецца магутны махавік эпохі, які ўсё больш і больш паскарае тэмпы нашага жыцця. Менавіта з такім пачуццём чытаў я верш «Матацыклісты», якім, хутчэй за ўсё, і пазначаны рывок паэта на новую, вышэйшую ступень яго творчага станаўлення. Аб чым гэты верш? Аб тым, як чалавек вырываецца на «аператыўны прастор», дзе, нарэшце, яму адкрываюцца неабмежаваныя магчымасці выпрабаваць самога сябе і сцвердзіць!.. І сам верш — як раптоўны выбух. Так бывае, калі мы не чуем у небе самалёта, а потым — нібыта ўдар грому: самалёт прарваўся праз гукавы бар'ер:

Матацыклісты шпараць па шашы.
Паветра рэжуць, як электрапілы,
У рокаце — надрыўны крык душы,
Нібыта рух высмоктвае з іх сілы.
Што думаюць, сціскаючы рулі,
Яны ў рухомай гэтай адзіноце,
Калі абрысы неба і зямлі
Знікаюць на бязлюдным павароце?
Ім сутнасць руху хочацца спазнаць
І падміргнуць свайму былому хвацка...

Цяпер лірычны герой паэта ўяўляецца мне не адасобленым ад руху, сутнасць якога яму «хочацца спазнаць», а знітаваным з ім. Гэты якасна новы для паэта спосаб «паэтычнага перасоўвання» найбольш поўна праяўляецца ў кнігах А. Грачанікава, якія выйшлі пасля «Круглай плошчы». У іх канчаткова будуць прадстаўлены ідэйна - тэматычныя кірункі яго паэзіі, што, у сваю чаргу, пазначыць спасціжэнне паэтам галоўнага ў сутнасці нашага руху — яго курсу да міру паміж людзьмі ва ўсім свеце, да шчаслівай будучыні чалавецтва. І натуральна, што тэмы сыноўняй любві да роднай зямлі і адказнасці за яе лёс, антываенная тэма становяцца для А. Грачанікава першараднымі, важнейшымі. Да такіх твораў, у прыватнасці, адносяцца вершы баладнага тыпу — «Крывавая балада», «Жнівень сорак пятага», «Міннае поле» і іншыя.

Гэта надзвычай істотная, вызначальная частка сутнасці нашага руху — запраграмаваная ў нашай свядомасці абачлівасць і пільнасць, якія на нялёгкай дарозе да лепшай будучыні павінны засцерагчы нас ад катастрофы. Сказанае датычыць і тых вершаў паэта пра вайну, у якіх ён не столькі дае рэтраспекцыю, колькі даследуе рэшткі вайны ў сённяшнім нашым жыцці. Мінулая вайна ў гэтых творах выступае як адзін з самых істотных элементаў таго сацыяльна - гістарычнага кантэксту, у якім паэт прасочвае і праецыруе ў будучыню развіццё сённяшніх падзей, што найбольш яго хвалююць, і ўвогуле ўспрымае сваё ўласнае існаванне.

«Над Белай Руссю — белы снег...» Гэты верш не пра вайну. Больш таго, нават «мірную» трывогу лірычны герой гоніць ад сябе, заклікае ці то сябе, ці то сваю сяброўку ўявіць, «што толькі ёсць адно святло, святло разлівістае снегу, што ўсё мінула і прайшло, а роспачы — няма і следу...» Але не ўдаецца яму застацца бестурботным перад шматлікімі складанасцямі нашага часу. І не выпадкова ў кнігах «Грыбная пара», «Начная змена», «Дрэва на выспе» адчуваецца новая фаза «руху» лірычнага героя, фаза, на якой ён не толькі вызначае мэту, да якой імкнецца, але і падводзіць вынікі пэўных сваіх жыццёвых этапаў. І тады лірычны герой не заўсёды задаволены самім сабой. Вось ён звяртаецца да жыцця: «...Чым глыбей я з прагаю пазнання ныраю ў жыццёвыя віры, тым большыя твае выпрабаванні і меншыя — знаходкі і дары». А гэта значыць, што прыходзіцца мабілізоўваць усё новыя душэўныя рэсурсы, быць максімальна патрабавальным да сябе. Гэты маральны, у адносінах да сябе, максімалізм выяўляецца і ў своеасаблівым імкненні лірычнага героя не быць на такой не прыстасаванай яшчэ «для веселия» планеце шчаслівейшым за іншых. Вось цудоўны, як мне здаецца, верш «Зязюля». Самотная птушка падае голас у вясновым бары:

З кім падзяліцца горам, —
Яна і сама не скажа.
І стала нам раптам сорам
За светлае шчасце наша.
Ліст дрыготкі кляновы,
Позірк твой палахлівы...
Свет не такі мядовы,
Свет не такі шчаслівы...

Свет не можа быць шчаслівы, калі нават адзін нехта ў ім няшчасны. Але ці не губляем мы ў наш век штосьці такое, без чаго мы ўсе не можам быць шчаслівыя? Ці, можа, тое новае, што ўносіць у жыццё людзей тэхнічны прагрэс, у прыватнасці ўрбанізацыя, замяніць, скажам, маральна-экалагічныя каштоўнасці, якія ў многім застаюцца для нас у мінулым, за гарадской мяжой? Аб гэтым паэт разважае яшчэ ў вершы «Гарадскі досвітак» з трэцяй кнігі: «Ідзеш і думаеш: чаму ніколі не выпадае на асфальт раса?» Але найбольш поўнае і, я б сказаў, дыялектычнае развіццё гэтая тэма атрымала ў вершы «Імчымся мы ўсё хутчэй» з кнігі «Дрэва на выспе». Гэты верш красамоўна сведчыць аб тым, што вобраз імклівага руху — стрыжнявы вобраз у творчасці Анатоля Грачанікава. На маю думку, вельмі цікавым яго робіць адзін, самы апошні радок, хаця згадзіцца з гэтым радком не так і лёгка. Паэт звяртаецца да свайго сучасніка, які, вядома ж, як і сам ён, «на грэбні руху» павінен сумаваць «па сонцу, небу, ціцшыні. Па дрэвах цёплых і ласкавых, па ўзлеску, дзе ручай звініць», а ў заключэнне гаворыць:

І ты стаіш расхваляваны,
Адчуўшы пах зямлі лясной,
Самім сабой абрабаваны
І ўсцешаны самім сабой.

Дык, можа, і праўда —мала сказаць, што нешта страчваецца? Можа, дыялектыка «руху» і ў тым, што нешта любае нашаму сэрцу знікае, а нешта, да чаго мы яшчэ не прызвычаіліся, няўмольна ўваходзіць у наша жыццё, патрабуе нашага прызнання?...

Дачытваў выбранае Анатоля Грачанікава з надзеяй, што, як кажуць, працяг будзе. І сёння ён ужо ёсць — апублікаваная сёлета ў часопісе «Полымя» паэма «Палескі трохкутнік». Твор гэты — тэма асобнай гаворкі. Аднак галоўнае, што ў сувязі з усім сказаным тут хочацца адзначыць,—глыбока гуманістычны пафас паэмы, калі шкала, па якой ацэньваецца вартасць простага чалавека, набывае планетарныя і нават касмічныя маштабы. У гэтым не толькі спасціжэнне, але і сцвярджэнне генеральнай арыентацыі нашага руху — на чалавечнасць, на ўзаемаразуменне і ўзаемапавагу паміж людзьмі.

Мікола КУСЯНКОЎ.

МАСТАК І ЖЫЦЦЁ

Паэзія чалавечнасці

Сялянскі стол з дошак. На ім — каравай хлеба. З разной авальнай рамачкі ўважліва глядзіць з фотаздымка малады баец. Адчынена акно. У пакой урываецца летні вецер. За акном між зжатай збажыны ўецца дарога. Далёка, далёка ідзе дарога.

«Па гэтай дарозе пайшоў бацька. Ён аддаў жыццё за гэты хлеб, за жыццё іншых людзей», — гаварыў аўтар кампазіцыі «Памяці бацькі» малады мастак Мікалай Ісаёнак.

Нават цяпер, калі ён атрымаў прызнанне, з'яўляецца ўдзельнікам шэрагу рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выставак, твор «Памяці бацькі» займае асаблівае месца ў яго творчасці.

Тэме пераемнасці пакаленняў прысвячае ён і сваю карціну «Салдаткі. Адраджэнне». Карціна навеяна расказам маці мастака.

«Пра многае расказвала мне яна. Пра тыя цяжкасці, якія прынесла вайна. Пра тое, як яны з сястрой будавалі ў вёсцы хату. Фашысты ж спалілі добры дом, пабудаваны бацькам да вайны. Я думаю пра жанчын, якія не дачакаліся з вайны сваіх мужоў, сыноў. Але знайшлі ў сабе сілу працаваць, каб узняць з пажарышчаў родную зямлю. З якой любоўю, з якой стараннасцю яны апрацоўвалі яе! Гэтых жанчын нельга забываць».

...Пачатак вясны. Сыходзіць снег. Парывісты вецер гоніць цёмную хмару. Бачны ўдалечыні чорныя пажарышчы. Дзве жанчыны—пажылая і маладая — з нейкай урачыстасцю, велічнасцю нясуць свежаабкоранае бервяно. Непадалёк—дзяўчынка ў старым салдацкім шынялі. Яна глядзіць не па-дзіцячы сур'ёзна. Апратка жанчын цёмнага колеру, твары выдзелены святлом. За імі—новы залацісты зруб. Каларыт карціны пабудаваны на кантрасце чорнага і залацістага. Пейзаж у ёй напружаны, суровы. Ён падкрэслівае барацьбу цяпла з холадам, перамогу святла над цемрай.

У задуманую мастаком серыю пра жанчын вайны ўваходзіць таксама карціна «Адна». У верхнім адзенні стомлена сядзіць на зэдліку пажылая жанчына. Яна ўся ў сваіх думках, лёгкая ўсмешка кранае твар. Быццам прыгадала штосьці светлае, радаснае. Ляжаць на каленях рукі. Стомленасць і разам з тым мужнасць, вынослівасць у яе паставе. За акном бачна заснежаная вёсачка. І акно гэтае—акно ў жыццё.

Па сваім настроі да карціны «Адна» блізкі жаночы партрэт, які М. Ісаёнак назваў «Жыццё». У вобразе гераіні — смутак, прыхаваны боль і менш за ўсё пакорлівасць.

І яшчэ адна тэма, якая цікавіць мастака.

«Чалавек знаходзіць сілу ў памяці. Вернасць памяці надае яму энергію, каб многае здзейсніць у жыцці, дапамагае ў працы. Такі чалавек і сам здольны на подзвіг. Пра гэта думаў я, калі працаваў над карцінай «На роднай зямлі. Памяць». Гэта канкрэтная мясціна ў Гарадоцкім раёне. Там ішлі баі», — мастак расказвае пра задуму карціны.

На зялёным узгорку дзяўчына з букецікам белых кветак. Мір. Квітнее родная зямля, цягнецца да неба з яру маладая беластволая бярозка. Усё навокал быццам стаіць у ганаровай варце перад зямлёй, палітай крывёю.

Нацюрморт з рэшатам.

Лён беларускі.

маў прызнанне, з'яўляецца ўдзельнікам шэрагу рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выставак, твор «Памяці бацькі» займае асаблівае месца ў яго творчасці.

Тэме пераемнасці пакаленняў прысвячае ён і сваю карціну «Салдаткі. Адраджэнне». Карціна навеяна расказам маці мастака.

«Пра многае расказвала мне яна. Пра тыя цяжкасці, якія прынесла вайна. Пра тое, як яны з сястрой будавалі ў вёсцы хату. Фашысты ж спалілі добры дом, пабудаваны бацькам да вайны. Я думаю пра жанчын, якія не дачакаліся з вайны сваіх мужоў, сыноў. Але знайшлі ў сабе сілу працаваць, каб узняць з пажарышчаў родную зямлю. З якой любоўю, з якой стараннасцю яны апрацоўвалі яе! Гэтых жанчын нельга забываць».

...Пачатак вясны. Сыходзіць снег. Парывісты вецер гоніць цёмную хмару. Бачны ўдалечыні чорныя пажарышчы. Дзве жанчыны—пажылая і маладая — з нейкай урачыстасцю, велічнасцю нясуць свежаабкоранае бервяно. Непадалёк—дзяўчынка ў старым салдацкім шынялі. Яна глядзіць не па-дзіцячы сур'ёзна. Апратка жанчын цёмнага колеру, твары выдзелены святлом. За імі—новы залацісты зруб. Каларыт карціны пабудаваны на кантрасце чорнага і залацістага. Пейзаж у ёй напружаны, суровы. Ён падкрэслівае барацьбу цяпла з холадам, перамогу святла над цемрай.

У задуманую мастаком серыю пра жанчын вайны ўваходзіць таксама карціна «Адна». У верхнім адзенні стомлена сядзіць на зэдліку пажылая жанчына. Яна ўся ў сваіх думках, лёгкая ўсмешка кранае твар. Быццам прыгадала штосьці светлае, радаснае. Ляжаць на каленях рукі. Стомленасць і разам з тым мужнасць, вынослівасць у яе паставе. За акном бачна заснежаная вёсачка. І акно гэтае—акно ў жыццё.

Па сваім настроі да карціны «Адна» блізкі жаночы партрэт, які М. Ісаёнак назваў «Жыццё». У вобразе гераіні — смутак, прыхаваны боль і менш за ўсё пакорлівасць.

Тэма памяці непарыўна звязана ў творчасці М. Ісаёнка з вобразам прыроды Беларусі, радасцю мірнай працы.

Жыццесцвярджальны, радасны настрой яго карціны «Лён беларускі». Першаму варыянту твора ўласцівы лірызм, інтымнасць. У ім перададзена цеплыня, пяшчота мяккага восеньскага дня. Сонечным цяплом прасякнуты вялікія снапы лёну. Удалечыні залацісты гай, людзі, якія спрытна працуюць. Мастак ішоў тут непасрэдна ад таго, што бачыў у натуры. Другі варыянт карціны больш абагульнены. Серабрыстыя воблакі, жоўтыя ўзгоркі і рэчка ўдалечыні, а па полі снапы лёну, велічны дуб, крануты дыханнем восені, копы лёну на возе... Агульная цёплая колеравая гама ўзбагачаецца глыбокімі сінаватымі ценямі. Белыя кофтачкі і хусцінкі жанчын, белае апярэнне бусла, носьбіта дабра і шчасця, — своеасаблівы колеравы акцэнт, які надае кампазіцыі святочнасць.

Тэма Радзімы ўвасобяена мастаком таксама і ў пейзажы «Песня пра маю зямлю». Прамень сонца прарваў навальнічную хмару, і тады асабліва бачнай стала прыгажосць магутнага дуба, блакіт возера, маляўнічасць раскінутых па ўзгорках вёсак.

Ісаёнак наогул умее знаходзіць у прыродзе кампазіцыйна выразныя мясціны. Гэта памагае яму ствараць абагульнены вобраз беларускай прыроды.

М. Ісаёнак вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы імя А. К. Глебава. Вельмі блізкія яму творы В. Бялыніцкага-Бірулі, А. Пластава.

«Цікавасць да творчасці развіў ува мне мой першы настаўнік, мастак Алесь Антонавіч Марачкін, у вучылішчы мяне прыцягваў сваёй шчырасцю, прагай справядлівасці выкладчык Міхаіл Якаўлевіч Лісоўскі. Вельмі люблю творы мастака Віктара Папкова, В. Папкоў пісаў заўсёды тое, што добра ведаў. Як кранае яго «Паўночная песня»! Наогул мастак павінен пісаць толькі тое, што вельмі добра ведае.

Мне давялося пабываць у Крыме, Прыбалтыцы, на Урале і ў Сібіры, у Францыі. Але няма зямлі больш цудоўнай за Беларусь. У прыродзе Беларусі столькі напеўнасці, адухоўленасці.

Пейзажы М. Ісаёнка лірычныя, задуменныя. Пад уплывам прыроды фарміруецца каларыт яго работ. Для яго пейзажаў характэрна адценні зеленаватых, светлых, блакітных, вохрыстых, серабрыстых таноў. Вучоба ў самой прыроды памагла маладому мастаку адысці ад некаторай вяласці асобных работ, дамагчыся большай пластычнасці, цэласнасці, абагульнення, культуры колеру. Ён піша азімыя, прысыпаныя першым сняжком («Азімыя»), празрыстыя восеньскія гаі, апошняе лісце, якое вось-вось зляціць з дрэў, і светлае неба, што адбіваецца ў ціхай рэчцы («Восеньскі сум»). Тонкія, прыгожыя колеравыя спалучэнні пейзажаў «Зімка. Раўбічы», «Ранні снег», «Ручай у лесе», «Майскі снег».

М. Ісаёнак звычайна мала перапрацоўвае ў майстэрні ўбачанае ў прыродзе. Тон, колер, уся кампазіцыя пейзажу адразу ўспрымаюцца мастаком у адзінстве.

«Нішто так не ўзбагачае, як прырода. Чалавеку неабходны роздум, калі ўдалечыні ад гарадской мітусні ён можа ўспомніць пра самае дарагое, самае святое».

За карціны «Лён беларускі» і «Салдаткі. Адраджэнне», якія экспанаваліся на выстаўцы «Маладосць краіны», прысвечанай XIX з'езду камсамола, М. Ісаёнак удастоены прэміі ЦК ВЛКСМ за 1982 год.

Работы маладога мастака не ашаламляюць, не ўражваюць пасля першага знаёмства. Яны паступова прыцягваюць да сябе, і тады ў іх адкрываеш усё новыя і новыя сэнсавыя пласты. А гэта якасць сапраўднага мастацтва.

Ф. ЛЕЙТМАН.

ПАДЗЕІ І ДАТЫ

У гушчы жыцця

Да 80-годдзя з дня нараджэння А. ШАЎЧЭНКІ

Жыццё і творчасць старэйшага беларускага савецкага жывапісца Акіма Міхайлавіча Шаўчэнкі (28.XI.1902—12.XII.1980) фарміравалася пад уплывам першых паслякастрычніцкіх гадоў. Хлопчык з вёскі Карма Добрушскага раёна, што на Гомельшчыне, змалку зведаў нялёгкае сялянскае жыццё, марыў аб яго паляпшэнні. І калі прыйшоў час самастойнага выбару прафесіі, ён, не вагаючыся, пайшоў у настаўнікі — вучыцца, каб потым вучыць іншых.

Скончыўшы Гомельскі педтэхнікум, Акім шмат працуе, ліквідуе непісьменнасць сярод насельніцтва і чырвонаармейцаў у роднай вёсцы і ў Гомелі, прымае ўдзел у афармленні рэвалюцыйных свят. Тады ж яго марай стала прафесійнае мастацтва. Паэтычны душою, цэльны па натуры юнак, які ад прыроды валодаў добрымі якасцямі мастака, імкнуўся да шырокага, вобразнага адлюстравання рэчаіснасці.

Першай карцінай маладога мастака, якая атрымала прызнанне, стала палатно «Плытагоны», створанае на пачатку 30-х гадоў, адразу пасля заканчэння вучобы ва ВХУТЭМАСе і Ленінградскім інстытуце выяўленчага мастацтва. Ужо ў тыя гады гэты незвычайна бадзёры па настроі, маляўнічы, перакананўча вырашаны твор успрымаўся гледачом як жывы летапіс часу, гімн свабоднай, творчай працы.

Тэма працы, узнятая мастаком у «Плытагонах», атрымала цікавае развіццё ў шэрагу яго наступных твораў, створаных да вайны, — «Вяжуць снапы», «Цэх дрэваапрацоўчага камбіната», «На плытах», «Уборка сена ў калгасе» і стала ў далейшым вядучай тэмай яркай, самабытнай творчасці жывапісца, новыя сюжэты і задумы якога нараджаліся пад непасрэдным уплывам жыцця.

Актыўны ўдзельнік усіх даваенных рэспубліканскіх і шэрагу ўсесаюзных мастацкіх выставак, адзін з першых членаў Саюза мастакоў БССР, А. Шаўчэнка прайшоў цяжкімі шляхамі Вялікай Айчыннай вайны. Некаторы час (на пачатку вайны) ён супрацоўнічаў у агітацыйным антыфашысцкім ілюстраваным выданні ЦК КП(б)Б «Раздавім фашысцкую гадзіну». Потым дабравольцам пайшоў на фронт, быў цяжка паранены. Жывыя ўражанні і назіранні, думкі аб перажытым у час вайны знайшлі адлюстраванне ў цыкле яго адметных графічных малюнкаў, выкананых паводле замалёвак франтавога альбома — лепшага з творчага скарбу беларускіх мастакоў, удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Вера ў фізічныя і духоўныя магчымасці чалавека, глыбокая павага да людзей, аптымізм светаадчування — лепшыя якасці, уласцівыя творам мастака ў даваенныя і ваенныя гады, як бы па-новаму загучалі ў пасляваенны перыяд яго творчасці, калі краіна адраджала разбуранае вайной, калі наладжвалася мірнае жыццё. Беларускі станковы жывапіс канца 40-х—50-х гадоў нельга ўявіць без цёплых, жыццярадасных твораў Акіма Міхайлавіча — «На торфараспрацоўках», «Тынкоўшчыцы», «Горад аднаўляецца», «На рацэ Сож», прысвечаных стваральнай працы, быту тагачасных людзей.

Праўдзівы, заўсёды патрабавальны да сябе мастак, здаецца, быў пазбаўлены неабходнасці «прыдумваць» свае творы ў сценах майстэрні. Якасці, уласцівыя станковым работам Шаўчэнкі — жыццёвасць, натуральнасць, яшчэ ў большай ступені былі ўласцівы яго партрэтам.

Вядомасць прынесла жывапісцу серыя непаўторных, яркіх па тыпажу партрэтаў працаўнікоў вёскі — Г. Аляксандравай, А. Загорскай, Н. Цярэшчанкава, С. Анішчанкава, групавы партрэт народнага хору пад кіраўніцтвам Т. Лапацінай, партрэт заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Т. Лапацінай, партрэты настаўніцы, жонкі, студэнта, выкананыя на высокім прафесійным узроўні, пазбаўленыя павярхоўнасці.

Плённа і напружана працаваў А. Шаўчэнка ў 60-я і 70-я гады. Верны абранаму яшчэ ў юнацтве прынцыпу — «мастак павінен знаходзіцца ў гушчы жыцця», ён ездзіў на калгасныя палі і фермы, наведваў прамысловыя прадпрыемствы, новабудоўлі. І кожная грамадская, гістарычная і проста бытавая падзея, якую ён увасабляў, адлюстроўвалася ім заўсёды змястоўна, з любоўю. У гэтым пераконваюць такія мажорныя палотны аб сучаснасці, як «На трасе газаправода «Дашава — Мінск», «Новыя тканіны. На Мінскім камвольным камбінаце», «У выхадны дзень», «Вячэрні Мінск», «Меліяратары» і іншыя, у якіх лірычны і грамадскі пачаткі выступаюць у непарыўным адзінстве.

Важную ролю ў агульным успрыманні твораў А. Шаўчэнкі адыгрывае колер, да якога ён ставіўся сур'ёзна, самааддана. Мастак захапляў багаццем колеравага бачання свету. Насычаныя чырвоныя, жоўтыя, фіялетавыя, цёмна-карычневыя фарбы ў карціне «Вячэрні Мінск» як бы ўзмацняюць адчуванне цеплыні і спакою, духоўнай еднасці людзей, якія адпачываюць пасля працоўнага дня. Багаццем паўтонаў і рэфлексаў вабіць вока святочнае па настроі палатно «У выхадны дзень». Сапраўдная сімфонія фарбаў — у нацюрмортах Шаўчэнкі.

Тынкоўшчыцы.

У апошнія гады жыцця мастак усё часцей прыгадвае вайну, франтавых сяброў, баявыя паходы. У выніку нарадзіўся цыкл карцін аб вайне — «Дзень Перамогі», «Рака Нёман», «Армейская лазня», «Аб гераічным мінулым», «Закурым казіную ножку», якія ўзнаўляюць гераічныя падзеі тых год, услаўляюць мужнасць савецкага народа і адначасова, дзякуючы сваёй гуманістычнай, жыццесцвярджальнай накіраванасці, успрымаюцца як рашучы пратэст супраць вайны. Жыццё і вайна, нібы гаворыць мастак, — з'явы процілеглыя, несумяшчальныя!

Жыццялюбівая, высокаграмадзянская творчасць Акіма Міхайлавіча Шаўчэнкі— яркая старонка гісторыі выяўленчага мастацтва Савецкай Беларусі.

А. РУНЕЦ.

КАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: ЖЫЦЦЁВЫ ТОНУС ВЁСКІ

Анатоль КАЗЛОВІЧ

ЧАЛАВЕК АД ХЛЕБ

Пішу дакументальную аповесць пра старшыню калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна Героя Сацыялістычнай Працы В. К. Старавойтава, пераемніка легендарнага Кірылы Пракопавіча Арлоўскага

Першая частка аповесці будзе надрукавана ў студзеньскім нумары часопіса «Полымя». Прапаную чытачам «ЛіМа» ўрывак з яе.

АУТАР.

З хлебам, калі задумацца, калі ўзяць на ўзбраенне багаты арсенал паэтычных сродкаў, можна параўнаць многае ў свеце і ў жыцці чалавека. А вось сам хлеб параўнаць няма з чым, няма на гэта прыродных аналагаў, няма мастацкіх метафар.

Каб адчуць хлеб, яго трэба адкусіць і есці. Як проста!

Прастаце хлеба і служыць Старавойтаў.

Я задаваў Старавойтаву традыцыйнае пытанне журналістаў: што ў сваёй рабоце ён лічыць самым галоўным? У прадметным сэнсе слова.

— Пасля плана па хлебе — жыллё для людзей, — адказаў Старавойтаў.

І немагчыма было вызначыць па інтанацыі, што для яго галоўнае. Здаецца, хлеб. Аднак вымавіў ён «план па хлебе» скорагаворкай, не акцэнтуючы на гэтым выразе ўвагу. Жыллё? А чаму тады паставіў яго на другое месца?

Памагчы мне ён не змог, не назваў словам самае галоўнае.

А, можа, самае галоўнае «вылушчыцца» з яго справы? Давайце паспрабуем паназіраць за Старавойтавым у справе, скажам, на сходзе ўпаўнаважаных, дзе найбольш выяўляецца яго старшынёўскі стыль.

— Першае пытанне, — нягучна абвясціў Старавойтаў, — пра размяшчэнне траў. Слова мае галоўны аграном.

Галоўны аграном Лянкевіч на працягу трох мінут назваў палі, участкі, дзе, на думку агранамічнай службы, можна пасеяць сумесі траў. Усяго пяцьсот сорак гектараў.

Удзельнікі сходу ўважліва слухалі. Старавойтаў — таксама. Але нешта яго насцярожыла.

— Брыгадзір! — ён трохі павысіў голас, чакаючы, калі можна будзе пачуць адказ на пытанне, што мільганула ў галаве. — На полі за садам можна сеяць сумесь?

— Можна, — адгукнуўся брыгадзір, — поле добрае.

— А па-мойму, лепш канюшыну, — сказаў Старавойтаў. — Канюшына прымусіць вас прыбраць каменне. Гэта ж наш апошні палетак, дзе яшчэ ёсць каменне. Пасеем канюшыну — спросцім нашу задачу...

Брыгадзір нешта хуценька чыркаў у блакноце, што ляжаў на каленях. На лбе ў брыгадзіра сабраліся ўсе яго мыслісцельныя зморшчынкі. Было зразумела, што канюшына задачу не спросціць, а наадварот — зробіць яшчэ больш складанай.

Прагаласавалі за канюшыну.

— Пераходзім да другога пытання, — сказаў Старавойтаў, надзеў акуляры і пачаў хутка чытаць напісанае на паперках розных фарматаў і памераў: — Выдзеліць аўтобус на вяселле... Даём?—звярнуўся Старавойтаў да сходу, зірнуўшы паверх акуляраў. — Хлопец добры?

— Добры! Даём. Заўсёды на вяселле даём, Васіль Канстанцінавіч, такая справа! — адказаў сход хорам галасоў.

Сакратар, малады хлопец з чорнымі вусікамі, прыняў у Старавойтава лісток і нешта пазначыў там. А Старавойтаў зноў заглыбіўся ў паперкі.

— Та-ак... Чатырыста кілаграмаў бульбы на прысядзібны ўчастак. Гэта — даём! — сказаў цвёрда, упэўнены, што сход ні словам не запярэчыць. Так і было: сход моўчкі чакаў наступнага лістка ў руках старшыні. — Правесці ваду ад калгаснага водаправода. Пяцьдзесят метраў труб. Як?

— Трэба даць! — адказаў сход. — Старая жанчына. Неабходна памагчы.

— Добра, даём! — Старавойтаў перадаў сакратару лісток. Музыку і транспарт на вяселле... Зноў вяселле? — весела глянуў паверх акуляраў. — Вясна, сяўба, а ў іх вяселле! Што, да восені пацярпець не могуць?

— Не могуць, Канстанцінавіч, — падтрымалі яго жарт у зале. — І пасеем, і пажэнім!

— Добра, — сказаў Старавойтаў. — І пасеем, і пажэнім!..

Было разгледжана дваццаць тры заявы.

За дваццаць тры мінуты!

Што ўбачыў і адчуў я на тым ранішнім сходзе майскім днём, у самы вясновы прыпар? Дзелавітасць? Вядома! Калгасную дэмакратыю ў дзеянні? Таксама, канечне. Клопат пра перспектыву, не заглушаную неабходнасцю аператыўна вырашаць надзённыя пытанні? І гэта я ўбачыў. Клопат пра людзей? Гэта я зразумеў як ніколі раней, бо клопат адчуваўся ва ўмовах пасяўной, калі на асаблівым уліку кожная транспартная адзінка і кожная хвіліна калгасных спецыялістаў.

«І пасеем, і пажэнім!» — галоўнае, што я адчуў на тым сходзе. І ў гэтым самым галоўным я не магу назваць асноўнае, вызначальнае, дамінуючае ці нейкае там яшчэ. Я адчуў настрой, а раскласці яго на частачкі немагчыма. Настрой — і пасеяць, і пажаніць, і памагчы бабульцы. Адначасова. Настрой, які перарос у штодзённасць «Рассвета».

Мяне могуць перапыніць тут: зноў захапіўся! Звычайны, радавы факт узвёў у філасофію. Натуральнае выдае за звышнатуральнае.

На гэта я адкажу так: захапіўся, бо шукаў аб'ект захаплення, аб'ездзіўшы нямала калгасаў і саўгасаў і пераканаўшыся ў горкай праўдзе — занадта часта мы адыходзім ад натуральнага да чорт ведае чаго.

Паспрабую ўсё ж растлумачыць — да чаго прыходзім.

Саўгас «Малеч» Бярозаўскага раёна славуты, як і калгас «Рассвет». Доследна-паказальны «Малеч» створаны на меліяраваных землях Палесся, гэта гонар нашай сельскагаспадарчай навукі і практыкі і мой асабісты гонар: там — мая радзіма, там я хадзіў у школу. Пра саўгас «Малеч» я шмат пісаў — у газетах, у часопісах. Пісаў заўсёды з захапленнем, расказваў пра тое, што там зроблена: палепшаны палі, пабудаваны пасёлак, узведзены гандлёвы цэнтр, Палац культуры, павырасталі новыя фермы, з'явіліся рукатворныя азёры, пляжы...

Нядаўна я даведаўся, што дырэктара саўгаса Шыка знялі з работы. Вы падумаеце — для мяне навіна была нечаканай? Не, не была. Але я ўзяўся перачытваць усе свае нарысы і артыкулы пра саўгас «Малеч», шукаючы ў іх прозвішча Шыка, і не знайшоў — я ні разу не прыгадаў Шыка, расказваючы пра саўгас. Я адклаў убок свае артыкулы і нарысы, адчуўшы задавальненне ад таго, што не памыліўся некалі, многа гадоў назад, і цяпер я не адчуваў сораму.

Калісьці, атрымаўшы рэдакцыйнае заданне, мы паехалі ў саўгас «Малеч»— я і мой сябар, зямляк, калега Андрэй Юдчыц. Была восень, у саўгасе капалі бульбу, буракі, рыхтавалі фермы да зімы, нарыхтоўвалі кармы. Напружаны быў час. Дырэктар Шык не вылазіў з «газіка», з кабінетных нарад са спецыялістамі, усіх наведвальнікаў-просьбітаў выганяў, скарыстоўваючы два варыянты: а) «Я заняты!»; б) «Паглядзі на дзверы — зараз не прыёмны час!». Абодва варыянты аб'ядноўвала дырэктарская грубасць. Ён не жадаў слухаць чалавека, не намагаўся ўнікнуць у яго клопат-просьбу.

Дырэктар са спецыялістамі абмяркоўваў у кабінеце план асенняй сяўбы, уздыму зяблі, а ў прыёмнай баязліва тоўпіліся людзі з паперкамі-заявамі ў руках. Нарэшце нарада заканчвалася, спецыялісты гуртам пакідалі кабінет, апошнім імкліва выходзіў з пакоя дырэктар. Людзі, што цярпліва чакалі дагэтуль у прыёмнай, кідаліся да яго, але ён грэбліва махаў рукою, кідаў рэзка: «Я заняты! Я на ферму!»— і выходзіў, пакідаючы людзей з паперкамі ў руках.

Я неаднойчы назіраў падобную сітуацыю і думаў: а навошта дырэктар паехаў на ферму ці ў поле, калі тут асталіся людзі з нявырашанымі пытаннямі, з жыццёвымі клопатамі, з крыўдай у вачах? І такая думка прыходзіла ў галаву: а нашто наогул араць поле, сеяць, збіраць ураджай, калі ў вачах людзей крыўда, а ў душы расчараванне?

Мы тады не пыталіся ў дырэктара Шыка: што для яго самае галоўнае? Усё было зразумела, ён жа казаў: «Паехаў на поле!» Значыць, галоўным для яго было поле, збожжа, на полі. Ураджаі ў саўгасе раслі, доследна-паказальнай гаспадарцы давалі ўгнаенні, лепшае насенне, сучасную тэхніку — дык чаму б не расці ўраджаям?! З тае ж прычыны — на дзяржаўным дабры — узнімаліся ў саўгасе надоі і прыбаўка ў вазе, з дырэктарам лічыліся ў райкоме партыі.

Пра ўраджаі і прыбаўленне вагі, пра збожжа і малако саўгаса «Малеч», пра яго людзей мы і напісалі тады з Андрэем Юдчыцам. Але ў вялікім, на паўпаласы, рэпартажы «Малецкая навіна» («Сельская газета» за 6 лістапада 1972 года) мы ні слова не напісалі пра дырэктара Шыка, нібыта і не было яго ў саўгасе. Так мы вырашылі зрабіць, убачыўшы адносіны дырэктара да людзей. Мы нібыта аддзялілі дырэктара ад людзей — і не памыліліся. Сёння гэта відавочна. Дырэктара Шыка вызвалілі ад пасады за амаральныя паводзіны, за грубасць з людзьмі, за фінансавыя махінацыі дзеля асабістага абагачэння.

Сёння Шык — не дырэктар. Адбылося натуральнае: хама адхілілі ад кіраўніцтва людзьмі. Горкая праўда ў тым, што натуральнае часта вось так адбываецца, а не жыве заўсёды. Але ж абнадзейвае, заспакойвае тое, што іншароднае цела заўсёды, рана ці позна, адкідаецца, не прымаецца нармальным арганізмам. Нават тады, дзесяць гадоў назад, калі ў саўгасе «Малеч» яшчэ не знізіліся надоі, прыбаўка ў вазе, ураджаі, дырэктар Шык ужо быў іншародным целам, ужо не прымалі яго душы і сэрцы тых людзей, што тоўпіліся ў прыёмнай, дзе вісела шыльдачка з гадзінамі прыёму па асабістых пытаннях.

Адлучэнне кіраўніка ад калектыву пачынаецца менавіта з гэтай трафарэтнай, знаёмай нам шыльдачкі: дні і гадзіны прыёму тады і тады... Невядома, чаго больш робяць гэтыя шыльдачкі — упарадкоўваюць жыццё ў калектыве ці ўносяць у яго разлад. На дзвярах старшыні Старавойтава падобнай шыльдачкі няма — і я веру Старавойтаву: значыць так і трэба — трэба, як ён робіць, прымаць людзей у зручны для іх час. Не было ніякіх абмежавальных шыльдачак і і на дзвярах Арлоўскага, людзі ішлі да яго, калі ім трэба было, людзі спынялі яго на вуліцы і звярталіся са сваімі просьбамі. І гэта ўспрымалася натуральна. Старавойтава таксама можна спыніць у любы час і пагаварыць з ім пра набалелае — а як жа інакш?

Старавойтаў стварае ў калгасе настрой, які дазваляе людзям і сеяць, і жаніцца, гэта значыць жыць нармальным чалавечым жыццём. Старавойтаў вяртае ў вёску яе натуральнасць, выпрацаваную там стагоддзямі. Узаемадачыненням слова і справы, чалавека і хлеба Старавойтаў вяртае іх лагічную прастату, страчаную намі ў пагоні за спецыялізацыяй, кааперацыяй і іншымі спакусамі нашага бурнага стагоддзя. Вось чаму служыць ён, і служба яго нялёгкая, бо даводзіцца ламаць стэрэатып. Бурнае стагоддзе бурна стварае стэрэатыпы мыслення, паводзін, узаемаадносін асобных людзей, цэлых калектываў, арганізацый.

Вучонымі-арнітолагамі ўстаноўлена, што, хоць усе вароны каркаюць аднолькава, сярод іх ёсць гарадскія і вясковыя, і ў іх няма агульнай мовы, яны, нібы іншаземцы, не разумеюць адна адну.

Я пішу пра людзей, параўноўваць іх з варонамі не хачу, аднак, калі слухаю, як чароўная кандыдатка сваіх навук расказвае пра шэфскую паездку ў вёску, на сельгасработы, дзе яна «качалася ў сене», мне хочацца параўнаць яе з якой-небудзь сімпатычнай птушачкай, пазбаўленай жыццёвых клопатаў, са стварэннем, якое страціла ўсе сувязі са знешнім светам. Бесклапотных птушак у прыродзе таксама няма, я гэта ведаю. У гэтым і хаваецца звышнатуральнасць: падобных «птушак» нямала развялося сярод людзей.

Вёска Мышкавічы. Фантан са светламузыкай на плошчы цэнтральнай сядзібы калгаса.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА. (БЕЛТА).

Чытаю ў газетах пра «Сельгастэхніку», «Сельгасхімію», пра іншых шматлікіх партнёраў калгаса, што абстрагаваліся ад калгасных клопатаў пра хлеб, бачу пакуты вясковых механізатараў з дрэннымі камбайнамі, нядбайна зробленымі на заводзе,— і мроюцца цэлыя чароды «птушак», што ігнаруюць простую сувязь з хлебам у літаральным сэнсе слова і ў пераносным, калі хлебам называюць заробак.

Старавойтаў усіх «птушак» ненавідзіць больш, чым п'яніц. П'яніц ён стараецца выхоўваць, а «птушак» праганяе са сваіх палеткаў.

Восем бульдозераў на апошнім рассветаўскім палетку, што патрабаваў хараства і культуры, раззлавана гулі, але іх галасы цешылі старшынёва сэрца. Спецыяльная меліярацыйная арганізацыя корпалася б тут гады два, бо яна спецыялізаваная, у яе свае, спецыяльныя мэты: вольнае ад пасеваў поле, аб'ём земляных работ, зручны сезон, добрая зарплата... Восем бульдозераў зробяць культурным палетак за два вясновыя тыдні, бо яны свае, рассветаўскія, у іх аднаадзіная мэта: хутчэй зрабіць добрым поле і пасеяць на ім зерне. Мэта простая, як думка.

Старавойтаў вучыць мысліць, як працаваць на зямлі. Ён збліжае чалавека і хлеб, робіць непарыўнай сувязь чалавечага сумлення і ўрадлівасці поля. Нельга вылучыць у яго старшынёўскай стратэгіі і тактыцы нешта «галоўнае», што можна разгледзець асобна, ізалявана ад іншых яго клопатаў. Старавойтаў клапоціцца пра чалавекахлеб — гэта будзе больш дакладна.

— Будзем пячы свой хлеб,— неяк сказаў ён між іншым.

— Чаму? — запытаўся я. — Вось жа на стале хлеб, які пячэ раённы хлебазавод. Вы вырошчваеце хлеб, а там пякуць. Спецыялізацыя!

— Гэта ж не хлеб, а гліна! — абурана адказаў Старавойтаў. — Людзі вырошчваюць хлеб, а ядуць штосьці падобнае на хлеб. Ці ж гэта нармальна?

Ненармальна, ненатуральна. Хлеб павінен быць смачным — якая простая ісціна! Каб вярнуцца да прастаты ўзаемаадносін чалавека і хлеба, Старавойтаў вымушаны набываць для «Рассвета» восем бульдозераў, будаваць пякарню. Каб стварыць людзям утульнае жыллё, даводзіцца спачатку будаваць свой завод жалезабетонных вырабаў. Каб апранаць людзей прыгожа, неабходна мець свой кравецкі цэх. Каб стварыць вакол палеткаў дэкаратыўныя прысады, трэба перш вырасціць дрэўцы ў сваім гадавальніку, інакш нідзе не возьмеш. Усе сувязі простыя, лагічныя.

— Была б гліна — пабудавалі б свой цагельны завод! — марыць Старавойтаў. — Звонкую рабілі б цэглу!

Але добрай гліны ў наваколлі няма, цэглу вымушаны завозіць чужую. А цэгла тая не звініць, яна шархаціць, крышыцца. Чаму? Бо рабілі яе «птушкі», што страцілі сувязь з хлебам-заробкам.

Я казаў, што няма з чым параўнаць хлеб, няма на гэта прыродных аналагаў, няма і паэтычных тропаў.

А Старавойтаў — параўнаў.

Хай будзе дазволена такое параўнанне старшыні Старавойтаву. Гарачым сэрцам сваім ён ужыўляе ў сельскае жыццё яго лагічную прастату.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

«...КАБ НОВЫ СВЕТ ЖЫЦЦЯ САТКАЦЬ»

«НОВАЯ ЗЯМЛЯ» НА ТЭЛЕЭКРАНЕ

Прызнацца, цяжка было ўявіць сабе гэты твор на тэлеэкране. Хаця тэлебачанне далучыла нас і да сярэдневяковых замкаў, і да фантастыкі...

А тут — тое, што зусім побач, ад самае зямлі, ад каранёў: звычайная і надзвычайная з'ява, назва якой — «Новая зямля».

Як боязна бывае ўзяць у рукі твор, знаёмы і любімы з дзяцінства: раптам тое, што здавалася блізкім, цудоўным і непаўторным, ужо не падасца такім? Раптам не адгукнецца сэрца на тое, на што так шчыра адгукалася колісь?

Так бывае, калі бачыш мясціны, якія не бачыў з маленства: сэрца сціскаецца ад прадчування сустрэчы.

Вось гэтак жа, не без напружання і з прагнай цікаўнасцю, чакалі мы тэлефільм Беларускага тэлебачання «Новая зямля» паводле Якуба Коласа. Чакалі, два вечары глядзелі, абмяркоўвалі ў сваіх хатніх «глядзельных залах», а вось з чаго пачаць развагі на паперы — і не ведаем. Пачаць з таго, што ў экранізацыі амаль не засталося духмянасці, пачуцця злітнасці з прыродай, таго чыстага дзіцячага ўспрымання свету, якое запомнілася? (Ці мо наша дзіцячае ўяўленне надавала «Новай зямлі» ўвесь той цудоўны водар?) Што амаль не засталося таго «народнага гумару», на які звярталі нашу ўвагу яшчэ ў школе? А ці такі ўжо гумарыстычны гэты твор па сваёй сутнасці?

Што ж, думаецца, перад рэжысёрам стаяла вельмі нялёгкая задача. Бо «Новая зямля» — твор не проста эпічны, які ўвабраў у сябе побыт беларускага сялянства пачатку стагоддзя. Гэта твор поліфанічны. Жыццёвыя праблемы ў ім падаюцца і праз канфлікт палясоўшчыка Міхала і яго крэўных з носьбітамі сацыяльнай несправядлівасці — панамі, падпанкамі, чыноўніцтвам, і праз дзіцячы свет, і пры дапамозе аўтарскага каментарыя.

І ўсё гэта моцна пераплецена, сцэментавана рэаліямі сялянскага побыту, які, здаецца, і ёсць падмурак рамана ў вершах.

Паглыбіцца ў побыт, у дэталі сялянскага жыцця, цалкам аддацца замілаванню мінуўшчынай, нібы праз «чысцюткую дзіцячую слязу», — гэта, відаць, было б не так ужо і складана, але... небяспечна. Небяспечна — бо сёння адкрытае імкненне да «буколікі», да натуральнага, «не сапсаванага цывілізацыяй» побыту «пейзан» часцей за ўсё выглядае позай або нежаданнем разабрацца ў сутнасці з'явы. У гэтым выпадку сур'ёзны аналіз падмяняецца знешнім слізганнем па паверхні літаратурнага твора.

Але ж і чыста рацыяналістычны падыход да рамана Коласа не даў бы нічога, акрамя голай ілюстрацыі на тэму панскага прыгнёту беларускага селяніна пачатку XX стагоддзя. Калі пазбавіць вершаваны раман яго плоці, дык атрымаецца прыкладна так: селянін-індывідуаліст гіне ў барацьбе за права «прыдбаць зямлю», не разумеючы, што асабістае шчасце немагчыма, пакуль існуе сацыяльная няроўнасць.

Між іншым, гэтая думка вельмі ясна (ці не залішне?) чытаецца ў тэлепастаноўцы «Новай зямлі» (рэжысёр-пастаноўшчык У. Траццякоў). Яна — ключ да ўнутранай драматургіі, зерне канфлікту, на якім трымаецца ўся канструкцыя фільма, ці, бадай, правільней было б сказаць тэлетэатра, або тэатра аднаго акцёра, які нясе адбітак ілюстрацыйнасці: калі акцёр (або некалькі акцёраў) чытаюць тэкст, а выяўленне толькі суправаджае змест таго, што мы чуем.

Хаця кожны акцёр тут не проста чытальнік, а жывы характар, характар неадназначны і не спрошчаны.

Тут, безумоўна, заслуга ансамбля выканаўцаў галоўных роляў — Анатоля Жука (Міхал), Таццяны Мархель (Маці), Яўгена Шыпілы (Антось).

На іх была ўскладзена задача няпростая. За кошт мінімальнага паказу іграць і сваіх герояў і адначасова асяроддзе. Цудоўныя краявіды, знятыя тэлеаператарам Валерыем Булдыкам, і некалькі планаў з сялянскімі забудовамі, каровамі — гэта, бадай, толькі фон. Праўда, пастаноўшчыкі вельмі ўважліва паставіліся да дэталей гэтага фону. І лядачы конік, і сапраўдны воўк, які трапляе ў сапраўдную палонку, усе больш ці менш мастацкія дэталі ўзмацняюць адчуванне рэальнасці падзей. Хаця іншы раз — як у эпізодзе з воўкам — яны «ўражваюць» залішнім натуралізмам.

А пра акцёраў можна сказаць, што не «атачэнне іграе караля», а якраз наадварот — «каралі» каралююць і за сябе і за сваю «світу». Ёсць у фільме і па-майстэрску сыграныя эпізадычныя ролі, але ж асноўны ідэйна - мастацкі сэнс рамана-паэмы нясуць выканаўцы галоўных роляў. Гэта падкрэслена (магчыма, залішне рытарычна) у сэнсавых застаўках да серый, дзе кожны герой — у вопратцы нашых сучаснікаў — нібы выкладае сваё крэда.

Напэўна, не памылімся, калі скажам, што галоўная ўдача фільма — вобраз Маці.

Немагчыма не паверыць ласкавай мацярынскай усмешцы і пранікнёным вачам — то бязмежна пяшчотным, то ўстрывожана-заклапочаным; добрым рукам, якія ўвесь час робяць нешта патрэбнае — дояць, мыюць, шыюць, таўкуць, месяць, носяць, лашчаць, супакойваюць. Перад намі не проста абагульнены вобраз, сімвал сялянскай жанчыны, а нібы ўспамін аўтара, успамін-мара кожнага з нас пра дзяцінства, мара аб дабрыні «страчанага раю».

Побач з мудрай мяккасцю, натуральнай шчырасцю Маці— зусім іншы, жорсткі і рэзкі малюнак ролі Міхала ў выкананні А. Жука. Ён — сама ўпартасць, зацятасць, нястрымная прага да працы, да жыцця, да справядлівасці.

Рэзкія рысы яго твару, рэзкі і грубы голас, імклівыя рухі і калючы позірк, але за ўсім гэтым глыбокая пакута і чалавечнасць, любоў да жыцця, да сваіх блізкіх, да роднае зямлі. Яна — карміцелька, апора ўсяго: чалавечай годнасці, жыццёвай незалежнасці і самастойнасці. Пазбаўлены апоры — гіне чалавек. І ў гэтым, бадай, асноўны сэнс вобраза Міхала і адначасова — галоўны нерв пастаноўкі.

Так, праз гэты вобраз, адкрываецца нам пункт гледжання рэжысёра на «Новую зямлю» як на раман у першую чаргу трагічны, мужны і бязлітасна праўдзівы.

Вобраз дзядзькі Антося, з якім звязаны найбольш гумарыстычныя, сапраўды смешныя старонкі твора, адступае на другі план. Перад намі толькі працавіты, крыху смешны селянін. (На такіх, праўда, зямля трымаецца). Але без яго амаль нічога ад коласаўскага рамана і не засталося б. Праўда, і ў выкананні Я. Шыпілы ёсць тое галоўнае, што жыве ў гэтым незабыўным персанажы, якога аўтар кліча «мілы наш Антоні...» Гэта — дабрыня, якой літаральна прасякнута ўся кніга, і якой так мала засталося ў тэлепастаноўцы. Блага тое ці добра — пра гэта наперадзе.

Вось без каго нельга ўявіць сабе вершаваны раман Коласа з яго шматгалоссем — гэта без дзяцей Міхала.

Іх, праўда, менш, чым у напаўбіяграфічным рамане пісьменніка (у сям'і Міцкевічаў іх было 17!). Засталіся Алесь, Костусь, Ясь-«дарэктар», Міхалінка, Уладзя. За імі пільна сочыць камера. І, відаць, не таму, што ім шмат месца адводзіцца ў кнізе. У пастаноўку далёка не ўсё трэба «ўмясціць». Хаця некаторых раздзелаў — такіх, напрыклад, як «Дзядзька ў Вільні», усё ж не хапала.

Справа ў тым, што нібыта вачамі дзяцей назірае глядач за героямі карціны. Праз іх пачуцці, іх успрыманне бачыць падзеі, якія то імкліва, то павольна, але ўвесь час драматычна разгортваюцца перад намі.

І тут варта назваць самых юных выканаўцаў тэлеспектакля — Ігара Пётуха (Уладзя), Сашу Міхасёнка (Алесь), Жэню Гарэліка (Костусь), Наташу Кушнір (Міхалінка).

Думаецца, рэжысёру давялося нямала папрацаваць, каб разам з дзіцячай непасрэднасцю ў выкананні з'явілася сур'ёзнасць і засяроджанасць, так не ўласцівыя сучасным гарадскім хлапчукам і дзяўчынкам.

Ці не супярэчыць гэта ўсё таму, што гаварылася на пачатку нашай размовы: што пазіцыя рэжысёра, маўляў, наўмысна дэкаратыўная, пазбаўленая ўсялякай сентыментальнасці і дзіцячага захаплення? Не. Рэжысёрскі позірк, нам падалося, амаль увесь час застаецца мужным і ўпэўненым— часам нават занадта халодным. І ўсё ж, думаецца, ёсць у ім «штосьці», без чаго не варта было б, напэўна, і брацца за гэтую пастаноўку: характары дзяцей з «Новай зямлі» ўбачаны як бы праз прызму ўласнага жыццёвага вопыту. Адчуваецца, што рэжысёр фільма належыць да таго пакалення, якое перажыло ў дзяцінстве ваенныя ці, можа, першыя пасляваенныя гады. Менавіта таму недзіцячыя турботы сялянскіх дзяцей з іх напаўгалодным існаваннем зразумелыя і блізкія яму, чалавеку, пасталеўшаму на той жа зямлі.

І вось гэтае ўспрыманне літаратурнага твора праз асабістае, праз перажытае і адбілася на яго прачытанні і інтэрпрэтацыі. Ці мае права на жыццё такі падыход — справа іншая.

Пастаноўка «Новай зямлі»— не першая на тэлебачанні. Думаецца, што і не апошняя. Кожнае новае пакаленне мастакоў не можа не звяртацца да так званых хрэстаматыйных твораў роднай літаратуры — для таго, каб дакрануцца да вытокаў, каб асэнсаваць пройдзены шлях і, гаворачы словамі аўтара «Новай зямлі», — «...каб новы свет жыцця саткаць».

Віталь ТРАВЕНЬ.

«ТЭАТРАЛЬНЫ МІНСК» № 6

«60-годдзю СССР прысвячаецца»— так называецца рэдакцыйны перадавы артыкул у чарговым нумары бюлетэня «Тэатральны Мінск», дзе расказваецца пра найбольш яркія падзеі сёлетняга тэатральнага сезона. Разглядаюцца спектаклі, якія сведчаць пра плённы працэс збліжэння і ўзаемнага ўплыву нацыянальных традыцый народаў СССР у сцэнічным мастацтве. У творчых партрэтах майстроў нашай сцэны Л. Рахленкі і Т. Аляксеевай, у абмеркаванні надзённых праблем лялечнага тэатра, у рэцэнзіях на новыя спектаклі, у артыкулах, якія аднаўляюць знамянальныя падзеі мінулага аўтары, развіваецца гэта тэма. Цікавыя факты прыводзіць Д. Стэльмах у нататках «Так пачынаўся тэатр», калі расказвае пра смелую і самабытную пастаноўку народнай драмы «Цар Максіміліян», якая ўпершыню была паказана ў маі 1924 г. у Маскве беларускімі студыйцамі, што потым склалі калектыў Другога БДТ (пазней Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа).

У нумары ёсць сталыя раздзелы «Старонкі гісторыі», «Кніжная паліца», «Наш каляндар» і «Гумар».

К. СТРЫЖАК.

ФІЛЬМ ПРА СУЧАСНІКАЎ

Прагляд новага фільма беларускіх дакументалістаў «Саюз рэспублік і сэрцаў», прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР, адбыўся ў мінскім кінатэатры «Кастрычнік». Гледачы сустрэліся са стваральнікамі стужкі — сцэнарыстамі А. Кудраўцавым і У. Халіпам, рэжысёрамі І. Шышовым, В. Каралёвым і лаўрэатам Дзяржаўных прэмій СССР і БССР І. Вейняровічам. Гаворка ішла аб увасабленні тэмы дружбы народаў на экране, аб тым, як здымаўся гэты фільм.

Е. ДРОМІН.

ПОМНІКІ РОДНАГА КРАЮ

Мінскія балконы

Адно з прызванняў чалавека — пакінуць пасля сябе на гэтай зямлі добры след. У дзецях, у кнігах, у будоўлі. Дзякуючы працавітым рукам продкаў нашых сёння маем мы багаты скарб.

Вось, напрыклад, балконы. Што мы ведаем пра іх? Аб чым гаворыць металічная геаметрыя літых і каваных малюнкаў? Пра што могуць паведаміць?

Крыху гісторыі. На пачатку XIX стагоддзя Мінск бурна забудоўваецца двух- і трохпавярховымі цаглянымі дамамі. Быў той самы час, калі ў архітэктуры з'явілася вялікая і глыбокая мастацкая прастата, стрыманасць, грацыя і лагічнасць. Гэта і абумовіла шырокае выкарыстанне літога чыгуну, матэрыялу строгага і рытмічнага.

І сёння мы захапляемся прыгажосцю балконаў у дамах па вуліцах Энгельса і Інтэрнацыянальнай, Рэвалюцыйнай і Валадарскага, Камсамольскай і Савецкай. Яны цешаць нас сваёй непаўторнай формай, незвычайнымі малюнкамі. Кожны такі балкон — задума сапраўднага майстра, праца яго таленавітых рук.

Анатоль КЛЯШЧУК.

Каваная рашотка балкона дома № 5 на той жа вуліцы — прыклад усходняга гучання.

Балкон былога банка (цяпер дом № 28 па вуліцы Інтэрнацыянальнай), адліты на пачатку XIX стагоддзя.

Адмысловае кавальства пачатку XX стагоддзя на доме па вуліцы Савецкай.

Фота аўтара.

ПОШУКІ ЗНАХОДКІ

ЗАБАРОНЕНЫЯ РАДКІ

Яшчэ пры жыцці Уладзіміра Аляксеевіча Гіляроўскага імя яго было акружана легендамі. Журналіст, літаратар, эрудыт, блізкі знаёмы і сябар многіх выдатных людзей свайго часу, непараўнальны рэпарцёр і рэдкі знаўца Масквы, славуты «дзядзька Гіляй» і сапраўды быў асобай легендарнай. Ён быў і бурлаком на Волзе, як яго любімы літаратурны герой Рахметаў, і акцёрам, пажарнікам, аб'ездчыкам коней, цыркачом і рабочым, добраахвотнікам на фронце руска-турэцкай вайны і бескампрамісным выкрывальнікам эксплуатацыі працоўных, язваў самадзяржаўнай Расіі...

Нарысы і карэспандэнцыі Гіляроўскага мелі шырокі грамадскі рэзананс, яны нярэдка дапамагалі рабочым выйграць спрэчку з усемагутнымі заводчыкамі і фабрыкантамі, а здаралася, заканчваліся і выгнаннем каралёў (было і такое)... Незвычайнай была нават знешнасць гэтага жывога Рахметава — асілак, які лёгка завязваў у вузел жалезную качаргу, ён бясстрашна даследаваў самыя жахлівыя патаемныя вуглы змрочнага Хітрова рынка і іншага тагачаснага маскоўскага «дна», адпраўляўся, каб устанавіць ісціну, у самыя небяспечныя экспедыцыі і толькі дзякуючы сваёй волатаўскай сіле застаўся жывы ў час сумна вядомай Хадынкі — страшэннай даўкі на Хадынскім полі ў Маскве пры каранацыі апошняга рускага цара Мікалая II. Дарэчы, Гіляроўскі быў і адзіным з журналістаў, хто здолеў апублікаваць праўду аб гэтым злачынстве самаўладдзя — у часе Хадынскай катастрофы былі тысячы ахвяр...

Літаратурная спадчына У. Гіляроўскага досыць багатая: цудоўныя кніжкі ўспамінаў «Мае вандраванні», «Людзі тэатра», «Масква і масквічы», «Трушчобныя людзі», «Масква газетная», апавяданні, нарысы, вершы..

Дарэчы, пра вершы. Шырокаму колу чытачоў яны вядомы значна менш, чым проза дзядзькі Гіляя. Між тым, сваю літаратурную дзейнасць У. Гіляроўскі пачаў менавіта з вершаў. Ён быў непараўнальным майстрам паэтычнага экспромта, адзін з іх, які Гіляроўскі сачыніў пасля прэм'еры п'есы Льва Мікалаевіча Талстога «Улада цемры», стаў класічным:

В России две напасти:
Внизу—власть тьмы,
А наверху—тьма власти.

Любімым паэтычным творам Гіляроўскага, па яго словах, была паэма «Сценька Разін», у якой дзядзька Гіляй услаўляў народнага героя — барацьбіта за свабоду і шчасце. Паэма ўключалася ў паэтычны зборнік Гіляроўскага «Забытая тетрадь» (выдавалася тройчы — у 1894, 1896 і 1901 гадах). Царская цэнзура, якая забараніла выдаваць і загадала спаліць аддрукаваныя ўжо экземпляры «Трушчобных людзей», выкрасліла канцоўку паэмы. Без цэнзурных купюр паэма «Сценька Разін» убачыла свет толькі ў 1922 годзе, пасля рэвалюцыі. Але, відаць, экземпляраў гэтага выдання альбо не захавалася, альбо захавалася вельмі мала. Вядомы рускі савецкі паэт Аляксандр Каваленкаў, які сабраў унікальную бібліятэку рускай паэзіі і ў якога кансультаваліся ўсе вядомыя бібліяфілы і ўкладальнікі даведнікаў па пытаннях паэзіі, у сваім пасляслоўі да вершаў дзядзькі Гіляя ў чатырохтомным Зборы твораў Гіляроўскага (Масква, «Огонек», 1967 год) тэкст паэмы «Сценька Разін» бярэ з дарэвалюцыйнай «Забытой тетради». І зноў жа на месцы выкрасленых царскай цэнзурай радкоў стаіць таямнічае шматкроп'е (том 4, стар. 417).

Але вось нядаўна ў рукі аўтара гэтых радкоў трапіў экземпляр зборніка вершаў «Забытая тетрадь» выдання 1896 года з аўтографам Гіляроўскага нейкаму Уладзіміру Яўграфавічу Шастакову. Рукою самога Гіляроўскага на месцы забароненых цэнзураю радкоў напісана:

И напомнил, что пожил
не даром,
А всего совершить хоть
не мог,
Так свободу широким
пожаром
В сердце рабском впервые
зажег!

Так заканчваецца думка-споведзь Разіна ў час пакутніцкага пакарання смерцю грознага атамана, а разам з гэтымі радкамі і паэма, прысвечаная славутаму народнаму герою. Царская цэнзура забараніла публікацыю вольналюбівых радкоў Гіляроўскага, але аказалася бяссільнай знішчыць іх назаўсёды.

Барыс ФІРШТЭЙН.

СТАТЫСТЫКА ДРУКУ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Ужо ў першыя гады Савецкай улады ў рэспубліцы бурна пачала развівацца кнігавыдавецкая справа. Гэта абумовіла стварэнне статыстыкі друку, якая ўзяла на сябе задачу дзяржаўнага ўліку твораў друку.

Статыстыку друку ажыццяўляе ў рэспубліцы Дзяржаўная кніжная палата БССР. Яна была створана згодна пастанове Рабоча-сялянскага ўрада БССР ад 15 верасня 1922 года «Аб зацвярджэнні Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі і абавязковай рэгістрацыі ўсіх твораў друку, якія выходзяць у БССР» і пастановы 1924 года Саўнаркома БССР «Аб Беларускай кніжнай палаце».

Пачатак работы Беларускай кніжнай палаты ў галіне статыстыкі друку адносіцца да 1925 года. Статыстыка друку ажыццяўлялася на базе абавязковага (кантрольнага) экземпляра твораў друку. Перыядычным выданнем лічылася ўсё тое, што выпускалася больш аднаго разу ў год. Улік вёўся ў разрэзе моў выдання, месца выдання, груп выдавецтваў, зместу і сацыяльнага (мэтавага) прызначэння.

У 1927 годзе з'явіліся першыя ў рэспубліцы статыстычныя публікацыі. У «Летапісе беларускага друку» надрукаваны статыстычныя звесткі за 1917—1926 гады па кніжнай прадукцыі. Яны даюць уяўленне аб выданні кніг на беларускай мове ў БССР і за яе межамі. Да гэтага ж часу адносіцца і пачатак даведачнай работы: падрыхтоўка статыстычных і бібліяграфічных звестак на запыт партыйных, дзяржаўных органаў, навуковых і навучальных устаноў. Рыхтаваліся даведкі да выставак беларускай савецкай кнігі, да розных юбілеяў і знамянальных дат. Вынікі статыстычных распрацовак кніжнай палаты выкарыстоўваліся ў інфармацыйных, прапагандысцкіх і літаратуразнаўчых матэрыялах друку, а таксама для характарыстыкі выдавецкай дзейнасці.

Вялікая Айчынная вайна часова прыпыніла работу Кніжнай палаты БССР. Нямецкія акупанты разрабавалі і знішчылі ўвесь архіўны фонд палаты, статыстычны архіў і храналагічную картатэку па статыстыцы друку. Работа палаты была адноўлена ў 1945 годзе. Адначасова з аднаўленнем статыстычнага архіва Кніжная палата БССР прыступіла да ўліку друкаванай прадукцыі, выдадзенай у рэспубліцы.

З утварэннем у 1963 годзе Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па друку значна павялічылася і пашырылася кнігавыдавецкая справа ў рэспубліцы.

Сёння статыстычны ўлік усёй друкаванай прадукцыі ажыццяўляецца ў цесным кантакце з работнікамі выдавецтваў, паліграфічных прадпрыемстваў, планава-фінансавых органаў галіны. Гэта дазваляе больш эфектыўна кіраваць кнігавыдавецкай справай у рэспубліцы, паляпшаць тэматыку і суадносіны розных відаў выданняў, паўней задавальняць патрэбы чытачоў у літаратуры. Асаблівая ўвага ўдзяляецца тым відам літаратуры, якія карыстаюцца ў чытача павышаным попытам.

Статыстыка друку зараз мае вялікі даведачны апарат: картатэку персанальнага ўліку твораў класікаў марксізму-ленінізму, алфавітную картатэку персанальнага ўліку мастацкай літаратуры па аўтарах. Яна ахоплівае творы беларускіх, рускіх пісьменнікаў, пісьменнікаў народаў СССР і замежных краін, а таксама беларускую мастацкую літаратуру па аўтарах, якія выдаюцца ў саюзных рэспубліках і за мяжой.

Любоў РАБУШКА,
загадчык аддзела статыстыкі друку Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР.

У «Кнігарні пісьменніка»

Э. ГУРЭВІЧ. Дзіцячая літаратура Беларусі. На рускай мове. М., «Детская литература», 1982. — 65 к.

ГІСТОРЫЯ РУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ. Манаграфія. На рускай мове. М., «Наука», 1982. — 2 р. 80 к.

У. КАЛЕСНІК. Лёсам пазнанае. Выбраныя літаратурныя партрэты і нарысы. Мн., «Мастацкая літаратура», 1982. — 1 р. 20 к.

С. ЛЯСНЕЎСКІ. «Я да вас прыйду...». Артыкулы аб пачынальніках савецкай паэзіі. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1982. — 1 р. 40 к.

С. МАРЦАЛЕЎ. Друк Беларусі ў перыяд развітога сацыялізму. На рускай мове. Мн., «Беларусь», 1982.—2 р. 20 к.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 02623

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва — 33-21-53, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Ефрасіння БОНДАРАВА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Канстанцін ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Віктар КАВАЛЕНКА, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Міхаіл САВІЦКІ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.